Васіль Петручук

# Клавуня, гэта я, твой Вася

Рэдактар Васіль Петручук

© Copyright by Bazyli Pietruczuk
Białystok 1998

ISBN 83-909799-0-X

Skład: Orthdruk, ul. Składowa 9, 15-399 Białystok
Druk i oprawa: Drukarnia „LIBRA" PPHUW
ul. Mazowiecka 33, 15-301 Białystok

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013

## ВУЧОНЫ АРНІТОЛАГ

Ведаюць усе на свеце ды яшчэ і паў Амерыкі, што восенню мінулага года я быў у санаторыі ў горадзе Калабжэг. Кажучы праўду, дык я туды паехаў не з мэтай навуковых даследаў, а лячыць нервы і рэўматызм. Аднак давялося забаўляцца і ў вучонага. Людзей з'ядае прага ведаў і яны шукаюць кагосьці, хто ў данай галіне быў бы вучоны, ды засыпаюць беднага рознымі пытаннямі. Так давялося і мне. Толькі адкуль людзі адразу пазнаюць, хто кім з'яўляецца?... Ішоў я аднойчы па пляжу і нагнуўся, каб паглядзець на марскія хвалі, якія, нібы пакорныя сабакі, паўзлі да маіх ног. Думаў: якая прыгожая наша прырода... З гэтай думкі вырваў мяне нейкі мужчынскі голас. Я аглянуўся. Стаяў за мною чалавек і па-шлёнску пытаў: "Скажыце, як яны гнёзды ўюць?" Пры тым тыкаў ён пальцам у небе, паказваючы на кружыўшыя над нашымі галавамі чайкі. "А — кажу, — чайкі, ды яны ўюць гнёзды на вадзе". "Як гэта на вадзе, — пытае шлёнзак — гэта ж немагчыма, бо яйцо згіне або разаб'ецца аб лодку". "Не, — адказваю яму, прыняўшы позу знаўцы, — не зусім на вадзе, а пад вадою". "Пад вадою? Што вы гаворыце?" "А от так, — кажу, — пад вадою. Самка нясе яйкі, а самец плавае разам з тым яйкам па моры і сцеражэ яго, каб ніхто не ўкраў. Робіць гэта чатыры дні, пакуль самка не нанясе чатыры штукі. Потым абое, значыць, ён і яна, бяруць вяровачкі, сплеценыя з травы, вяжуць тыя яйкі разам і апускаюць на прыбярэжнае дно проста ў мора, там чайка сядае і выседжвае новае пакаленне". "А доўга яна сядзіць?"

"Пакуль не высядзіць, гэта значыць, чатыры тыдні". "Галодная?" "А ці мала ў моры яды?" " А хто ёй прыносіць яду?" "Сама зловіць, калі тая будзе праплываць каля самага клюва", — сказаў я і падумаў: " Усё дарам хоча ведаць". "Цуды прыроды", — заявіў мой цікаўны сусед і, махнуўшы галавой, пайшоў сваёй дарогай, гледзячы в марскую даль. Не ведаю, можа гэта дзякуючы маёй "вучонасці" ўсе курортнікі адгэтуль пры сустрэчы са мной знімалі шапкі, а на заканчэнне турнуса аб'явілі мяне самым сімпатычным курортнікам і ўзнагародзілі кніжкай.

Ох, як добра быць вучоным!

1976 г.

# РЭБУС

Вось ён: 4/5 слова "склеп", плюс 3/4 слова "ружа" на рускай мове.

Выдумаў я гэты рэбус са злосці, калі ішоў па лесвіцы на сёмы паверх і трымаў у руках пяць кілаграмаў бульбы. А было так.

У адзін прыгожы дзень нам з жонкаю — па няшчаснай прывычцы — захацелася зварыць свежы абед. Усё ўжо да яго жонка падрыхтавала, значыць: лаўровы лісток, англійскае зелле, ваду, соль, ячменную кашу і нават скваркі. Не мела толькі ў хаце бульбы. І быў бы гэты суп без бульбы, каб я не павярнуўся пад рукі. Бо мая жонка надта не любіць паказвацца з пакупкамі суседзям, а асабліва аднаму бландзіну, якому хоча паказаць, што можа дзейнічаць смела, бо я ў яе пад пантофлем. Толькі ўбег я ў хату, а жонка кажа: "Дзе ты цэлымі днямі валочышся і нават бульбы на абед не купіў? То ж рана мы пастанавілі, ты стоўбе, што сёння будзем варыць абед! Бяры сетку і пры да пані Яцэвічовай па бульбу!" Я рады, што дастаў толькі вы-гавар, схапіў сетку, ды уніз па лесвіцы в падскоках да пані Яцэ-вічовай. Забег і купіў: кілаграм буракоў, кілаграм цыбулі, кілаграм мо-рквы і, абвёўшы позіркам паліцы кіёска, сказаў прадаўшчыцы, што бадай ужо ўсё. Пані Яцэвічова ведае мяне добра і параіла: "Падумайце лепш, можа жонка прасіла яшчэ што? У мяне вельмі смачная бульба".

"Не, дзякую" — сказаў я і папёр дамоў. У нас часта ліфт сапсо-ваны і трэба выручацца нагамі. Пакуль улез я на свой паверх, сэрца было ў горле, ногі пад пузем, а, увайшоўшы ў хату, пачуў жонку на галаве. "За што ж ты мяне лупцуеш? — гавару. — Я ж ужо на працягу паўгадзіны другі раз пнуся на сёмы паверх... Мне ж не дваццаць".

Жонку яшчэ горшая злосць агарнула, бо пачала мяне акладаць сеткаю з гароднінаю, якую на сваю бяду прынёс, ды пытацца, дзе падзеў бульбу.

Выгнала ў магазін яшчэ раз, і тады я выдумаў рэбус, які даю вам, даражэнькія, разгадаць.

Толькі ніяк уцяміць не магу, што так падзейнічала на мой, так сказаць інтэлект: цыбуля з буракамі і морквай ці сапсаваны ліфт? І яшчэ аднаго не ведаю, што сёння жонка зробіць са мною за малако. Казала мне зварыць макарон, бо малако яна сама закіпяціла перад выхадам на працу. Па яе загаду я макарон зварыў у белым гаршку і паставіў ля сіняга гаршка, у якім было гатовае малако. Пакуль дастаў з вешалкі ручнічок, які вісіць над плітою, забыў, у якім малако, а ў якім макарон. На дадатак забыў, што забыў. Дык замест макарону адцадзіў малако. Нават глянуўшы ў злеў, падумаў, што вось нейкая

белая вада цячэ з макаронаў, але думаю, гэтаж з белае мукі. "Адцадзіў" і так пад крышкай пакінуў.

Пабрыўся, памыўся і дачакаўся жончынага сваяка, якому меў даць снеданне.

"А здароў! Добра, што прышоў, бо ўжо мне есць захацелася, але ведаў, што прыдзеш, чакаў". Выняў талеркі і зняў пакрыўку з гаршка, у якім варыўся макарон. Гляджу, а ў макароне стаіць вада. Што за чорт, думаю, я ж памятаю, што адцадзіў. У той момант здагадаўся, у чым справа і хутчэй падняў пакрыўку другога гаршка. Там на дне ўбачыў плеўку.

Ну, і што гэта за рэбус, ведаеце? Склероз!

1977 г.

## ОЙ, ЯК ЖА ЧАС ПАМЯНЯЕЦЦА

Быў я на Ганну ў Старым Корніне і наглядзеўся ды наслухаўся. Калісьці на свята прыязджалі на драўляных вазах, пазней грукалі жалезнякамі. Моладзь ішла пешкі, толькі багацейшыя ганарыліся веласіпедамі. Сяляне з зайздрасцю гаварылі: "О, бачыш, якога Грыша "лісопеда" купыў". Цяпер самыя бедныя прыязджаюць на одпуст матацыкламі, а за фіятамі, шкодамі і іншымі маркамі самаходаў цяжка вуліцу перайсці. Я са сваёй сірэнкай саромеўся паказвацца, але пераканалі мяне сваякі, што пастаўлю недзе на скраі вёскі пад плотам, у цені шырокай ліпы, то ніхто на яе ўвагі не звярне. Так я і зрабіў.

А які то дурны злодзей цяпер пойдзе пешкі, як даўней, пе-рад вайной або пасля яе? Даражэнькія, прыйшоў час, што зладзеі на сірэнкі і глядзець не хочуць. Часам толькі нейкі валакіта каўпакі пазрывае з колаў, але ж гэта не злодзей, навічок. Або той, што в Карыцісках "Іжа" ўкраў, гэта злодзей? Гэта проста самазванец! О, няхай грабавецкія людзі раскажуць, якія да іх зладзеі прыязджаюць, аж хочацца паслухаць. Дагэтуль, значыць, у Грабавец на горшым, чым "Фіят-125", ніхто і не паявіцца. Не верыце? Ей-богу, праўда!

Паміж залацістым збожжам сцелецца стужка асфальтавай шашы, па якой урачыста рухаецца "Фіят-125" яснага колеру. З боку Гайнаўкі ў напрамку Кляшчэляў. Затрымаўся ў пачатку вёскі. Выйшлі з яго дзве маладыя жанчыны і пайшлі ў вёску "калядаваць" па хатах з "загранічнымі" блузкамі. Мелі іх, праўда, па адной, але ж гэта ўжо пропуск у хату. Уваходзілі на панадворак і пыталі, ці ёсць хто ў хаце. Калі заставалі кагосьці, прапанавалі прадаць блузку, але цану вызначалі такую, што ніхто блузак і ў рукі не браў. А калі нікога не заставалі, уваходзілі таксама, але з мэтай праверкі, ці не забагаты

гаспадар. Правяралі шафы і іншы шафачкі. Знайшоўшы каштоўнасці і грошы, канфіскавалі.

У той час мае сваякі Іван з Гандзяю і Полік з Ганнаю касілі жыта. Іван з Гандзяю над шашою, а Полік з Ганнаю ля гасцінца, які вядзе да шашы, значыць у сябе за стадолаю. Усе яны глядзелі, як на шашы памаленьку шпацыраваў ясны фіят. Іван надта любіць жарты і да жонкі кажа: "Дывысь, Гандзя, комусь надоело сыдыеты за столом у бюрові, то прыехаў побачыты господарскім оком, як мы тут справляемся". У той самы час Полік да Ганны: "Бач, халера, чоловіек працуе, аж пуот очы залівае, а якійсь гультаіско собіе по шосые спацэрує і то шчэ самоходом, коб ногі нэ заболіелі".

"А шчо такому пановы, — прадаўжала Ганна, — вуон мае самоход, то собіе йездыт. У ёго ужэ нэ туолькі скошанэ, але і спэчанэ. Вуон мае ўсё готовэ, нэ так, як мы, мужыкі".

Пагаварылі сабе і далей спяшалі, каб як найбольш выкасіць і звязаць, пакуль добрае надвор'е. А аўтамашына далей сабе шпацыравала.

Праз нейкі час у канцы вёскі, дзе жыве Полік з Ганнаю, вышлі на гасцінец дзве жанчыны, якія ў руках "пруцалі" цяжкія клункі. Ішлі яны ў напрамку шашы. Полік да жонкі кажа: "Бачыш, ты нарыкаеш, шчо тяжко працуеш, а ім заробляты на хлеб, думаеш, лёгко? Воны мусят таксамо намордоватысь, коб меты за шчо купыты йесты. То нэ той лодар, шчо самоходом йездыт і прыглядаецца, як другі трудяцца".

"Бабы, давайтэ я вам помогу нэсты, бо віетэ аж попотыелі, двыгаючы багаж", — сказаў Полік. "Просім, калі вы такі добры", — згадзіліся жанчыны і аддалі яму па адной пачцы. Полік данёс пачкі да шашы і, атрымаўшы падзяку, вярнуўся да касы. Да жанчын з-за горкі пад'ехаў фіят, глытнуў іх і дадаў газу, што толькі пыл стаў стаўбом за ім. Шлюбныя пары здагадаліся, у чым справа і хутчэй пабеглі дамоў, каб праверыць, што згінула.

Цяпер Іван кажа Поліку, што хаця свайго дабра не памагаў несці, як ён, а Полік адгрызваецца, што гэта было дабро Івана, бо ў яго забралі ўсяго пару кап, пару штук іншай вопраткі і дзесяць тысяч злотых, а грошы насіць не цяжка.

1977г.

## "ДЗІКІ"

У свабодную суботу і нядзелю (6 і 7 жніўня 1977 г.) аб'ездзіў я крыху вёсак з падножжа Белавежскай пушчы і сустракаўся з многімі людзьмі. Гутарка наша не пачыналася ад хвалення ці ганення

надвор'я. Адразу пасля прывітання людзі пыталі: "Што па грыбы прыехаў? О, у нас іх сёлета было столькі, што хоць ты касой касі". І гутарка пра грыбы ўваходзіла ў азарт, людзі пачыналі спрачацца, дзе іх ёсць больш і хто больш назбіраў. Цётка Васіліса сядзела на лавачцы і слухала, як мужыкі спорацъ, а пасля сказала: "Людэ, чого віетэ спорытэ дэ буольш грыбуоў? Коб нэ тыі з Гайноўкі з Былостоку і шчэ Буог знае з куоль, то ў нас грыбуоў сушаных было б по мышкові, але што ж, як з усюль прыізджают...?

— Грыбы то грыбы, — адазваўся незнаёмы мне чалавек, — але браткі тыя з горада за адным прыездам хочуць і дарэмна разбагацець. Яны акрамя грыбоў дзяруць нашу бульбу. "О так, правду віетэ, дядьку, кажэтэ, — падхапіў малады гаспадар, — халеры жывут у міесты, заробляют дужо грошы, а ўсё руомно крадут, як бы ім було шчэ мало, а зганяют на дзікуў".

Многа людзей скардзілася на гараджан за крадзеж бульбы. Смяяліся, што інтэлігенты прыязджаюць "вучыць", як мужыку жыць. — Але мы красці не хочам, — гаварылі, — няхай толькі ў нах не крадуць. Ад дзікоў мы абаронімся, а ад чалавека горш, бо гэта ж разумная жывёліна.

Сапраўды жывёліна, калі, быццам свіння, лезе ў чужую бульбу і, наварыўшы, не сароміцца паставіць яе на стол, ды совацъ у горла.

1977 г.

## МЕТАМАРФОЗА

Калісьці ездзіў па вёсках Шайко з Орлі і скупляў рознае староце. Даваў за гэта селядцы, гаршкі, кубачкі, а за яйкі нават плаціў грашыма. І вось гэты Шайко сказаў: "Дай Божа мне той розум, што ў мужыка на порэшты" (значыць, на канцы — па ўсім ужо).

У тыя часы Шайко меў рацыю, бо сапраўды мужыка кожны "надуваў": і жыд і паліцыянт, і гарадскі разумнік, і злодзей гарадскі (бо свой быў таксама мужыком). Але як жа ўсё гэта адышло ў далёкае і непаўторнае мінулае. Аж сэрца шчыміць, аж шкада, што нешта адышло безпаваротна. Аднак, калі добра падумаць, нічога нікуды не адышло, а толькі пераўтварылася. Каб бедны Шайко ўстаў з попелу, у які яго немцы ператварылі, то пабачыў бы, што цяпер мужык мае розум якраз тады, калі трэба, калі прыходзіць нагода для яго прымянення.

У чацвер зайшоў я на рынак, каб купіць нейкага мяса на суп. Бачу, у галях мяса — аж сталы трашчаць. І нават даступна. Толькі пры адным боксе народу цьма. Аказваецца, там ялавічына па 23 зл. (з

косткай). Ды нізкай якасці. Пайшоў я далей. Там ялавічыны хоць адбаўляй. І высокай якасці. Толькі па 60 зл. за кг. Амаль без чаргі. Далей свініна па 140 зл. за кг і г.д. Думаю: "Э, брат, калі ёсць такі выбар, то я цяляцінкі пашукаю! І пайшоў паглядзець ад клеткі да клеткі. Ёсць!

— Пачом у вас цяляціна?

— Гм, ці я ведаю? Рана прадаваў па сто сорак (я ўжо ў другую туру), а цяпер, калі возьмеце цэлую шынку, то аддам па сто дваццаць, а калі на кілаграмы, то па сто трыццаць.

— Зважце мне вось гэты кавалак. У той момант падыйшоў да мяне знаёмы, прывітаўся, пару слоў замянілі. Прадавец зважыў цяляцінку, загарнуў у паперу і сказаў ветліва: "Прашу, з вас сто трыццаць злотых".

Заплаціў я вызначаную ім цану, узяў цяляціну і пайшоў дамоў. Палажыў у халадзільнік, няхай будзе на два свабодныя дні жончынай працы (бо, як ведаеце, мая прафесія дазваляе быць свабодным, калі хачу). Жонка прыйшла з працы а я, як дзіцё "А я цяляціны купіў, ага".

— Ну, цяляціны? А дзе ж ты яе дастаў?

— У галях колькі хочаш.

— І дарагая?

— А я ведаю? За той кавалак, што ў халадзільніку, заплаціў сто трыццаць.

Жонка падыйшла да халадзільніка, каб пабачыць, колькі яе там, і... выняла з халадзільніка кавалак тлустай жоўтай ялавічыны.

Я вырачыў вочы: цяляціна худая (як у нас гавораць любыва) пераўтварылася ў тлустую старую ялавічыну.

Да сённяшняга дня не магу здагадацца, дзе адбылася метамарфоза: ці яшчэ ў руках мужыка-прадаўца, ці ў халадзільніку? Думаю аднак, што ў галях.

З нізкім паклонам розуму мужыка, ды з пашанай да Рэдакцыі.

1979 г.

## МУЖЧЫНЫ, ЗАПУСКАЙЦЕ БАРОДЫ!

Жыву ў людным месце Беластока, многія людзі ведаюць мяне. І я іх. Ведаю? "Добры дзень! Што чуваць?" На гэтым наша знаёмства канчалася.

Штосьці мяне спакусіла выгадаваць бараду. Выгода! Не трэба кожны дзень драць шчокі брытваю, не трэба выдаваць грошай на лязо, крэм і ваду "пасля брыцця". Ашчаднасць. Але найбольш карысная справа: мая пяцідзённая барада ўсіх цікавіць. Цяпер кожны сусед

пытае, як расце барада, ці не свярбіць. Ды і пахваліць: "Будзе густая, прыгожая". Суседкі у сваю чаргу, усміхаюцца да мяне і нават на каву запрашаюць. А адна сёння сказала, што цяпер я крыху падобны на мужчыну і дадала, нібыта мімаходам, што маглі б паехаць маёй сірэнкай у лес на грыбы.

Сірэнку маю ўжо даўно, але такой прапановы не меў. Аказваецца, мая барада больш вартасная, чым сірэнка і я — без барады.

Я ўсё жыццё здагадваўся, што мне чагосьці не хапае, але не ведаў чаго бо меў пакрысе ўсяго, што павінен мець сякі-такі мужчына. Цяпер ведаю: не хапала мне барады.

Барада — гэта магічны дадатак да мужчыны. Ужо шэсць дзён гадую бараду і яшчэ ні разу з жонкай добра не пасварыўся. Крыху чапляецца. Нічога не раблю, кажа, толькі перад люстэркам бараду гладжу. Учора нешта пра Харошчу напаміналa, але калі ўбачыла, як задрыжалі мае губы, адразу пачала хадзіць на цыпачках.

Заўсёды, прыйшоўшы з працы, толькі пераступіць парог, верашчыць: "Есці хачу!" А сёння ўвайшла і гаворыць: "Вася што будзем есці? Скажы, я раз-два прыгатоўлю" Ды адразу ўзялася абіраць бульбу. А дагэтуль усё гэта рабіў я. У пятнаццаць нуль-нуль быў на стале абед.

І пачала мяне лепш апранаць! На шпацыр выводзіць і марожанае купляе.

Мужчыны, гадуйце бароды! Яны вас не толькі ўпрыгожаць, але дапамогуць лягчэй жыць. Напрыклад, хто калі зверне на вас увагу ў чарзе па шынку? А сёння селядцоў купіў я без ніякага ўсяго. Калі толькі паявіўся ў магазіне, прадаўшчыца пабялела і дрыжачым голасам сказала: "Грамадзяне, прапусціце хворага чалавека".

Грамадзяне моўчкі расступіліся, і я купіў селядцоў.

Толькі канчаў сваё апавяданне, як прыперла з працы жонка і ад дзвярэй пытае: "Вася, як ты сябе адчуваеш? Мо б ты схадзіў да доктара?"

"Да якога доктара, калі ў мяне толькі зубы баляць", — здзівіўся я. Бачыце, як клапоцяцца пра мужа. А ўсё з-за барады.

1979 г.

## АЖ ГАЛАВА ТРАШЧЫЦЬ

Паважаная Рэдакцыя, жыццё падкінула мне тэму, а вось не магу прыдумаць загалоўка. Думаў, думаў, галава трашчыць, але нічога цікавага ў мой гарбуз не прыходзіць. Дык вырашыў сказаць, што хачу, а загаловак прыдумайце самі.

Калі чалавек жыве сярод кветак і раптам пападзе на пустыню, тады адчуе прыгожасць іх. І так ёсць з іншымі справамі. Людзі прывыкаюць да чагосьці, абжываюцца з асяроддзем і ім здаецца, што так і быць павінна, каму з нас прыйшло б у галаву, напрыклад, перад уездам у вёску Грабавец (не гавару ўжо аб Беластоку) паставіць табліцу з надпісам "У нас не кураць", або мыць гародніну.

Аднойчы спрачаўся я з суседам аб адносінах прадаўцоў да пакупнікоў, і той прыціснуў мяне такім аргументам: "Калі я ездзіў па Латвіі, то бачыў, што там усюды агародніна памытая так дакладна, што можна адразу класці ў гаршчок". Пачуўшы такое, пачаў я прыглядацца да нашай гародніны ў прадаўцоў. Толькі цяпер зразумеў цану зямлі. Пагоня за грашыма давядзе да таго, што хутка астанёмся без верхняга тлустага слоя нашай карміцелькі.

Паслала мяне жонка купіць цыбулі. Абыйшоў я ўсе ларкі, а цыбулі не прыкмеціў. Вярнуўся дамоў і гавару, што цыбулі няма.

— Як гэта няма?

— А вось так, няма і ўсё. Бачыў буракі, слівы, фасолю, а цыбулі не бачыў.

— А ты сам не глядзі, бо ты нічога не бачыш, акрамя спаднічак, спытай ці ёсць цыбуля. І апрача таго купі гародніну, бо ж заўтра трэба гарохавы сып зварыць — госці прыйдуць, чым пачастуеш?

Спярша я ўскіпеў, што жонка будзе гарохавым супам гасцей прымаць, але пасля падумаў, што госці з прыемнасцю з'ядуць, бо ў іх усё толькі шынка, ды саламі.

Хоць надуты, але ўсё ж я пайшоў у бліжэйшы "зеленяк". Над галовамі доўгай чаргі пытаю: "Цыбулю і гародніну дастану?"

— Оўшам.

Заняў я месца ў чарзе і давай замятаць вачыма ларок. Гародніцы не відаць. Стаіць многа драўляных скрынак і ў іх ляжаць грудачкі зямлі, але што гэта за грудачкі?...

Дайшла мая чарга — прашу пятрушку. Дзяўчына кладзе на вагу падоўжны кусок зямлі. Прашу селера, дзяўчына важыць кругленькі камок чарназёму. У цыбулі толькі хвасты відаць.

Прынёс усё гэта дамоў, упэцкаўся мыючы, упэцкаў ракавіну і вядро, а як ababраў, то аказалася, што ледзь хопіць на чатыры талеркі гарохавага супу. Ну, які тут даць загаловак?

1980 г.

## ВАЗЬМІ І ЗАХАЦІ...

У нас чалавек часам хоча кімсьці быць, але яго імкненні не заўсёды могуць здзейсніцца. Здзейсненне іх залежыць ад многага, але найлепш ад яго самога. Чалавек хоча, а ўсе як могуць, тармазяць яго імкненне і не задумаюцца нават, якую крыўду робяць яму. І як гэтым самым абкрадаюць сябе.

Колькі людзей шукае розных паслугачак! У газетах мільгаюць аб'-явы: прыму няньку, прыму апякунку, прыму гаспадыню. І ніводнай аб'явы, што нехта шукае апекуна, гаспадара і іншай хатаработніка. Чаму б мужчына, напрыклад, не мог пільнаваць дзяцей? Балючая дыскрымінацыя. Чаму на скрыжаваннях вуліц стаяць міліцыянершы і не горш за міліцыянераў кіруюць рухам? Чаму жанчыны не горш за мужчын водзяць трамваі, аўтобусы і тралейбусы? Чаму жанчына можа быць трэнерам, дырэктарам, лётчыкам, капітанам карабля і ўсім на свеце, а я не магу быць нянькай?

Падбухторыў сябе і вырашыў, што б не каштавала, буду няньчыць чужых дзяцей. Буду! І ніхто мяне з гэтай мэты не саб'е.

Падзяліўся вынашанай ідэяй з жонкаю. Якраз абедалі. Дык ад неспадзеўкі лыжкай амаль не задавілася, глытанула разам з супам. Добра, што ў мяне кулак не благі, стукнуў у спіну, лыжка выскачыла, толькі суп разліўся. Калі мая лепшая палавіна прыйшла ў сябе, сказала, што я блёкату наеўся. Гэтакая адсталасць і нецярпімасць так мяне раз'юшылі, што я спаць не мог. Як толькі развіднела, пабег па газету.

Ёсць! Аб'ява з тэлефонам. "Лекары прымуць апякунку да 6-гадовай дзяўчынкі". Ну, браток, лепшай працы табе не трэба. Дачакаўшы прыстойнай гадзіны, званю да панства лекараў. Трубку падняў мужчына: "Алё".

— Добры дзень, гэта ваша аб'ява ў газеце наконт нянькі?

— Наша. А вы прапануеце старэйшую ці малодшую жанчыну?

— Я прапаную мужчыну, сябе.

У тэлефоне сапенне.

— Алё, алё, пане доктар я не жартую, я...

— Ага, — адазваўся ўрэшце тэлефон, — значыць вы прапануеце сябе? Дасканала. Дайце мне ваш нумар, вам пазваню.

— Калі ласка.

Аднак тэлефона я не дачакаўся. Відаць пан доктар таксама адсталы чалавек. Відаць, не патрапіць уявіць, што мужчына можа пільнаваць дзяцей. А я ж дзяцей люблю. Калі б мне іх даверылі, лепшай нянькі не знойдзеце. Пры тым я ўмею крыху чытаць і вельмі люблю казкі. Чытаў бы, вадзіў бы дзіцё па горадзе, паказаў бы розныя

цікавінкі, карміў бы чыстымі рукамі (і дзіцяці рукі мыў бы), чаго ніводная нянька не робіць. Апрача таго не цікаўлюся чужымі шафамі, каморкамі таксама (ці ж можа гэтым пахваліцца хоць адна жанчына?). І на ежу не ласомы. З фруктаў ем толькі грушы. Трускалак і ў рот не бяру. Піва і гарэлкі таксама.

Вось каго пазбыўся лекар! Ідэалу. Відаць, мая прапанова апекавацца яго дачусяй гаварыла яму адно: звоніць вар'ят або алкаголік. Да чаго даводзіць адсталасць.

1980 г.

## ВЕРЦЕ — НЕ ВЕРЦЕ

Мне сняцца сны, якія часта збываюцца. Здараюцца і такія актыўныя, што нават жонка адчувае іх сілу.

Аднойчы снілася мне, што я ў Варшаве, на вуліцы Навагрудскай, на апошнім прыпынку ЭКД, і на мяне напалі бандыты. Я абапёрся спіной аб сцяну, каб тыя не ўзялі мяне з боку, і, учапіўшыся рукамі за поручні, што аддзяляюць вуліцу ад касы, пачаў бараніцца нагамі. Матаю нажыскамі, а бандыты ўсё набліжаюцца. Асабліва правадыр іх. Ну, думаю, хадзі, хадзі, як дам нагою пад пуза, дык накрыешся, гад. А ён ідзе. Я мацней схапіўся за поручні, ды як удару нагой у бандыцкае пуза! Аж сцяна войкнула і шклянкі ў шафе забразгалі. А жонка крычыць: — Што здарылася?!

Нага балела страшна. І злосны быў, што не дасніў і напалохаў жонку. Расказаў ёй сон, а яна кажа: — Не маеш чаго рабіць, то ваюеш з бандытамі. Хоць бы крыху ночы прысвяціў мне.

Павярнулася, павярцелася і заснула. Я таксама заснуў. І зноў бачу тых жа бандытаў на той жа станцыі. І я, абапёршы спіною аб тую ж самую сцяну. Адна толькі інавацыя: у маіх руках пісталет. Ну, думаю, цяпер будзеце драпаць, колькі сіл у нагах. Прыцэліўся ў першага, найгразнейшага і — бах. А куля ляціць да яго так, што нават калі б і ўдарыла, не пачуў бы. Я яшчэ раз бах. І трэці раз стрэліў. Але ўсе мае кулькі памаленьку да яго ляцяць, а ён узбычыўшыся, насядае на мяне. А тыя збоку падбадзёрваюць таварыша. У мяне ўжо валасы дыбам стаяць. Калі вораг наблізіўся на адлегласць працягнутай рукі і я пераканаўся, што пісталетам крыўды яму не зраблю, вырашыў даць лайдаку па мордзе рукою. Размахнуўся і трэснуў з усёй сілы па паганавай твары. А жонка крычыць і плача. І праклінае мяне (маўляў, навошта за мяне выйшла, калі мела столькі розных хлопцаў і нават былі такія, што абяцалі ажаніцца).

Я збянтэжаны, перапрашаў і тлумачыў, што гэта віна таго паганца, што насядаў на мяне на станцыі ЭКД. Аднак жонка мне не верыла. Гаварыла, што знайшоў спосаб адпомсціць.

Часта таксама сніцца мне брыццё. Сёння нават брыўся машынкай без абудовы, голымі ножыкамі. Выбрыўся так, што пацягнуўжы рукой па твары, думаў, што гладжу паліраваную сталь. Цешыўся, што навучыўся як брыцца. Устаўшы, задумаўся над сном. Прыпомніў каляндар, які калісьці Астрон надрукаваў дзеля практычнага прымянення (каб грамадзяне ведалі, калі сноў баяцца, а калі цешыцца). Ат, думаю, гэты сон паршывы, бо ён і дзень якраз дрэнны. Ды чорт з ім, хай ідзе туды, куды і ноч пайшла.

Паснедаў, паставіў варыць студзіну, узяў электрабрытву "Харкіў" і пачаў брыцца. Яна мяне так не выбрыла, як тая ноччу, але ўсё ж. Напісаў у "Ніву" інфармацыю і, выключыўшы газ, панёс у рэдакцыю. Захапіў з сабою і ашчадныя талоны, каб зайсці ў ПКО — і што вы скажаце! — на адзін бон семнаццаць тысяч, на другі дзве з паловай. Ура! А калі так, дык хутчэй пахваліцца жонцы (яна ніколі не мае грошай удосталь, хай цешыцца). А яна не паверыла. Са злосцю "ўбіваў" сваю праўду. Урэшце дайшло: жонка прызначыла мой выйгрыш сабе на паліто. Не стаў я па тэлефону аспрэчваць яе рашэння і папёр у "Цэнтраль" па "Белы аіст". Каньяк купіў за старыя грошы, якія былі ў задняй кішэні (новыя схаваў за пазуху). Прыбег дамоў, паставіў "Белы аіст" на стол і думаю: давай яшчэ раз пералічу выйгрыш. Шусь за пазуху — няма. То я ў другую кішэню. Таксама няма. "Ага, хіба грошы ў сумцы?" Заглядаю ў сумку, і там не відаць. Што за ліха. Думаю, куды я іх уваткнуў? Нервова пачаў пературасаць вопратку. Грошай не было. Я ў "Цэнтраль". Думаў, мо недзе на дарозе ляжаць. На жаль, думка не апраўдалася. Як жа Цяпер пакажуся жонцы? Хадзіў па дарозе, па парку, абы дачакацца пакуль жонка засне. У адзінаццаць нуль-нуль Ціхенька адчыняю дзверы, а з пакою высоўваецца галава маёй благавернай (якая ж яна абрыдлая, зараз пачнецца допыт). І жонка пытае:

— Вася, дзе ты так доўга быў, я не магла цябе дачакацца?

-Ты чакала мяне ці грошай? — злосна пытаю. — Ніколі ж так доўга не чакала.

— О, ужо думае, што лакома на яго грошы!

— То і добра, што не лакомішся, бо іх у мяне няма.

— Не жартуй...

— Не маю і ўсё. І хачу спаць!

— Слухай, мантач, калі ты хлусціў: тады, як гаварыў, што выйграў, ці цяпер, калі аддаў на к...?

Я ведаю, што сны спраўджаюцца, а вы верце — не верце...
1980 г.

## ПАРАНЕНАЕ ПАВЕТРА

У нядзелю 24 жніўня, паабедаўшы выйшаў я глытнуць паветра (не скажу, што свежага — усюды дым). Гляджу, народ валіць на стадыён, на футбольны матч паміж "Ягелёніяй" і "Краковіяй". Як тут не паддацца агульнаму настрою! Трэба падтрымаць нашых другалігоўцаў. Пабег я па цёплую куртку, і на аўтобусны прыпынак. Аўтобусы толькі мігалі, ніводзін не хацеў спыніцца. Урэшце, праз паўгадзіны, нейкі спагадлівы шафёр узяў.

Толькі ўварваўся я з білетам за 40 злотых на стадыён, як суддзя даў сігнал на гульню. У першых мінутах ігракі абедзвюх каманд не бегалі, як гэта павінна быць, а хадзілі, быццам ім не было куды спяшацца. Аж (адкуль не вазьміся!) на стрыжаную траву стадыёна ўбег чорны сабака. І пачаў ён ганяцца то за тым, то за гэтым футбалістам. Аднак выбіраў кракавяк. Стадыён у захапленні рагатаў. У гэтай сітуацыі суддзя вымушаны быў спыніць гульню. Пачалі сабачку выганяць. А той думаў, што з ім гуляюць і давай выгінаць хвост і бегаць навакол. Яго лавілі, а ён уцякаў усё глыбей у цэнтр поля і ўцешна агрызаўся. Урэшце супольнымі намаганнямі (пры вялікай падтрымцы трэнераў) удалося збянтэжанага чацвераногага балельшчыка нашай каманды выдварыць з поля.

Збянтэжыўся сабачка, гэта праўда, але сваё зрабіў. Ігракі пачалі бегаць. Аднак нерваваліся, паветра стагнала. Цяпер ужо балельшчыкі не рагаталі: лаялі сваіх, чужых і арбітра. А ігракі, як на злосць, ніяк не маглі трапіць у мяч, толькі нагамі і галовамі паролі паветра. А яно аж сінела ад болю. Мяч лавілі рукамі. Суддзя не свістаў, не караў, за ручную гульню, бо бачыў, што мячом ніхто не завалодае. Так закончыліся першыя 45 мінут.

У другой палавіне давялося мне сядзець са сваім сябрам Юркам. Ён не прапускае ніводнага матча. Як добра, што ён і сёння быў, а то нашы прайгралі б і ніхто не ведаў бы чаму. Юрка памагаў як мог, як толькі дазвалялі ўмовы стадыёна. Божа, колькі мне і суседзям д асталося ад яго! Юрка гроб, біў, шустаў нагамі. Па лаўцы і бетону. Пінаў суседзяў па нагах, тоўк нас кулакамі і локцямі. Я, убачыўшы гэта, спярша рагатаў (аж калоць пачало ў дыхах), потым злякаўся. А Юрка нас лупіў і крычаў футбалістам як там забіць гол. Адначасова хваліў Селівоніка (нумар 10).

І што вы думаеце, дабіўся свайго. Беластаччане пачалі гуляць смялей, зручней. Усё больш атакавалі вароты гасцей. Праўда, не траплялі мячом у вароты, але гэта не іх віна, бо раз, вароты вузкаватыя і нізкаватыя, а па-другое, у іх стаяў яшчэ і варатар.

Але Юрка так хварэў, што не аставіў абыякавымі нашых футбалістаў. Яны знерваваліся і на 68 мінуце загналі мяч у вароты. Больш не ўдалося, бо кракавяне бараніліся. Але і так Ягелоніі 2 ачкі. Дзякуй чорнаму сабачцы, які ўмела пакіраваў нашай камандай.

1980 г.

## ЦІ "НІЗКА" — УСЮДЫ НІЗКА?

Да сённяшняга фельетона загналі мяне цырульнікі. Вы, паважаныя чытачы, пэўна, думаеце, што я хлушу. Маўляў, цырульнікі не прымушаюць нікога сілай. О, тады яны вас яшчэ не давялі да шаленства. І спосаб у іх на пераўтварэнне вас у шалёнага вельмі просты. Не мандатам узбудзяць яны вашы нервы, не судовай валакітай. Прыдушаць яны вас звычайнай электрычнай машынкай.

Заўсёды хадзіў я падстрыгацца да адной пані. Хоць яе майстэрня IV катэгорыі і далёка ад майго дома, але ў яе ёсць добры густ: ведае, што каму пасуе.

На гэты раз я вельмі спяшаўся і забег у цырульню І катэгорыі, што ля майго дома. Чаргі не было. Я прывітаўся з цырульнікам, з якім быў ужо знаёмы (аднойчы "падраўняў" ён мне бакі, што левы быў вышэй вуха, а правы пасярэдзіне і людзі думалі, што ў мяне вушы выраслі фальшыва) і выбраў іншага "фахмана". Той пасадзіў мяне ў крэсла і спытаў: "Нізка, ці высока" Я сказаў: "Прашу нізенька".

Цырульнік расчасаў мае валасы на дзве роўненькія часткі з белай баразной пасярэдзіне галавы ды, узяўшы машыну, запусціў яе ў маю чупрыну. Пакуль я агледзеўся, машынка ўжо арудавала на сярэдзіне галавы.

— Пане майстар, — застагнаў я, я ж прасіў нізка!

— Стрыгу так, як кліент жадаў, — адказаў стрыгун.

Я спыніў дыскусію, спужаўся, што майстар выпусціць мяне з грыўкай над лбом. Вядома, можа знервавацца і дасць машынцы волю. Што будзе, то будзе — дасядзеў да канца.

Урэшце цырульнік зняў з мяне прасцінку, шчотачкай заглянуў за каўнерык ды сказаў:

— Гатова, дваццаць злотых!

Заплаціў я, падзякаваў, развітаўся і пайшоў дамоў. Прыходжу, а жонка гаворыць:

— Ого, вясна будзе!

— Якая вясна! — не скеміў я.

— Цяпер жа люты.

— Люты? — іранізуе жонка. А ты ж падстрыгся як на лета.

— Чорт іх ведае, гэтых цырульнікаў, — спавядаюся жонцы. — Хадзіў да майстра IV катэгорыі, усё было ў парадку. Думаў, што ўсюды "нізка" абазначае нізка. Аказваецца, у вышэйшых салонах усё наадварот.

— Ты прасіў "нізка"? — смяецца жонка.

— Ну.

— Не нукай, а прыпомні, як косяць траву на лонцы. "Нізка" — значыць, пад корань.

Прызнаў я жонцы рацыю і цяпер, яна мяне стрыжэ.

1980 г.

## ВЫЛЕЧЫЛІ

Лёг я ў бальніцу ў апошні сакавіцкі панядзелак, хоць накіраванне атрымаў у студзені. Усё "няма месца" адказвалі на мой тэлефон. Дастаў я накіраванне на аснове болю ў жываце, а чакаючы свабоднага месца, паспеў захварэць на сэрца.

Лёг я, але ж не ляжыцца, калі трэба столькі ўсяго напісаць у "Ніву". Не магу ж я з лёгкім сэрцам прамаўчаць выказванні Уладзіка Сідарука на тэму карэспандэнтаў, ці натураліста Барыслава Рудкоўскіна на тэму забівання звяроў пры дапамозе чарговых прылад. Лап за аўтаручку і, лежачы на пузе, пачаў пісаць аб людзяхбандытах. Нічога напісаць не ўдалося, але ўдалося звярнуць на сябе ўвагу лекараў. Яны, убачыўшы, што не ляжу пад пледам і не стагну, вырашылі, што здаровы, што камбіную і перасталі звяртаць на мяне ўвагу. З іх паводзін лёгка было зразумець, што я ў бальніцы апынуўся выпадкова.

Усе мяне тут прымалі, як няпрошанага госця. Усім суп і другое блюда, а мне сухая бульба з рэдзькаю. Быў я без снедання, але і гэтага не з'еў — у знак пратэсту. На вячэру ўсім шынка, масла і белы хлеб, а мне ваду з постам, у якой варылі рыс. Ведаю, што рыс, бо пару крупінак плавала на талерцы: відаць, сітка прапускала, або талерка была ад рысу. Вячэра ў васемнаццаць, а праз дзве гадзіны мае калегі па зале дабываюць з шафак хто што мае і ўмінаюць, а мяне чума бярэ, што галодны і нічога не маю. Ляжу ды слухаю, як кішкі марш іграюць. Дачакаўся другога дня, і тое самае, бо дыэтэтычка забыла вызначыць мне дыету. З ласкі атрымаў малочны суп. На трэці дзень заходжу на снеданне, ужо як паўнапраўны, заправіянтаваны. Гляджу,

на сталах талеркі з малочным супам, талеркі з маслам і мартадэляй, ды збан з каваю і кубачкі. З'еў суп, аддаю ў акенца талерку, ды прашу каўбасы. Жанчына глядзіць на мяне як на вар'ята і кажа: "Суп магу даць, а каўбасы — не, бо порцыі палічаны". Сканфужаны гавару, што я па сваю, а не па дадатковую. Жанчына ўсміхнулася іранічна і падала мне скрылечак каўбасы, ды паўпорцыі масла. Відаць, падумала, што зрабіла мне вялікую ласку. За ўвесь перыяд майго прабывання ў бальніцы глядзела на мяне як на хітруна-абжору. А я сарамліва спускаў вочы і баяўся выйсці на калідор, каб яе не сустрэць.

Калідор! Калі яго мыюць, то так як я мыў у арміі. Аднойчы быў дзяжурным па зале. Дзяжурны па роце крыкнуў "На пастраенне!" Я, як і ўсе, схапіў аўтамат і бягом на двор. Калі ўжо ўзводы сфармавалі шарэнгі, прыбег мой камандзір аддзялення і крыкнуў: "Петручук не вымыў падлогі ў зале, бягом марш!" Я прыпёр наверх, схапіў квартачку вады і анучаю памачыў падлогу. Нават не ўсюды памачыў, бо квартачка гэта ж малая. Але ўбег "пісталет" і пахваліў, што хутка памыў. Пабеглі мы абодва на пастраенне і нават ніхто не заўважыў нашай адсутнасці. Толькі пытанне: ці падлога была вымыта?

Пагаворка пераконвае нас, што які пан, такі крам. А тут наадварот, які крам, такі пан. Якая бальніца, такія і мы. Да ўмывальні і прыбіральні цяжка прабрацца. Хто першы паспее заняць месца, пакідае яе так, быццам другому робіць на злосць. Тут таксама прыкмеціў я цікавую з'яву. Менавіта заўважыў я, што кожны хворы, устаўшы з ложка, пачынае ранішні туалет ад мыцця. А ўжо калі вымые рукі і твар, тады ідзе да кабіны і апаражняе нос ды жывот і ўжо пасля гэтага рук не мые. Добра, што чалавек сябе не брыдзіцца. Не, мы думаем толькі пра сябе. Вядзем сябе дзіка і не хочам інакш.

А ўжо пра такую дробязь", як святло ці гарачая вада, то і гаварыць няма чаго. Зубы мыюць, вада льецца поўным струменем, брыюцца машынкай, вада гарачая струменем. Нават адзін такі ляжаў, што на галаве меў не больш дзесяці валасоў. І кожны дзень па некалькі разоў прабаваў іх прычасаць. Станавіўся ля ракавіны, пускаў ваду на "поўны ход" і, мачыўшы ў ёй грэбень, лізаў валасы. А яны ніяк не хацелі ляжаць. Я аднойчы пацікавіўся і змерыў час. Аказалася, што ён чэша сваю "чупрыну" не менш васьмі мінут. А гэта дае ванну гарачай вады. Ніколі нікому не прыйдзе ў галаву, каб выключыць удзень святло. У прыбіральні ёсць два велізарныя вокны, ад дзённага святла хоць іголкі збірай, але чатыры лампачкі гараць.

Ляжаў я там дзевяць дзён і ўсе гэтыя дні ў час лекарскіх абходаў прасіў нейкага сродка для паласкання горла. Баліць яно мне. Кожны

дзень абяцалі і ні разу ніхто не глянуў у горла, ды не даў нічога для лячэння. Відаць, ратавалі дэфіцыт.

У бальніцу ішоў я бадзёры, а адтуль ледзь ногі прывалок. Але ў інфармацыйнай карце напісалі, што "хворы вяртаецца дамоў у добрым стане і ні на што не скардзіцца."

Даражэнькія, прыкідвайцеся здаровымі і не трапляйце Ў бальніцу!

1980 г.

## УРЭШЦЕ ПАПАЛІ

Цётка майго сябра дрыжыць на думку аб магчымасці скanaння. — Збоку гледзячы, можна падумаць, — гаворыць сябар, — што цётка ў рай не верыць.

Я, у сваю чаргу, яму, гіцлю не веру, бо ён хлус. Я таксама маю цётку і нічога такога не заўважаю. Ілжэ, паганец, але я слухаю, бо што, маю каву пакінуць, якой мяне пачаставаў? А ён выкарыстоўвае маю прагнасць і гаворыць амаль не спыняючыся. Яго цётка абыйшла всіх дактароў, якіх толькі ведалі яе сваякі, усіх знахароў і шаптух, якія толькі існуюць у нас. Усе ёй гавораць, бы ў адну трубку трубяць, што яна здаровая і ніякіх лякарстваў не патрабуе. А яна ім не верыць, бо адзін з дактароў сказаў, што будзе яшчэ здаравейшай, калі перастане тры разы ў дзень чарнічны суп на касцях есці. Яна, бы місіянер, ходзіць па ўсіх, хто толькі мае нешта супольнае з лячэннем, і пераконвае, што каб іх слухала, то даўно грызла б святую зямлю, а так яшчэ ходзіць і дзяцей глядзіць. — Няхай яны смяюцца з супу чарнічнага на касцях, — гаворыць быццам яго цётка, — а я яшчэ і перцу дадам.

Ой, ілжэ сябрук, ілжэ, але што ты зробіш з чалавекам, які ілгуном нарадзіўся. Я ж таксама маю цётку, але яна ціхая, спакойная, нічога чужога не чапае і з нявесткамі не сварыцца, глядзіць іхніх дзяцей, ходзіць у царкву, памагае бедным, не ходзіць па дактарах, а тым больш па шаптухах. А ўжо пра алкаголь то і не падумае. На думку аб ім у маёй цёткі нос сінее. Дзе там, барані Божа... Здараецца, што ў хаце выпіваюць у нейкае вялікае свята, то мая цётка выходзіць, каб не пачуць паху гарэлкі, бо ёй зараз галава баліць. А цётка сябра (я яму не веру) быццам галаўны боль лечыць алкаголем. Вось такі прыклад прыводзіць ілгун. Калісьці да цётчынага сына прыехаў госць. Сын пасадзіў яго ў пакоі за сталом, каб даць паабедаць. У тым часе цётцы балела галава і яна мела выпіць парашок. Але ўбачыла, што сядалі за стол, парашок адлажыла. Нявестка яе пытае чаму палажыла на акне

парашок, трэба ж выпіць, калі галава баліць. А цётка кажа: "Пакуль не буду піць парашка, бо зараз пачнуць піць гарэлку і да мяне прывяжуцца, каб чарку з імі выпіла".

— Не будуць піць, бо госць гарэлкі не п'е, — адказала нявестка.

— То госць няхай не п'е, але ж паставіць трэба, бо як жа ж абедаць без гарэлкі, — засумавала гасцінная жанчына.

Сын паставіў на стол бутэльку, а цётка хутчэй са сваёй шкляначкай і перцам да стала. П'е і гаворыць: "О, тото добра, я сабе напарстачак вып'ю, то і з'ем як трэба а вы мужчыны маладыя вып'еце рэшту". Так і было: мужчыны выпілі рэшту, бо яны пілі "напарсткамі", а цётка "соткаю".

— Ну вось, зноў пацяплела, — прадаўжае ілгун, — і цётка пачала аднова шукаць лекара, які прадоўжыў бы ёй жыццё. Заехала да найслаўнейшага. Той паглядзеў, змерыў ціск, абслухаў, абстукаў і бачыць, што жанчыне нічога страшнага не дакучае, прыпісаў парашкі і адправіў дамоў.

Цётка ілгуна (бо я яму не веру) парашкоў не ўзяла, значыць, не выпіла ні воднага і на другі дзень паперла Ў амбулаторыю з прэтэнзіямі: "гаўно тыя вашыя парашкі памагаюць".

— То чаго вы хочаце, хворая? — пытае збянтэжаны лекар.

— Я хачу вось такія, — паказала пяддзю, — уколы!

— Вам, хворая, ніякіх уколаў не трэба, вы крыху толькі недамагаеце, быццам, ад нікатыну. Вы курыце?

— О, яшчэ што выдумаў, вялікі доктар, мне, старой, курыць?..

— А мо вы крыху выпілі?

Старая маўчыць.

— Ну выпілі крыху, ці не?

— Колькі я там выпіла...

— Ну, вось ідзіце дамоў, вазьміце парашкі і ляжце. Адпачнце, усё будзе добра.

— Нічога не будзе добра, пакуль я не дастану вось такіх уколаў.

Цётка села ў крэсла. Лекар з сястрою пераглянуліся.

Сястра, хітрая баба, кажа:

— Пане доктар, вы яшчэ раз паглядзіце жанчыну, мо сапраўды ёй нешта дакучае. Мо ёй памогуць дарагія ўколы?

— Як жа я іх дам, калі жанчына здаровая, а ў мяне іх мала?

— Ой, пане доктар, не шкадуйце, няхай хворая хутчэй здаравее.

— Ну, добра, калі ўжо вы, сястра, так упіраецеся, то прыгатоўце шпрыц. А вы, жанчына, падымайце спадніцу!

Хворая рассупонілася, выставіла мяккае месца і сястра ў цётчынае цела ўбіла вялікую іголку з аквай. Пякло цётцы, але была задаволена, сказала, што гэта паможа, бо надта пячэ.

На другі дзень цётка пабегла ў амбулаторыю аддзякаваць сястры за укол, які вярнуў ёй здароўе, а на скупота лекара нават не глянула, — дакончыў ілгун.

1980 г.

## СВЕЖАНЬКАЕ

Калі прыходзіць свята, мясныя магазіны асаджваў натоўп: з выпханымі жыватамі, а малымі дзецьмі на руках (сваімі і пазычанымі), з інвалідскімі кастылямі.

На мяса і каўбасы я паклаў крыжык, ведаў, што не дастану. А жонка ўжо і разводам пагражае, калі не буду яе карміць. Я спрабаваў жонку пераканаць, што мы не выглядаем горш за тых, што мяса з мясам ядуць. Але дзе там, хто пераканае жанчыну, як ёй хочацца добрай каўбасы якраз тады, калі яе цяжка дастаць. Ну, думаю, навошта мне з жонкай сварыцца, тым больш, што яна мае рацыю. І пайшоў у чаргу па сала.

Людзі стаяць, як добрыя знаёмыя, і гавораць прыцішана (але так, каб іншыя чулі), што ў чарзе заўсёды тыя самыя твары. Адзін толькі чужы ўлез — ківаюць барадамі ў мой бок. У мяне нарастае злосць, што пашкадаваў жонку. Аднак у чарзе стаяць моўчкі сумна і падключаюся да суседкі спераду:

— Ці вы засведчыце, што я за вамі стаю? Я б хацеў выйсці з чаргі і пазваніць у важнай справе.

— Я не ведаю, як пасля будзе, — кажа суседка. — Вас могуць не пусціць, бо тут многія выйшлі па важных прычынах, і кожны хоча дастаць мяса.

— Я не па мяса, я хачу дастаць сала.

— Сала? Дык яно ж без чаргі.

Пачаў я прабірацца да прылаўка. Абедзве чаргі, звычайныя і "інвалідская", заварушылася. Пачуліся галасы крытыкі. Я аднак пхаўся. Вось і першая лінія змагарнага фронту. Ціхім голасам (бо сорамна пад свята купляць адно сала) пытаю кіраўнічку, ці прадасць мне паўкілаграма. Кіраўнічка моўчкі важыць камусьці лапатку. Пасля звяртаецца да наступнага. А я, сканфужаны, стаю ля прылаўка і баюся глянуць у бок: бо чую, як на мяне глядзяць пастаянныя аматары свініны. Паўтараю пытанне, але ўжо зусім няўдачна: прахрыпеў мой голас, бы пачаткуючы жабрак. Гэта магло кіраўнічку толькі рассмяшыць. Я

выразна поўзаў перад гэтай жанчынай, якая магла прымяніць супраць мяне сваё права і аставіць на свята без сала. Аднак нехта з "інвалідкай" чаргі пашкадаваў мяне і кажа:

— Крыкні галасней, бо твайго мармытання ніхто не чуе.

Я паўтарыў пытанне яшчэ раз. Кіраўнічка ўзняла на мяне вочы і кажа (але так кажа, каб усе чулі):

— Чаго вы крычыце; я чатырнаццаць гадзін на нагах і не магу вас усіх абслужыць!

Божа ж ты мой, Божа! Як яна гэтак сказала, абедзве чаргі зараўлі.

Па-заячы драпануў я з магазіна, схапіўшы сала, як чорт грэшную душу.

1980 г.

* * *

Не паверыце, выходжу з дому, бачу ля сметніка падручны возік, а на ім скрынка, у якой ляжыць сала вялікімі кавалкамі і каўбаса пруткамі. Пытаю гаспадара возіка, куды ён гэтае дабро дастаўляе. А той рагоча:

— Пане, я кожны год выбіраю са сметніка столькі гэтага дабра, што вам і не сніцца. І сам не ведаю, чаму людзі гэта ўсё выкідаюць: у халадзільніку магло б паляжаць. О, гэта каўбаса нават колеру не змяніла. А сала выкідаюць нават салёнае. Ім давай усё свежанькае, сённяшняе...

## ДЗІВАКІ — ГА, ГА, ГА!

Людзі гавораць, што смяецца той, хто смяецца апошнім. Добра ім так казаць, няхай бы апынуліся на маім месцы сярод дасканалых крытыкаў, тады б пабачылі, ці было б ім да смеху.

Напісаў я некалі для "Зоркі" вершык "Казка пра Крата". Дык вось там гаварылася, што Кроцік той быў надта лянівы, і асцярожны. Баяўся мыцця, каб капелька вады выпадкова не прыснула яму ў вочы. Калі я гэты вершык прачытаў узрослым людзям, адзін прысутны адразу са знаўствам заявіў: "Якія ты глупота дзецям выпісваеш. Ад калі, па-твойму, у крата ёсць вочы?

"Вось іменна, — падтрымаў яго чалавек з вышэйшай адукацыяй, — цікавая вынаходлівасць. Я колькі разоў бачыў крата, а ніколі не ўдалося мне заўважыць яго вачэй." "Бо ён іх не мае, — з насмешкай нада мной адазваўся першы. — Я, брат ты мой з гаспадароў і цяпер

маю дзялку, па якой кратоў хоць адбаўляй, а вачэй ані ў аднаго няма і ўсё!"

"Хлопцы, — адзываюся сканфужаны.

— Гэта ж у пераносным сэнсе. А ці ж міска, лыжка і ложак у нары крата ёсць?"

"Каша можа там быць, бо маці Краціха магла недзе ўкрасці і нанасіць". "Ну, але краты не ядуць лыжкай з місак, — баранюся я". "Мы не ведаем, што там у іх у норах ёсць. Але ты перастань дзецям марочыць галаву, што ў кратоў ёсць вочы!"

Гаспадар спрачаўся са мною, чалавек з вышэйшай адукацыяй хадзіў па пакоі, засунуўшы рукі ў кішэні, і паглядаў на мяне з іроніяй. А я замест смяяцца з іх, злаваў, што не ўдаецца мне іх пераканаць. Чаму яны, тлумачыў я сабе, не могуць зразумець, што я напісаў пра Кроціка, меўшы на думцы дзяцей гомасап'енса (чалавека разумнага), да якога належаць мае ўпартыя сябры і я сам, на жаль. Чаму, на жаль? А проста таму, што чым больш пазнаю людзей, тым больш люблю звяроў.

1980 г.

## ТОЛЬКІ ГРЫВУ ВІДАЦЬ

Цяпер усюды аднолькава, ці ў горадзе, ці ў вёсцы. Святло ў горадзе — святло ў вёсцы, трактар у горадзе — трактар у вёсцы, самаход тут і там. Самагонка ў горадзе — самагонка ў вёсцы (вясковыя лепшыя, бо з жыта, а не з цукру), авечкі там і там, сабак поўна ўсюды, свіней хоць адбаўляй, а свініны малавата (у горадзе і ў сяле) Адукацыя зраўнялася, бо ж зборныя школы; вопратка зраўнялася, бо ўся купная. Дываны, мэбля, тэлевізары ідэнтычныя. Ну, можа адно толькі адрознівае горад ад вёскі. У вёсцы няма трамваяў, а ў горадзе вясковага малака. Але хто на такія дробязі звяртае ўвагу? Галоўнае — умовы жыцця зраўняліся і культура. Напрыклад, рук не мыюць перад ядой у горадзе і на вёсцы. Ой, ой, зараз шум. Не гавару пра ўсіх. Рэстараны, забягалаўкі таксама аднолькавыя, не маюць чаго зайздросціць адны другім. А вось мястэчкі перараслі гарады ў галіне навуковага сексуалізму!

Калі я крыху гэтым заняўся, то ўбачыў, што жанчыны мястэчак куды лепш умеюць заспакоіць нашу цікавасць і ахвоту раскошнага перажывання трывожнай ночы. У горадзе намеру Беластока няма аніякіх атракцый. У вялікай агламерацыі ўсё, што робіцца, адбываецца паціху, і нічога ніхто аб нікім не ведае. Усе задаволены і нават

няма з каго крыху пасмяяцца. На вёсцы любяць больш атракцый. Наогул вясковы народ весялейшы.

Нядаўна адзін мой знаёмы паехаў у мястэчка на кірмаш прадаваць кабылу і вала. Прадаў. Толькі за кабылу ўзяў трыццаць пяць тысяч злотых. А колькі завала — ніхто не ведае. Ну, калі прадаў, то зайшоў у "рыгалаўку" выпіць барыш. А гэта чалавек, які аж дрыжыць, калі ўбачыць чужую жонку. Тады ён п'е гарэлку, а сліна цячэ з рота, як у сабакі, ды вочы вылазяць з ілба. Так было і цяпер, калі лакомы на секс хітрун прадаў кабылу і бычка. Ён уявіў сабе Дон Жуанам, калі прыкмеціў, што жанчына (год пад шэсцьдзесят) за суседнім столікам сочыць за ім. З'ядаў яе позіркам. І трапіў на кручок. Пайшлі разам да яе на кватэру з мэтай перажыць прыгоду. Распрануўся, а тут уваходзяць два вярзілы. Вопратку з кашальком забралі, аматара чужога ложка адлупцавалі і ў кальсонах выкінулі з хаты. Добрымі былі людзьмі, бо чаравікі выкінулі за ім, каб бегучы дадому, не пакалечыў ног.

Над раніцай дабрыў дахаты.

— Бандыты пераступілі, — тлумачыцца перад жонкай, — разам з вопраткай забралі і грошы.

Яна аднак у банду не паверыла. Калі прыцiснула яго добра, "прызнаўся": пасля выпіўкі нейкія мужчыны зацягнулі яго сілай у "чужую хату і ўсё забралі. Адрас падаў, думаў, жонка грошы адбярэ.

І жонка паехала ў мястэчка. Застаўшы пад указаным адрасам жанчыну, пачала прасіць, каб тая пашкадавала яе і вярнула хаця б за кабылу (ужо чорт з валом, няхай прападае). А тая бессаромна задзерла спадніцу і, ляпнуўшы рукой па голым пузе, сказала: "Кабыла тут, толькі грыва відаць".

І паслала цётку к чорту.

Вось гэта атракцыя! Хто ведаў бы аб гэткім у горадзе?

1980 г.

## ГНОМЫ

*(Карэспандэнцыя з Чэхаславакіі)*

Усе мамы, бабулі і цёткі ведаюць казкі аб гномах. Расказваюць гэтыя казкі, сваім дзецям і ўнукам. А я хачу расказаць вам праўду пра гэтых мілых і сімпатычных карлікаў, якія ананімна і бескарысна памагаюць людзям.

Усе пра іх ведаюць, але дзе яны жывуць — хто адкажа? А вось я ведаю. Гномы пасяліліся ў Чэхаславакіі. Не ведаю, што ім тут так спадабалася: людзі, горы ці паветра? Людзей тут малавата — кожныя

рукі на вагу золата, гор многа, але яны ў поўным сэнсе слова хлеба не даюць, а паветра... Паветра тут не найлепшае, навакол фабрыкі і электрастанцыі, усюды дым і сера. Ну, не лічыце куртаў, як Карлавы Вары, Францішкавы Лазні і іншыя. Там паветра сярэбранае — чыстае і здаровае. Але ў гэтых курортных мясцінах якраз найменш гномаў. Яны ўпадабалі сабе вёску. Тую вёску, якая забяспечвае ўсю краіну хлебам, малаком, мясам.

Усе ведаем, у Чэхаславакіі зямля дзяржаўная і кааператыўная. Няма тут аднаасобнікаў. У вёсках не відаць курэй, гусей, свіней і качак. Усім гэтым неабходным забяспечваюць насельніцтва вялікія гадаўляныя фермы. І ніколі не здарылася, каб нават у такім гарадку, як Кадань, не хапала чагосьці.

Ці гэта ўсё такое дзіўнае, што я тут сказаў? Па-мойму, не. Усюды людзі павінны так працаваць і гаспадараваць, каб усё мець. Дзіўнае тое, што ніхто з нас ніколі не бачыў тут людзей на палях. Калі яны сеюць — невядома (а засеяна), калі яны жнуць — невядома (а ўсюды выжата), калі яны аруць — таксама невядома (а ўсюды заарана). Людзі абрабляючыя зямлю, відаць толькі ў суботу і нядзелю, калі яны корпаюцца ў сваіх гародчыках. Усю рэшту зямлі абрабляюць гномы. Збегліся яны сюды, мабыць з усяе Еўропы. А вось да нас чамусьці не горнуцца. Мусіць баяцца нас.

Будзьце здаровыя!

1981 г.

## ЛЯЧЭБНАЯ ВАДА

Пайшоў я да лекара са скаргай: ломіць у касцях, выпірае гузы на нагах, рэбрах і галаве. Той выслухаў, абмацаў і прапанаваў Калабжэг.

Паехаў я ў гэты Калбжэг па здароўе. Набраў адзежы, абутку і іншых, курортных прычындалаў. Нават купіў парачку процізачаткавых сродкаў (а вось нешта трапіцца). Прыехаў вясёлы, атрымаў ложак у чатырохасабовым пакоі. Мае сужыхары аказаліся ветэранамі, зайздросцілі мне выгляду (О, пан дык яшчэ можа, не тое, што мы).

Мяне нават крыху дапякла іхняя зайздрасць, але я падумаў: буду дэманстраваць іхнюю рацыю, хай лічыць, што я яшчэ сапраўдны мужчына.

Развесіў я вопратку, пабрыўся з дарогі, памыўся і пабег на мора. Хоць і восень, а ўсё ж на пляжы цьма народу. Ходзяць групамі, парамі і ў адзіночку. Гавораць гучна, смяюцца і шэпчуцца, крадком мнучы сабе рукі і з прагнасцю спазіраючы ў вочы. Божа, які тут шчаслівы народ! А якія ўсе добрыя!

На другі дзень санаторны лекар прыпісаў мне лячэбны працэдур. І пачаў я хадзіць па санаторных пунктах. Тут мелі мяне купаць, там масаваць, трасці электронамі, біць бічамі.Усюды сустракаў жанчыны і ўсе ахвотна дзяліліся са мной сваімі заўвагамі наконт санаторнага лячэння. Адны гаварылі, што працэдуры працэдурамі, а нельга выракацца вячэрніх гульняў. Іншыя раілі, што чалавек, які вырваўся з дому, павінен жыць спакойна, падпарадкавацца ўказанням санаторнага лекара: абавязкова лягаць спаць у дзесяць вечара, а ўставаць у шэсць раніцы. Трэція, паводле мяне найбольш лагічна, даказалі, што чалавек павінен рабіць тое, што ў даны момант яму хочацца. І не забываць аб крынічнай вадзе. Яна ключом б'е далёка на пляжы.

Вось я гэтых трэціх і паслухаў. Апрача ўсіх працэдур, тры разы ў дзень хадзіў да крыніцы. Турнусы прыяжджалі і ад'язджалі, а я не разбіраўся, хто і што, заўсёды імкнуўся да поспеху. Спачатку прапанаваў сродкі, якія прывёз з сабою, але першая пятая, дзесятая толькі вочы слупам ставіла (здзіўляючыся маёй адсталасці). Урэшце скончыў я з прапановамі, забыў нават аб сродках, ажыццяўляў праграму згодна з планам лячэння. І ніколі не забыў напіцца крынічнай вады.

Трохтыднёвая курацыя зрабіла сваё. Ногі ледзь цягаў, але затое жывата і следу не засталося. Ну, думаю усё выйшла так, што лепш не прыдумаеш. Шкада толькі, што так хутка ўсё праляцела. Сёння выязджаю. Пасля абеду пайду да крынічкі і ў апошні раз нап'юся цудоўнай вады.

Хлябчу яе, стоячы на каленях, і сапу (бо прагнасць падказвае напіцца ў запас), а людзі рагочуць нада мною. Паднімаю вочы на іх, бачу, стаіць знаёмая прадаўшчыца спажывецкай крамы, мясцовая. Пры ёй фатограф, які ходзіць па пляжы і шукае аматараў для здымкаў, таксама тутэйшы. Ведалі мяне. Устаю і крыху саромеюся за прагнасць. Яны пытаюць:

Смачная вада?

— О, так, — адказваю, — саланаватая, пахне аміякам, ды яшчэ чымсьці, адным словам, адно здароўе!

— Напэўна, — гаворыць жанчына пад рогат фатографа, — гэта ж вада з гарадскога калектара.

Развітаўся я хуценька і, рады, што больш іх не стрэну, пабег пакаваць чамаданы.

У цягніку абмяркоўваю, што скажу жонцы, калі здзівіцца, чаму так пахудзеў.

Прыехаў дамоў раніцай, жонка на рабоце. Выкупаўся я, наеўся і лёг спаць (трэба ж годна прывітаць выпашчаную жанчыну). Прыйшла

тэрмінова. Я ўцешыўся, абнімаю яе, хвалю, што пахарашэла, а яна скептычна:

— Ці ты не замнога схуд? Мусіць жанчыны цябе голадам марылі?

— А каб ты ведала, кормяць там дрэнна і вада ўсё выцягвае.

— Заўтра пойдзем да дэрматолага.

— Што ты, чаго мне да яго?

— Я ведаю чаго.

Што рабіць, пайшоў. Дэрматалогам аказалася жанчына ды прыгожая. Паглядзела на мяне, падатыкалася і сказала:

— Нешта тут неясна. Вось адрас і яшчэ сёння ў васемнаццаць нуль-нуль абавязкова пакажыцеся.

"Што будзе?" — прадрыжэў я ўвесь дзень і ў вызначаную гадзіну з'явіўся. Давялося прайсці і праз доўгае даследванне, але было ўсё добра.

Толькі кватаранты здзіўляліся, што такі малады, а лягае спаць у дзесяць нуль-нуль, як яны.

І ўсё гэта дзякуй лячэбнай вадзе.

1981 г.

## ФАРАОНКА

Нарадзілася ў сметніку, дзе няма ніякага толку, маленькая мурашка. Абсохла, падужала, ды палезла па пакоі шукаць сяброўак і ежы.

Прайшло пару дзён, і наша малютка ўскарабкалася на стол. Ужо ведае, чаго шукае. Шукае, каб добра наесціся, а мне ежу згідзіць.

Падпёр я кулаком бараду, сяджу, прыглядаюся і разважаю: "Што такая малютка можа каму зрабіць? Яна толькі поўзае, шукае корму. Забіць — шкада, негуманна. Давай, прыкрыю яе цёплай накрыўкай ад гаршка.

Прыкрыў і забыў пра яе, пайшоўшы ў горад. Вярнуўшыся, успомніў, заглянуў пад накрыўку (ці не задушылася?). Што ўбачыў? Мурашка вырасла велічынёй у муху. Здзівіўся, але працягваў эксперымент. Нешкоднае ж насякомае.

Мурашка вырасла ў велічыню мышы і стала непадобнай да свайго роду. Цяпер я спужаўся: вырасце гэтае насякомае ў сабаку? Але чакаў, што з гэтага будзе: пакусае мяне ці не пакусае?

А мурашка расла і ўсё часцей зубы на мяне вышчарала. Я ўжо добра злякаўся, але нішчыць яе не хацеў, чакаў пагаднення (ты мяне не чапай і я не крану цябе). Што будзе, то будзе, зачыніў мурашку ў шафе.

Відаць, умовы там спрыялі мурашцы, вырасла, патаўсцела, развaліла шафу, выйшла на пакой, трахнула мяне па мордзе і давай наладжваць свае парадкі. Патрапала посуд, вышчарбіла сцены, урэшце села з другога боку стала і спытала, дзе хачу вісець: на дрэве ці на стаўбе? Я пык-мык; вісець нідзе не хачу, хачу жыць. А мурашка-звер кажа: — Калі хочаш жыць, то яшчэ крыху пожывеш, але мусіш мне ва ўсім падпарадкавацца.

— О, гэтага не будзе!

— Пабачым, — сказала мурашка-звер і пачала верашчаць, што я душу яе. Збегліся іншыя мурашкі і пачалі на мяне наступаць ды прыгаварваць: "Хопіць твайго панавання. Цяпер мы зробім з табой, што захочам!?

Раскрычаліся, развершчаліся і ўзяліся за справу.

І сяджу я цяпер на паламаным столку, кулаком падпіраю бараду і з горыччу дакараю сябе, што пашкадаваў фараонку.

1981 г.

## ПІРАЖКІ З МЯСАМ

Прыходзіць жонка дамоў і ад парога крычыць: — Есці!

— А чаго ж ты хацела б пад'есці, даражэнькая, каб насыціць жывоцік і даць задавальненне паднябенню?

Я гэта сказаў, бы тая ліса, што хацела варону ашукаць і сыр з'есці, значыць, з мілаю ўсмешкаю на вуснах і са злосцю ў сэрцы: маўляў, ведала, што нічога дома няма акрамя хлеба штодзённага (дай Божа, каб хоць не выйшаў) і вадзянога малака, якога нельга піць не пераваранымі: яно на малакападобнай вадзе, у якой купаюцца качкі. Ведае, а крычыць "есці", бо думае, што калі яна сядзела восем гадзін на працы, то ў мяне здарылася нейкае цуда. Яна думае, што заўсёды людзі будуць несці шынкі ды каўбаскі, яйкі ды слоікі за выйграную справу ў судзе, за вадзіцельскія правы, за школу, лекара білет на ПКС і гэтак далей. Не, даражэнькая, думаю, калісьці так было, але на нашу бяду скончылася. Людзі прыходзяць з просьбай аб дапамозе ў розных справах, але ў замен прыносяць толькі абяцанкі. Вядома, абяцанкамі яшчэ ніхто не наеўся. Трэба мяса, а гэтага мужыкі шкадуюць, бо і скуп добра плаціць. Паабяцаюць цялянціны, справу дурань залатвіць, бо хоча жонцы дагадзіць, а ім сваю важнасць паказаць. Дастане дулю пад нос, аж закарэчыцца і зноў сядзіць ціха, пакуль нехта не прыедзе з новай абяцанкай. Так дні і бягуць, а тая: "есці".

Ну, дык вось гавару: — Што табе, каханая, даць на абед? А жонка: — Добры муж заўсёды падбаў бы, каб мець чым жонку пакарміць, а ты толькі пра "Ніву" думаеш, якая цябе патрабуе так як і я.

У мяне міна перамянілася з вясёлай у дурную ад таго ўдару, бо толькі цяпер даведаўся, як яна мяне "патрабуе". Мужчынскі гонар балюча закранула, але вось іменна мужчынскі гонар прымусіў мяне даказаць жонцы, што памыляецца ў маёй абыякавасці да яе. Змоўк я, апрануўся і пайшоў у магазін шукаць смачнае ежы на спознены абед. Бачу, у вялікай скрыні паміж марожанай гароднінай ляжаць нейкія піражкі ў фальёвых торбачках. Бяру ў рукі і чытаю: "Пірагі з мясам". Уцешыўся, нібы на сто каней сеў, прынёс дамоў аж дзве пачкі і гляджу на спосаб прыстаўлення, а там напісана: "Піражкі кідаць у кіпень так, каб не спыняць кіпення". Думаю: "Гэта ж прасцей простага". Укінуў у гаршчок пірагі, зварыў, вылажыў на талеркі, паліў не шкадуючы скваркамі і цыбуляй і з хітрай усмешкай да жонкі: — Калі ласка, дарагая, да стала.

Жонка глянула на мяне прыгожа і з мілай, ледзь прыкметнай усмешкай удзячнасці (а хто ведае, ці не сімпатыі). Узяла вілку ў правую ручку і націснула на найбольшы піражок (яна заўсёды з'ядае насамперш тое, што найсмачнейшае).

З піражка прыснуў трускалкавы сок і абліў яе белую блузку.

1981 г.

## ГАНДЛЯРКА

Нехта ласы на малако склаў песню: Добранька таму жывецца, Хто з малочніцай жыве. Малачко ён папівае І малочніцу кахае.

Гэта быў чалавек абмежаваны. Такі толькі і глядзіць, каб у свой тлусты трыбух, бы ў бочку, наліць малака.

О, я дык ажаніўся! Узяў кабетку з гандлёвай галавой. Яна брат ты мой, што не ступіць, то грошы.

Аднойчы прыперла дамоў зазяпаўшыся, нібы сто сабак яе гнала. І адразу на ложак. Перапужаўся я, хутчэй на кухню па ваду. Прыношу, а жонка ляжыць бы каралева, ды спаглядае на мяне, бы на Івана Дурачка. Я аж скурчыўся ад яе пагардлівага позірку.

Каб дагадзіць маёй галубцы, я пачаў на цыпачках увівацца па хаце: ганіў работу. А галубка дастойна, бы сіямская кошка, пазяхнула і працадзіла праз зубы:

— Не ўвівайся, Васілёк, бо і так усе ведаюць, што ты чучала.

— Толькі не чучала! — праз слёзы сказаў я. — Я ж табе ўсё раблю: замятаю, мыю, вару...

— А што ты хацеў, каб чучала рабіла? Пад ручку са мною хадзіць?

— Пад ручку — не пад ручку, але хадзіць разам можам, бо, як яно б не было, з'яўляюся тваім мужам.

— Ха, ха, ха! Людзі, ратуйце — муж! Засмяялася жонка з такім сарказмам, што мароз мяне прашыў і я крыкнуў:

— Змоўкні бо, бо...

Не ведаў, чым яе настрашыць. Ведаў, што жанчына шукае прычыны, каб выгнаць мяне з хаты. Так заўсёды рабіла, калі я пачынаў бараніцца. А якая муха яе сёння ўкусіла? Гэта ведаць я хацеў. Бо гэта давала магчымасць на дыялаг. Гавару:

— Вось Верка таксама прыгожая жанчына, але з мужам жыве прыстойна...

— Па-першае, — крыкнула жонка, — Верка з'яўляецца хатняй курачкай, за ёю мужчыны не аглядаюцца. Па-другое, у яе мужчына, а не баран. Па-трэцяе, калі яна такая прыгожая, то ідзі да яе, мо прыме!

— Навошта мне ісці да яе, калі ў мяне свая хата, а ў ёй свая жонка...

— Хата не твая, я яе выкупіла. І жонка не твая! Такіх, як ты, я нагою з ложка скідала!

— Скідала, скідала, а чаму за мяне барана, выйшла?

— От, бо конь пасля аўса салому есць. А па-другое, зрабіла на злосць аднаму...

І з сумам заспявала:

*Куда бежишь, тропинка милая,*
*Куда зовешь, куда ведешь?*
*Кого ждала, кого любила я,*
*Уж не догонишь, не вернешь.*

А мне, бы ў морду хляснула. Што рабіць? Як абласкаць? Здзіўлю яе:

— Ведаеш, дарагая, я сёння сто дзевяноста мінут стаяў у чарзе. Але затое дастаў чатырыста грамаў каўбасы.

— А чаму не купіў на ўсю картачку?

— Больш не было.

— А перад табой людзі бралі?

— Бралі.

— Ну так, усім было, толькі яму не хапіла. Ведаеш, як гэта называецца? Пашлі дурнога а за ім другога.

— Чорт цябе ведае, чаго ты сёння ўскіпела?

— Сам асудзі. Ты стаяў пяць гадзін (зласліва дабавіла) і купіў кавалачак каўбасы, а я выбегла на паўгадзінкі і ў мяне тры пярсцёнкі. І ўсё высокай пробы!

І пачала ад пачатку: як яна мяне корміць і апранае. А я маўчу і думаю; "Ты, ведзьма, каб гэта тваё золата пераўтварылася ў жалеза". Урэшце, каб прыдабрыцца пытаю:

— А колькі ж ты, даражэнькая, за іх заплаціла?

— Колькі? Колькі хацела!

— А ўсё-такі?

— Дванаццаць тысяч. А за адзін пярсцёнак вазьму пятнаццаць, дурню!..

Назаўтра прыходжу дамоў, бачу, жонка з падпухлымі вачыма.

— Што здарылася?

— Гэта ўсё праз цябе!

— Што здарылася?

— Купіла золата, бо хацела абнавіць кватэру. А выявілася, купіла звычайны метал.

— Як гэта звычайны, хто сказаў?

— Ювелір.

Цяпер я не ведаю, хто сапраўды вінаваты. Бо навошта мне было праклінаць жонку, калі яна пагандлявала.

1981 г.

## АНАЛОГІЯ

Прабачце мне, грэшнаму, за чужыя словы. Я іх не ведаю, як і многія з вас, але ж "аналогія", і "дэрматалогія", "псіхалогія", "лапаталогія" ды іншыя логіі і бязлогіі страшэнна ўзвышаюць ранг пішучага. Ну, дык чаму і я не магу заваяваць у людзей пашану вучонага?

Магу — не магу, але хачу. Вось таму і пішу аналогію.

Гэта было даўно, яшчэ да ІІ сусветнай вайны. Малы хлопчык пільнаваў яшчэ меншых дзяцей. Аднойчы гэтыя дзеці, змораныя летняй спёкай і плачам (з голаду), падвечар заснулі. Заснуў і апякун каля іх. Сон яго быў баязлівы ("каб не злавілі"). Калі ён сарваўся са сну, бачыць, сонца ўзыходзіць. Валасы на галаве дыба сталі: што бацькі нанач не вярнуліся з поля (мо іх дзе ваўкі з'елі?), што свінням не даў, што цялятка галоднае. Божа, што рабіць?! Заплакаў хлопчык са злосці на сябе. Дзеці няхай спяць, а я насамперш курэй з сяней выганю, падумаў, нарву зеля цялятку, разраблю свінням баўтухі.

Выганяе з сеняў квактуху, а тая слухацца не хоча, галубіць пад крыламі сваіх жоўценькіх дзетак. Тады ён яе за крылы і за парог. А

тая назад у сені прэцца. Хлопца такая злосць узяла, што гатоў забіць упартую квактуху.

У гэты час на панадворак укаціўся воз, якім Карузелік прывёз з поля бацькоў. Хлопчык уцешыўся, убачыўшы свайго любімца Карузеліка. Але ніяк не мог зразумець, чаму бацькі ў полі начавалі.

Убачыўшы вазню сына з курыцай, бацька крыкнуў:

— Нашто курку выганяеш з сыены, то ж вэчур?

— Я іе нэ выганяю, оно заганяю, мігом схлусіў вісус, бо здагадаўся, што заснуў. Дастаўшы аблупцоўку, як кожны дзень, упэўніўся, што не памыляецца. І ўсё стала нармальна.

1968 год. Беласток. Былы хлапчук стаў мужчынам і атрымаў тэлеграму: "Сустракай прыедзем 15 чэрвеня раніцай. Іван"

У вызначаны дзень былы хлапчук (цяпер мужчына) паехаў на станцыю сустракаць гасцей. Выйшлі яны (муж з жонкай) з цягніка "падкошаныя" і замест гарачага прывітання горача мацюкаюць цягнік: сабатаж, спазніўся на цэлыя суткі!

— Не, Ваня, сёння цягнік прыехаў згодна з раскладам.

— Ну, што ты, дурня з мяне строіш. Цягнік спазніўся. І куды больш, чым на суткі!

— Што з табою, Ваня? (А ён, Ваня з жонкай пад "мухай").

— Як гэта што? Меў прыехаць учора раніцай, а прыехаў сёння вечарам!

Чалавек бачыць, цяжка будзе з госцьмі дамовіцца прапануе:

— Сядайце ў машыну, паедзем дадому, а то я спазнюся на работу.

— А ты што, сёння працуеш на другую змену?

— Не на першую.

— Дык як у вас працуюць? Ідзеш да працы нанач, а гаворыш, што на першую змену.

— Пабудзеш — пабачыш.

Завёз гасцей дадому, даў па чарцы спірту і паехаў да працы. Вечарам вярнулася з працы мая жонка (бо гэта было ў мяне), вярнуўся і я, а госці зразумець не могуць: вечарам прыехалі і цяпер зноў вечар?! Мы з жонкай хахочам, а яны пакрыўдзіліся.

Чэрвень, 1981 г. Чэхаславакія, Нашы будуюць электрастанцыю. Гадзіна $20^{00}$. Праз будаўнічую плошчу ідзе чалавек у касцы, які павінен сцерагчы галоўны ўезд. Глядзіць на свой гадзіннік і звяртаецца да мяне:

— Пане, колькі гадзін, бо хіба мой гадзіннік стаіць?

— Восем трыццаць, — адказваю.

А той раптам пачынае мацюкацца.

— Што здарылася? — цяпер я пытаю.

— Не, нічога, гэта наша ўнутраная справа, — адказвае.

— Унутраная, дык унутраная, — кажу, — але мо трэба вам у нечым дапамагчы? Вы так нервуецеся...

— Як тут спакойным быць, восем трыццаць, а змены няма. Павінна быць а сёмай! Што сталася, к... маць?

— А што вы змяняецеся вечарам? — пацікавіўся я, ведаючы, што змяняюцца раніцай.

— А што цяпер вечар? — пачырванеў член Службы аховы маёмасці.

— Ага! — засмяяўся я, здагадаўшыся, у чым справа. — Вечар, але наступнага дня — вы былі ў летаргіі.

— Што вы гаворыце, што здарылася?

— І здарылася тое, што ўсе выехалі на радзіму, а вас не маглі дабудзіцца.

Чалавек зразумеў, што жартую. З аблягчэннем вылаяўся ды пайшоў і ўключыў асвятленне дарожнага шлагбаума.

Вось вам і аналогія. Толькі цяпер за гэта не б'юць, а грошы плацяць. Малы заснуў змучаны і галодны, а Ваня ў Беластоку і рабочы ў Чэхіі напіўшыся страцілі пачуццё часу. 1981 г.

## ПАШАНТАЖЫРУЮ...

Пашантажырую, можа ўдасца схіліць галоўнага рэдактара не выкідаць з маіх тэкстаў тое, што я лічу за найважнейшае.

Вярнуўся я дадому (ужо назусім) вельмі змучаны (гарачыня) і непабрыты. З Кадані выехаў раніцай 31 мая, а ў Беласток дабраўся на другі дзень у $13^{00}$. Яшчэ добра, што дабраўся, а то рэдакцыя магла б страціць такога карэспандэнта!

Выслухаўшы лаянку роднай жонкі на тэму бон-тону (маўляў, джэнтльмен не павінен з'яўляцца без папярэджання), я так каяўся, што забыў прадставіцца мужчыне, якога застаў з жонкай за чашкай кофе. Відаць, вялікі жончын прыяцель. Каб ім не быў, не цікавіўся б, як яна, бедная, жыве адзінокай. Хлопец свой, па паводзінах відна, знаёмы з жонкай ужо месяцаў пару. Сядзеў у маёй піжаме. Нічога туту дзіўнага, гарачыня на двары. Але мяне, відаць, ён не ведае, бо пачырванеў і пачаў апранацца ў сваё, якое вісела ў шафе. Відаць, чалавек ашчадны. Лепш жа сядзець у знаёмай у чужой піжаме, чым у сваім касцюме.

Пакуль жонка мяне лаяла, ён паспеў, апрануцца. Сказаў:

— Ну, то я пайду, бо і так меў выходзіць.

Здалёк падаў мне руку. Я назваў сваё імя і гавару:

— Астаньцеся, я прывёз "Бычыну кроў" — вельмі карыснае мужчынам віно, разап'ём.

А ён адказаў, што мяшаць гарэлку з віном шкодна здароўя.

— То хоць кофе дапіце, засталося ж звыш паўшклянкі.

— Не, — бы на вуглях спаяўшым, адказаў жончын знаёмец, — кава надта гарачая.

— Ну ваша справа, — згадзіўся я.

Жонка, як кожная добрая гаспадыня, хуценька папратала са стала кілішкі і талеркі, на якіх я прыкмеціў рэшткі венгерскага саламі, якое я передаў жонцы, каб не галадавала ў час ваеннага становішча.

Я прыняўся за купанне, а мая найдаражэйшая за распакоўку маёй сумкі. Выкупаўшыся і апрануўшыся ў чысценькае, я зарыўся ў "Ніву" (мая родная сабрала ўсе нумары). Прачытаў творы найцікавейшых аўтараў, вядома, пачынаючы ад сябе. Знайшоў нават пахвалу Дзядзькі Кваса. Вельмі здзівіўся, што ён зразумеў маю "Фараону". Хіба толькі Дзядзька Квас можа пранікнуць у маю думку. Вось тут і пачынаецца мой шантаж. Калі будзе з'езд карэспандэнтаў, я ўсё раскажу аб дыскрымінаваць мяне на старонках "Нівы". Напрыклад, у "Фараонцы" я выказаўся ясна, хто з кім і супроць каго ваюе, а Вы, Галоўны, гэта выкінулі. У "Эўрыцы" я сказаў, што можа дастану доктара ганорыс каўза, як Вайда за "Чалавека з жалеза", а вы зноў выкінулі. У "Выбраным" я канкрэтна сказаў, хто ўвайшоў у залу бразільскага парламента і ўзяў на сваю шыю гальштук, які быў прызначаны мне. Гэта быў Э. Герак. Вы яго выкінулі. Сон ёсць сон і, як з песні нельга выкідаць слоў, так са сну сітуацыі, якая прыснілася. Думаю, павінен у гэтым выказацца "Астрон".

Вось паважаны Галоўны, калі не паправіцеся, я Вас скрытыкую на сходзе.

1982 г.

## БЯДА І ГОДЗЕ

У Польшчы кожны другі мае вышэйшую адукацыю. Тая другая палова насельніцтва, якая мусіць падпарадкавацца адукаваным, проста мучыцца. Мучыцца таму, што не навучылася розных таямніц патрэбных у жыцці. Калісьці, як я быў малы, асноўнай вагой у вёсцы быў бязмен. Я так урос у бязмен, што забыў аб іншых вагах, якія цяпер абавязваюць у таргоўлі. Зусім нядаўна, заехаў да Махнатага, каб купіць танных яек. Яны тады былі па 50 зл. за кілаграм у скупцы.

Але я захацеў свежанькіх, свежанькіх. Зайшоў да адной жанчыны і папрасіў: — Цётка, у вас свежыя яйкі?

— А ў мяне толькі свежыя, — адказала, — больш чым месяц не маюць.

— А месяц гэта мала для яйка?

— А многа? Кітайцы ядуць стогадовыя і аж аблізваюцца, а вам месячныя старыя.

— Ну, добра, цёцю, калі можаце, то прадайце, няхай мяне жонка пахваліць.

— А пахваліць, пахваліць! Калі я табе дагаджу, то і жонка пахваліць...

Далей я не дачуў, што яна сабе пад носам сказала, але здагадаўся пасля. Яна проста дадала, што... аж табе адхочацца".

Пайшла да каморы, прынесла шаснаццаць яек, ды пры мне скрупулёзна пералічыла, каб чаго не падумаў. Рогі хустачкі завязала, павесіла на бязмен і сказала:

— Глядзі, паўтара кілаграма, як адрэзаў.

— Ага, — гавару, — і колькі ж за іх возьмеце з мяне?

— Як з цябе, дзевяноста злотых, бо то яйкі і вялікія і свежыя. На скупцы далі б па 50 зл. Але калі ўжо ты прычапіўся, то бяры па 60 (шэсцьдзесят).

Даў я жанчыне сто злотых і гавару: — Я здачы не хачу, дайце мне за дзесяць зл. пэстак. Жанчына насыпала мне шклянку пэстак і я задаволёны паімчаўся дамоў.

У разгары таргоўлі, або з уражання, што нейкі пан прыехаў, жанчына "забылася", што яе бязмен важыць Фунты, а не кілаграмы. І "пана" жонка яшчэ па сённяшні дзень разявай называе.

Ой, забалакаўся аб Махнатым і забыўся чаго хачу, а хачу вось чаго: восьмага ліпеня адарваў лісток з календара і ўбачыў рацэпт на пірог з ягадамі:

"На цеста: 40 даг мукі, 15 даг масла, 15 даг масла расліннага" і гэтак далей. Калі жонка прыйшла з працы, я спытаў, ці ў яе працы не змяніліся вагі, ці ўсё яшчэ грамы, дэкаграмы, кілаграмы?

— Што, зноў сонечнага ўдару дастаў? — спалохалася жонка.

— Не, нічога такога. Я проста хачу пераканацца, колькі грамаў змяшчае адзін даг.

— Які яшчэ даг?! — ужо злосна крыкнула мая.

— А я ведаю які? Тут, у календары за 1982 год так падаюць у рэцэпце.

— Добра было б, каб падалі колькі важыць адзін даг, я б такі пірог пякла. А як спячы, калі ад жыцця адсталі, бяда і годзе.

## АДВУЧЫЛІ

З вялізарнай прыемнасцю і зацікаўленнем чытаў я адгалоскі Дзеда Кастуся, прысвечаныя паэзіі "белавежцаў", якія былі надрукаваны в 29 нумары "Нівы", што выйшла ў свет 21 ліпеня 1985 года.

Дзед Кастусь на пачатку скардзіцца, што замалая адукацыя ягоная не дазваляе яму напісаць рэцэнзію на творчасць "белавежцаў", але на мой погляд: талент і ўменне глядзець на справу перавышае недахоп адукацыі Дзеда Кастуся. Хвала яму за гэта, але я сёння не аб таленавітасці Дзеда Кастуся хачу пісаць. Ён у сваім выказванні проста паддаў мне думку, каб падзяліцца з чытачамі сваім горам, якое на маю бяду прынесла цывілізацыя ў выглядзе электронікі, дэцыбелаў і іншага дзікага візгу. Ды яшчэ нідзе нельга напісаць, бо цябе зробяць дурным-дурненькім дурнем, бо цяперашняя музыка гэта ж музыка высокародных, моцных і з шырокім кругаглядам людзей, ды і канонам з'ўляецца. Я аднойчы не вытрымаў і пазваніў у рэдакцыю Польскага радыё ў Беластоку ды паскардзіўся, што не магу ўжо слухаць гэтых пастаянных візгаў, якія аж у мазгі колюць, а хацелася б радыё паслухаць, бо мо нешта цікавага дзеецца ў нашым рэгіёне. І, па-другое, ці нельга было б даць крыху і іншай музыкі акрамя англійскіх верашчанняў?

У радыё мне адказалі, што гэткая музыка з'яўляецца канонам нашай радыёвяшчальнай станцыі. Гэта ж абсурд, бо беластоцкае радыё слухае і крыху палякаў, і крыху беларусаў, а не толькі англічане. Прытым гэта радыё слухаюць не толькі адны снобы. Аднак, як паказвае сітуацыя, для рэдакцыі даражэйшы адзін сноб, чым група сталых, парадачных людзей, якія хацелі б паслухаць часам танга, вальс, народную песню, хаця б папалам з візгамі наркаманаў.

Дзед Кастусь, ды і не толькі ён, бо многа старэйшых людзей, памятае, што ў пяцідзесятыя гады маскоўскае радыё перадавала канцэрты па просьбе польскіх радыёслухачоў у 15 гадзін кожнае нядзелі. А я быў такім іх прыхільнікам, што мяне нідзе і нішто не магло ўтрымаць, каб не пабегчы дадому і не паслухаць. Я тады жыў у Варшаве. Калі меў свабодную нядзелю і з сям'ёй паехаў на Віслу, то ўсё роўна перад канцэртам пёр дамоў і цягнуў за сабою сям'ю. Спярша жонка-полька не магла мяне зразумець, а пасля і сама хацела слухаць, бо пачула смак гэтых мелодый. І я любіў слухаць кожную музыку, аж пакуль у Беластоку не сустрэўся са Станам Барысам. Сатана падкусіла мяне пайсці на гэты канцэрт. Атрымаў я месца ў першым радзе пасярэдзіне, як нейкі прынц. Перад выступленнем

Стана Барыса адбываўся конкурс на правы дарожнага руху і мяне выбралі старшынёй журы. Кончыўся конкурс, я раздаў узнагароды і зноў заняў сваё "ганаровае" месца, чакаючы на канцэрт. Бачу, уводзяць грамадныя калоны, абставілі імі ўсю сцэну і абматалі правадамі, а пасля ўвайшоў на сцэну артыст з групай акампаніятараў. Божа, як пачалі біць у бубны, як пачалі, верашчаць на ўсе магчымыя і немагчымыя галасы, то Стана Барыса гледачы толькі бачылі, а не чулі. У мяне сэрца перлася чагосьці пад горла, лёгкія дрыжэлі, язык вылазіў на бараду, а зубы чахалі. Хацеў усё кінуць і пайсці, але ж не гонар — людзі скажуць, што некультурны. Апух я, але дасядзеў да канца, абяцаючы сабе, што больш ніхто мяне не загоніць на падобны спектакль. І не пайшоў, ды і радыё выключаў. Але ж глядзі, аднаго разу, не так даўно прыехаў ў Беласток калектыў песні і танца з беларускага калгаса "Прагрэс". Гэты калектыў спяваў цудоўна, але прыбывалі яму беластоцкія музыканты з магнітафоннай стужкі. Гледачы, адным словам, публіка, паўпіхалі пальцы ў вушы і нейк да перапынку вытрымалі.

Ад таго часу я "пераношу" ўсяго толькі дзве песні: беларускую "Ой рэчанька, рэчанька" і ўкраінскую "Нэсэ Галя воду" і то толькі ў сваім выкананні. Вось, як мяне сучасная музыка адвучыла ад культуры. А паспрабуйце напішыце!

1981 г.

## ЧАЛАВЕК — КОТ

Чалавек, калі хоча спаць, можа заснуць усюды. Я чуў, што людзі спалі ў буславым гняздзе, прывязаўшыся на дрэве, на калодзежы, на дарозе усюды. Я сам спаў, круцячы жорны ў Югана, араўшы, баранаваўшы, калышучы дзіця, на кані, на марозе, пад снегам, у маршы і чорт ведае дзе яшчэ. А вось здзівіўся калі пачуў тое, аб чым зараз раскажу.

Група рабочых усю ноч піла і гуляла. А калі іх з рэстарана неяк выдварылі, хлопцы прыйшлі ў гасцініцу. Не былі ў сілах пабрыцца, ані памыцца. Але абавязкі ведалі. Выпілі запасы і ў святочных касцюмах, трымаючыся пад рукі, пайшлі да аўтобуса. Вострае паветра ўліло ў іх асвяжаючую сілу. На працу прыехалі ў час. Хістаючыся і гікаючы, пераапрануліся ў рабочую вопратку і гайда на свой участак. Трое (прыземныя людзі) знайшлі сабе куточкі сярод масы труб, бетонных, элементаў і мяшкоў шклянае ваты і, як людзі чыстага сумлення хуценька заснулі. А той чорт, чацверты, прысвоіўшы нешта з ката, нешта з лятучае мышкі, закарабкаўся на вышыню 51 метраў і з

фантазіяй выцягнуўся на бэльцы, шырынёй у 15 сантыметраў. Рукі і ногі віселі па баках, а ён на хрыбце ляжаў і хроп.

Хадзілі туды, розныя фахоўцы, брыгадзіры, кіраўнікі, але ніхто не ведаў, як яго сцягнуць. Урэшце з'явіўся нехта з галоўнай дырэкцыі і параіў, каб захаваць максімальную цішыню бо можа перапалохацца, упасці і нарабіць усім клопатаў. Так і зрабілі.

У 14 нуль-нуль тры дысцыплінавыя сябры, як на званок, абудзіліся, вылезлі са сваіх нор, распрадавалі ногі і рукі, закурылі ды гавораць: "Як яго разбудзіць бо час на абед".

— Як? — гаворыць надыйшоўшы з суседняга ўчастка сябра, — а вось як. Свіснуў на пальцах, і "лятучая мыш, ці кот" як па камандзе, сеў і спытаў: "Ужо?" Злез з бэлькі і ўсе героі пайшлі з'есці дарэмны, заслужаны абед. Пасля пераапрануліся і дарэмным аўтобусам паехалі на піва.

Бачыце, што значыць трэніроўка?! І вып'юць колькі трэба і з бэлькі не спадуць і на абед у час прачнуцца. І самае цікавае, ніхто не ведае прозвішчаў герояў, мо яшчэ атрымалі б узнагароды за храбрасць.

1982 г.

## ВЫБРАНАЕ

У апошнія гады сняцца мне нейкія дзіўныя сны. Калі яны збудуцца, не адзін з вас будзе стаяць перада мною навыцяжку, а ворагі, убачыўшы мяне здалёк будуць шапкі здымаць ды нізка кланяцца.

Вось толькі выбраныя падзеі, якія мне давялося перажыць у сне.

### I

Глухая вёска. Жыву ў маленькай хатцы. Корпаюся на кволенькай гаспадарцы, каб здабыць кавалак хлеба; мне дабро не цячэ, як тым, што ў высокіх крэслах, а толькі капае, і то ледзь-ледзь. Ажно, бачу, заязджае на панадворак брычка. Выходзіць з яе мужчына ў чорным фраку, за ім — стангрэт. Ідуць у мае нізенькія парогі.

Увайшоўшы ў маю хатку, пакорна пакланіліся. А па вачах відаць, злыя што перад мужыком хрыбты свае гнуць. Аддаўшы пашану, пачалі ўслужліва гаварыць на нейкай чужой мове, якую бадай, не ведае нават сам Васіль Сапёлка. І паказваюць жэстамі, каб я прыбраўся, памыўся і прыгожа адзеўся. Я адказваю, што не буду ні брыцца, ні мыцца і нікуды не паеду, бо суседу трэба парсюка закалоць. Але яны, відаць, атрымалі загад: "даставіць жывога", не слухаюць нават

майго тлумачэння. Узялі мяне на рукі, нібы караля, занеслі ў брычку і па конях.

Завезлі мяне ў Бразілію. Божа думаю, я яшчэ не быў далей Дубічаў Царкоўных, а тут раптам Бразілія. Але нікога тут мае думкі не цікавяць. Самі абрылі мяне, памылі (хоць і брыкаў) занеслі ў вялікую залу, у якой сядзела ўся бразільская арыстакратыя, бюракратыя, тэхнакратыя і яшчэ нейкая плутакратыя.

Устае з чырвонага глыбокага крэсла пузач і звяртаецца да мяне на грабавецкай мове, што Бразілія жадае, каб я стаў яе прэзідэнтам. Гавару ім: "Як можа быць прэзідэнтам чалавек які па-бразільску нават не кумекае?".

— А начорта вам ведаць нашу мову, калі ў вас будзе цьма дарадчыкаў і перакладчыкаў. — Гаворыць пузач і накладае на мяне белую, бы крэйда з Мельніка, кашулю і чорны касцюм.

Я прачнуўся мокры.

2

Прыйшлі да мяне два міліцыянеры і гавораць, каб я па-святочнаму апрануўся і ехаў з імі ў Варшаву.

— У Варшаву? — здзіўляюся. — А чаго я там не бачыў!

— Я б на вашым месцы на крылах ляцеў, — адазваўся старшы чынам.

— То ляціце, — кажу, — а мне дайце спакойна пакарыстацца рэнтай старога партфеля і ў "Ніве" дарабляць, мне хопіць.

Але дзе там, і слухаць не хочуць. Бэфэль Іст бэфэль, як гавораць туркі.

Еду з імі ў Варшаву, а там проста ў бельведар. Толькі ўвайшоў ў палац — трапляю ў абдымкі прэзідэнта. Так прыціснуў, што аж дух забіла. Калі я аддыхаўся, прэзідэнт пасадзіў мяне побач сябе і давай загаварваць зубы: які я таленавіты і прыгожы. А я саромеюся і не магу зразумець, куды ён гне. Прэзідэнт глянуў на гадзіннік і кажа: "Мы вырашылі даверыць вам дыпламатычную місію. Паедзеце нашым паслом у Токіо".

— Божа, — кажу, — таварыш старшыня... — Тут я кусаю язык, што адазваўся, як да Самоціка, і папраўляюся:

— Таварыш прэзідэнт, я не магу быць паслом у Японіі, бо там гейшы і яны па-нашаму не разумеюць.

— Вы пакінце гейшаў у спакоі, — кажа прэзідэнт, — аб іх паклапоцяцца іншыя. Вы падрыхтуйце грунт для нашай дэлегацыі.

Ён гаварыў, а я мазгаваў, як ад гэтага ўсяго выкруціцца. Яшчэ не хапае таго, думаў, каб і абавязалі мяне да японскай працавітасці.

І я прачнуўся ў дрыжыках.

3

Прыснілася мне, што трэба здаваць нейкі важны экзамен. Няхай іх халера! — падумаў я. — Колькі я буду здаваць тыя экзамены. Ужо ж я стары. Але сілаю вядуць мяне да нейкай лабараторыі, саджаюць на цвёрдае крэсла ды ў рукі ўціскаюць тоўстую кнігу з разнакаляровымі геаметрычнымі фігурамі. Кажуць гартаць кнігу і хутка гаварыць, што бачу.

— Хочаце паслаць мяне ў касманаўты? — пытаю.

— Не, хочам вас даць на найлепшую пасаду, — кажуць.

— Адкуль жа гэта экзаменуюць перад павышэннем? — не здаюся.

— Не спрачайцеся з намі, — кажуць.

— Цяпер трэба ведаць праблемы...

"Божа, думаю, хто ім данёс, што я ведаю праблемы?" Але экзаменатары не даюць корпацца ў сваіх думках, няма часу, чытайце!

Колеры то я адгадаў добра, лісткі кніжкі толькі свісталі перад вачыма, а вось на фігурах зацінаўся. Урэшсце пажылая жанчына сказала, што ў мяне вочы скошаныя.

— Сядайце сюды, — загадала, — і паказала на крэсла, што стаяла ля велізарнай шафы. — Калі ўбачыце, што загараюцца ляпмачкі, адразу гасуце іх, прыцiскаючы, адпаведную кнопку.

Ох і пацеў я, гуляючы з лямпачкамі, аж чорцікі пачлі скакаць перад вачыма. Не удалося згасіць у час ніводнай. Ну, думаю, выбяруць. Усе гараць, а нам гэтага і трэба, каб было многа энергіі і цяпла. Пот з носа капае, а я чакаю рашэння пажылой. Тая, параіўшыся з калегамі кажа:

— Вы ўжо прэзідэнт!

З жахі я грукнуў з ложка (аж у суседзяў рэха адбілася). Прачнуўся і думаю: "Слава Богу, што гэта толькі сон".

## ПРОСЬБА ДА МІНІСТРА

Ветліва прашу, таварыш міністр унутрабнага гандлю, ліквідуйце картачную сістэму, бо яна мяне вытанчыць.

Шчыра прызнаюся, у сямідзесятых гадах, калі адчуваўся недахоп мяса і каўбас, я сам на сходах і дзе толькі мог крычаў за ўвядзенне картачак, бо хацеў мець мяса хоць пад нядзелю, як Бог прыказаў, а не меў. Не меў таму, што ніколі не мог дапхацца да прылаўка: пастаянныя "супольнікі" кожны дзень стаялі ў чэргах і

выкуплялі ўсё, што даволі, ды сушылі хіба на горшы час. Пасля ўвядзення рэгламентацыі аказалася, як я "палепшыў" сабе. Таксама ў чэргах трэба доўга стаяць, дарага плаціць, а купляць мушу тое, чаго іншыя не хочуць. Не купляў бы, але жонцы здаецца, што даюць дарма: мае ж картачку, і гоніць мяне па чэргах.

З мясам няхай ужо будзе як ёсць, калі нельга лепш, але ліквідуйце картачкі на мыла, парашкі, касметыкі, кашу і муку, бо не магу ўвайсці дахаты.

Калісьці жонка купляла гэтых тавараў столькі, колькі трэба, і можна было ўсё мець, ды ашчадна карыстацца. А цяпер усім гэтым карыстаемся не толькі ашчадна, але і скупа, каб хапіла на даўжэй, бо "хто ведае, як будзе заўтра".

У выніку такой гаспадаркі, мыл, парашкоў, кашы, мукі, гароху, фасолі, алею з соі, алею рапсавага, алею сланечнікавага алівы з алівак, аўсянага хлоп'я, рознае гарэлкі, віна, цукеркаў, пемзаў, туалетнай паперы, перфумаў, крэмаў да твару, крэмаў да рук, да ног, ад вяснушак, ад лішаёў, на маладзенне і гэтак далей — поўныя шафкі, шуфлядкі, яны пад ваннай, на паліцах і буфетах і дзе толькі ёсць нейкія шчыліны. Не хачу ўжо пісаць пра вопратку, абутак і іншыя тавары. Поўны падвал і гараж!

У магазіны кожнага дня прывозяць шмат тавараў, якія яшчэ прадаюцца без картачак, дык і іх трэба выкупіць, бо "мо заўтра не прывязуць".

Паважаны тав. міністр, будзьце добры і паслухайце мяне, ліквідуйце карткі! А калі ўжо ўпрэцеся і далей будзеце рэгламентаваць, то прашу, пазваніце ваяводзе, каб дазволіў адкрыць краму. Я маю чым гандляваць без дастаўы. Або няхай ваявода дасць мне яшчэ адну кватэру М-4 і талоны на шафы. Ведаю, што спатрэбяцца, бо грошы трэба ж выдаваць. Мы не сяляне, якія таксама маюць шмат грошай, але не маюць на што выдаць, бо ім жа плугоў, барон, вілаў да гною і іншых сельскагаспадарчых прылад не прывозяць. Мо перакінеце працаўнікоў ад прадукцыі касметыкаў у вясковыя кузні няхай робяць плугі, будзе больш хлеба, мяса і малака, з якога я буду сушыць сыры на ўсялякі выпадак.

1982 г.

## ДАСКАКАЎСЯ

Гэта праўда, што я напісаў просьбу да міністра. Але думаў, што рэдакцыя "Нівы" гэты матэрыял пашле ў Варшаву як нешта афіцыйнае і на гэтым наша — рэдакцыі і мая — роля закончыцца. Пачне

дзейнічаць міністэрства ўнутранага гандлю, каб памагчы мне ў гандляванні, або пашырэнні плошчы складавання тавару.

Тым часам рэдакцыі так спадабаўся мой рапарт, што ўзяла ды і апублікавала ў рубрыцы "З маёй званіцы". А вядома, што "Ніву" чытае ўся Беласточчына.

У першыя тыдні пасля апублікавання "Рапарта да міністра" адзываліся нясмела адзіночныя галасы ў тэлефоне, часам пры нагодзе пабыўкі ў Беластоку нехта заглянуў дахаты і, дыскрэтна разглядаючыся па кутках, пытаў аб тым-сім: нібыта чуў, што маю нешта прадаць, то пыталі, чаму часам не загляну ў сераду (дзень targовы) ў Гайнаўку, або ў панядзелак в Кляшчэлі, ці ў чацвер у Бельск.

Пабачыўшы, што я на іх прапановы рэагую абыякава, адыходзілі, нічога не сказаўшы, акрамя кароткага: "Да пабачэння".

Ужо мне гэтыя візіты крыху надакучалі, але што, свайго земляка не пусціш дахаты?

Але раптам урвалася, як адрэзаў, а я аж засумаваў, бо ведаеце, прывычка... Можа таму візіты абарваліся, што дамафон не дзейнічае? Заінсталявала яго БСМ і ўзяла ад кожнага кватэранаймальніка па 1500 злотых. Але то і добра, што сапсаваны дамафон, менш наведвальнікаў, мо прывыкну да адзіноцтва?

Але, як гавораць старэйшыя: "Цішыня перад бурай" Аднойчы ляжу сабе ў пасцелі, як цыганскі кароль і цешуся, што свабодны дзень перада мною (бо жонка ў шэсць раніцы пайшла да працы), і слухаю радыё. Аднак чую, што на вуліцы нешта дзеецца, бо чуваць галасы людзей. Прыцішыў я радыё і прыслухоўваўся галасам, але нічога разабраць не магу, бо мой пакой ад панадворка, дык нічога не чую акрамя нейкага "Ого, ух, ого, ух! "Вылез я з каралеўскага ложа і да акна ад вуліцы. Бачу, пад маім акном сотні жанчын і мужчын.

"Паслухаю, што яны крычаць", — падумаў я. Але, відавочна, нехта мяне прыкмеціў, і галасы ўзмагліся: "Петручук, пакажыся, Петручук, выйдзі!"

— Божа, — падумаў, — мусіць, народ патрабуе мяне на нейкі высокі пост. Хутчэй і якколеч апрануўся я ў піжаму, а сэрца хоча выскачыць ад радасці, што яны Валэнсу і Буяка скінулі з пасады, дык хочуць мяне. Госпадзі, што я ім магу сказаць на хуткую руку, каб яшчэ больш прыцягнуць да сябе, што абяцаць за давер'е?

Выходжу на балкон, бы папа рымскі з паднятаю галавою і яшчэ вышэй паднятаю рукою, каб прывітаць годна паклоннікаў. У такой позе застываю, бо убачыўшы мяне, натоўп змоўк і глядзіць на мяне не зусім прыхільным вокам. Стаяць людзі, па-вясковаму апранутыя, толькі пару сярод іх у капелюшах, ды ясёнках, званых "дыпламаткамі".

Думаю: "Прыйшоў мой верны народ прасіць мяне на свайго правадыра і адразу з сабой дарадчыкаў прывёў!" Гэта мяне асмеліла і я выкрыкнуў: "Вітаю вас, мае землякі, мае верныя чытачы! Скажыце мне, што вам баліць, хто вам на сённяшні дзень сала за скуру заліў?!"

На такія словы таўпа збаранела, бо даўжэйшы час маўчала, вырачыўшы вочы. Але пасля адзін з нібы-дарадчыкаў адазваўся: "Мы не ў палітычнай справе, мы ў справе рапарту да міністра!"

— А што ён вам не падабаўся, ці нешта пашкодзіў?

— Не мы толькі хочам ад вас купіць розныя тавары, якія маеце.

— Я не маю ніякіх тавараў. Гэта быў фельетон насмешлівы над тымі, што ўсяго ўдосталь маюць, а крычаць, што бедныя, што крызіс і нічога няма.

— А вы не насміхаейцеся над людзьмі, пільнуйце сябе: падаеце ў газеце, што маеце мноства тавараў на продаж, а цяпер ракам?! О, не. Дурняў з народа рабіць не будзеце! Не рабі з нас дурняў, — зараўлі ўсе, аж рэха пайшло.

Божанькі, што рабіць? Ужо ўсе суседкі павыходзілі на балкон...

— Людзі, я сапраўды нічога не маю на продаж. Я толькі так пішу, каб народ не шалеў і не купляў усяго, што толькі прывозяць у магазін, — крычу ім, каб перакрычаць а тыя дамагаюцца, каб паказаць гараж, калі ўжо кватэры не хачу паказаць.

Рад-няволя, мусіў зыйсці ўніз, да людзей, і завесці іх у гараж.

Некаторыя паглядзелі, пакрывіліся на мяне, што аж у зямлю гатоў быў праваліцца, паплявалі і пайшлі. Але асталося пару нязломных і гавораць, што чорт з усім. Можа яно так і ёсць, што не маеш. Але мы ведаем, што быў у Чэхаславакіі і пемзы мусіш нам прадаць хаця па баначцы.

— Людзі, пемза не ў банках, а голая, кавалкамі і таксама яе не маю, як і крэму ад вяснушак.

— Няхай будзе ў кавалках, але прадавай, не ілжы, што не маеш!

Не маю, не прадам і прашу — едзьце па дамах!

— Але, людзі, едзем, бо той галыш нас ашукаў! Каб меў столькі дабра, як той, што паказвалі па тэлебачанні, то маўчаў бы. Той, хто мае тавару на пятнаццаць мільёнаў, — маўчыць, а галыш заўсёды хваліцца.

— То ж ага, — падтрымалі крыкуна іншыя, — нічога не мае, а яшчэ просіць большую кватэру і гараж, галадранец! Дзеля такога дурня мы мусілі змарнаваць столькі часу і грошай, а ён яшчэ на балкон выходзіць!...

1983 г.

# БУТЭЛЬКА

З бутэлькаю звязана шмат нашага жыцця і быць, або не быць". Без бутэлькі не разбярэш, вала не прадасі, дроў не купіш, не змелеш. У кожнай гадзіне нашага жыцця бутэлька іграе асноўную ролю. Але бутэлька поўная. Такая бутэлька прысьпяшае рытм сэрца, раз'ясняе вочы і папраўляе настрой. Не гавару ўжо аб дабраце.

А вось пустая пляшка, нібы бяздомная сірата, нікому не патрэбная. Наадварот, чартоўскі перашкаджае дома і купіць ніхто не хоча, хоць усе гавораць аб ашчаднасці.

Сёння ўсю раніцу наша радыё прысвяціла бутэльцы.

Рэпарцёрка ездзіла па ўсёй Варшаве, па ўсіх пунктах, каб даведацца, дзе і якія прадаюць бутэлькі, слоікі і ўвогуле шкляныя ўпакоўкі. Была яна не толькі на пунктах скупкі, але аб'ездзіла ўсе аддзелы "Сполэм" і шкляныя заводы, спажывецкія крамы. Была нават у міністэрстве.

Ездзіла яна, бадай, пару дзён, бо Варшава — горад вялікі, ды і не заўсёды можна застаць на працы каго трэба. Намучылася, пазлавалася і... нічога не даведалася, бо ўсё яшчэ трываюць нарады, як ацаніць бутэльку: восем злотых за паўлітра і дзесяць за літр, ці мо сем за паўлітра, а дзесяць за літр. Гаварыла з міністрам, які наракаў на ПСС "Сполэм", што не хоча прымаць ад людзей шкла, а павінен. Прадстаўнік ПСС "Сполэм" бараніўся, што не можа прыняць, бо, папершае: магазіны яго змяшчаюць дзвесце тысяч штук, а прымае пяцьсот тысяч, а па-другое: навошта яму працаваць на кагосьці, значыць на прамысловасць дарма.

Вынік паездак пані рэдактар Гансяроўскай (слава Богу, прыпомніў!) быў такі: даведалася яна, а за ёю мы, што шкло цікавіць толькі аднаго чалавека ў Варшаве і ўсёй Польшчы. Ён скупляе ўсе бутэлькі і слоікі і гаворыць (я сам чуў, што не працаваў бы, каб да інтарэсу мусіў дакладаць.

Жыхарам горада Беластока і Беласточчыны падаю прыблізна яго адрас: Варшава-Урсынуў. Калі, даражэнькія, будзеце ехаць у Варшаву па каўбасы, або на экскурсію на базар Ружыцкага, не забудзьце узяць з сабою шкляныя упакоўкі, там, паводле слоў пані Гансяроўскай, прадасце.

На мой дурны розум прыйшла думка: чым людзі больш адукаваныя, тым больш губляюцца ў пошуках. У нас кожны другі мае вышэйшую адукацыю і кожны другі сярэднюю, а вось вырашыць наконт бутэлькі не могуць.

У Чэхаславакіі народ куды скрамнейшы і прасцейшы. Яны не разумеюць аніякае камбінацыі. Гэтыя "прастакі" ўвялі адну, усяго адну, як гэта не сорам, цану на ўсялякую шкляную пасуду: бутэлька ці слоік каштуюць там адну крону, і ва ўсіх спажывецкіх крамах можаце гэта прадаць. Брыдзяцца толькі заграпічнымі, як і мы.

1982 г.

## ТУАЛЕТ

Дарагая Рэдакцыя, даражэнькія Карэспандэнты і ўсе, хто толькі ў "Ніву" піша і яе чытае! Абсалютна ўвесь народ павінен пачытаць гэты фельетон, каб пераканацца, якім пераканаўчым спосабам ёсць дотык. Так, гэты звычайны дотык. Напрыклад, бачым нешта белае і не ведаем, цукар гэта, ці соль. Умакаем язык і ведаем, што соль (нам вельмі быў патрэбны цукар). Або іншае, каб пераканацца ці кілаграм абазначае заўсёды кілаграм, суседзі і паспрачаліся. Першы гаворыць, што ён не бачыць розніцы між кілаграмам жалеза і кілаграмам ваты. А другі хітрун гаворыць:

— Калі ты так думаеш, то давай пераканаемся. Бяры кілаграм пер'я а я вазьму кілаграмовы камень. І ты мяне трахнеш тым пер'ем, а я цябе стукну каменем.

А ці памятаеце, колькі было запісана паперы на тэму: "Чаму моладзь уцякае з вёскі?" Напэўна кожны з нас памятае. Але няма ніякіх водгукаў, колькі людзей мы пераканалі, каб не кідалі родных мясцін, родных вёсак, па якіх засумуюць не раз у далечыні. А вось мой добры калега, якога я ведаю ад роду, адным рухам пераканаўся сам, пераканаў жонку і ўскалыхнуў веру ў цудоўнае жыццё ў горадзе. Нават ахвотна яго слухалі ў Гайнаўцы на кірмашы, калі, стаяўшы на возе, гаварыў, бы на мітынгу, аб прыгожасці жыцця ў вёсцы.

Сярод натоўпу Браніслаў убачыў, што нехта смяецца, і падумаў: "Мусіць, яны мне не вераць". Крыкнуў: "Калі сярод вас ёсць скептыкі (ён гэта слова запамятаў з Кляшчэляў, калі ім назвалі яго за недавер'е, што карова пакрытая), то клянуся Богам, што я сам перажыў прыклад, які абрыдзіў мне горад на ўсё жыццё!"

— Давай, раскажы, няхай усе даведаюцца, — пачулася з розных бакоў натоўпу, — а то яны нікому не вераць — нават "Ніве", раскажы!

— Дык, вось, браткі мае родныя, паехаў я ў гэты халерны Беласток, куды уцёк мой сын і вашы пруцца, бы мухі да мёду. Яшчэ ў цягніку захацелася мне насікаць, але дзе ж там, на хаду нельга адчыняць дзверы, а на прыпынках усюды народ. Думаю, вытрываю да Беластока, а там недзе за кусцік захілюся і па бядзе... Даехаў я,

браткі, да Беластока, а тут людзей, як у мяне ля хлявоў мух, а кустоў не бачу. Ужо так захацелася, што далей няма куды. Каб так варочаўся да жонкі ўжо з ПКС, то няхай было б і ў ганавіцы, але тут жа іду да сына і ягонага цесця. Але Бог даў, па дарозе напаткаў я рэчку з заросшым зеллем берагам. Ледзь паспеў увайсці ў гэтае зелле і стаць на каленях, каб сядзеўшыя на супрацьлеглым беразе нічога не бачылі, аж падыходзіць да мяне міліцыянер і пытае: "Што вы, грамадзянін, тут робіце?" Я адказаў, што лаўлю рыбу, але ён не спыніў майго фізіялагічнага дзеяння. Пачакаў, пасля патрабаваў заплаціць 500 злотых за "лоўлю рыб без дазволу" і пайшоў на лавачку, а я да сына, ужо лёгка і здаровы.

Мой сын, браткі, падобны да мяне. Калі ўжо госць у хаце, то абавязкова мусціь яго пачаставаць. Ну, вось, пачаставалі яны мяне абедам і кампотам з сушаных груш з майго садка. П'ю я яго і зноў баюся, каб не захацелася на двор, бо што я цяпер зраблю. А як жа. Пузыр слабы, ці мо ныркі хворыя, як на злосць зноў хочацца. Пасмутнеў я і пачаў падазрона вярцецца, ды і размова не клеіцца. Сын кажа:

— Тата, мо вы хочаце ў туалет?

— А што гэта такое? — пытаю

— Ну мо вы хочаце пасікаць?

— Хачу ўжо даўно. А дзе ён у цябе, гэты туалет?

— А во, побач з кухняй.

— Што, я буду ў хаце сікаць?!

Ты што хворага з мяне хочаш рабіць ці дурня?!

Зазлаваў я і толькі яны мяне бачылі.

Вярнуўся з Беластока на свае прасторы, дзе раблю што хачу, і людзі мне шануюць, як разумнага чалавека, і ў хаце чысціня. Адна толькі думка мяне з'ядае: як вырваць сына з гэтага туалета, каб унукі раслі на прыстойных людзей.

1982 г.

## НОВАЕ АДКРЫЦЦЁ

Не крычу "Эўрыка!", бо гэта ўжо чарговае маё навуковае адкрыццё. Але не загаловак сведчыць аб важнасці мае працы, якая прынясе народу неаблічальныя карысці, калі толькі нашы мужчыны паслухаюць мяне і пачнуць карыстацца адкрытым мною метадам.

Мне нават нязручна самому аб сваіх вынаходках пісаць, бо яшчэ могуць знайсціся людзі, якія скажуць, што хвалюся. Аднак, як добры грамадзянін і патрыёт, мушу, бо зайздросныя журналісты не імкнуц-

ца са мною пагаварыць і за мяне напісаць. З другога боку, мо і лепш, бо я сам больш адукаваны апішу, а гэтыя пісмакі заўсёды выкінуць тое, што найважнейшае. Пасля ніхто не ведае, што да чаго.

А вось што да чаго. Знайшоў я сувязь паміж мужчынскай барадою і жаночым полам. Прынялося, усе ўжываюць, але моўчкі, каб не разпаўсюджваць, бо магла б чакаць мяне высокая ўзнагарода. Знайшоў я (мо скажаце, што не?) спосаб на захаванне валосся на мужчынскіх галовах. Напрацаваўся, бо не хацеў: па-першае, каб лысакі валадалі светам, а па-другое, крыўдна было за жанчын, якія пакорна мусілі паддавацца такім, як Каджак, або Фантамас. Таксама ўсе рады, але не бойсь, ніхто не пісне і слоўца ў шведскім пасольстве аб вынаходлівым грабаўлякові. Але гэта нічога. Я і так выйграю, аднак сорамна будзе ўсім за тое, што пры жыцці мяне не дацанілі. Тым больш, што я няспынна працую над усё новымі ды новымі вынаходствамі.

Хаця мушу лаяльна (ад лаяльнасці, а не ад лаянкі) прызнацца, што апошняя мая вынаходка дасталася мне, як сляпой курыцы зерне. Давялося паездзіць толькі па вёсках, дзе вялізныя лясы, спаліць "крыху" бензіну і "пацягнуць" мужчын за языкі. Але асноваю да цягання іншых за языкі была мая першая размова, зусім на іншую тэму з маім добрым суседам Васілём Сапёлкай. Ён ужо пажылы чалавек, але мае добрую і не лжэ, бо ж баптыст. — Даўным-даўно, у міжваенны перыяд, калі В. Сапёлка быў яшчэ кавалерам, яго мелі прыняць у партыю (не сказаў у якую, але гэта няважна). Аднойчы раніцай ён меў пайсці на партыйны сход у Белавежскую пушчу. Але ж, як добры сын, перад выхадам з дому (мо на цэлы дзень, хто ж яго ведае) вырашыў нарубаць дроў, каб маці мела чым наварыць бульбы на абед. Калі ўжо канчаў апошняе палена, зласлівасць мёртвых прадметаў спавадавала, што Васіль тапарышчам так трахнуў у міжножжа, што не толькі не пайшоў на сход, а ледзь суседзі адлілі вадою. Адляжаў я, — гаворыць ён, — два тыдні ў пасцелі і так астаўся беспартыйным, шкада, бо тады паліцыя вельмі біла партыйных, а яны з ёю дражніліся. А я, брат ты мой, раздражніваць быў бы першы.

Ён В. Сапёлка, так расказаў, але я ўжо ўчапіўся аднае думкі. Мяне надта зацікавіў ягоны сказ пра ўдар "па званкох" і я запытаў: "Скажыце, дружа, ці перанесены вамі боль не адбіўся адмоўна на плоднасці?" Васіль у адказ зарагатаў і запытаў у мяне, ці забыў, колькі ў яго дзяцей у хаце, бо колькі па-за хатай, то ён і сам не ведае.

Калі ён гэта сказаў, я не мог дачакацца моманту развітання з ім і Іванавай Оляй, якой альпу завёз. Прыкідаючыся, што еду ў лес па маліну, паехаў я па падпушчаных вёсках шукаць многадзетных сем'-

яў. Знайшоў многа такіх сем'яў, у якіх шасцёра дзяцей, гэта найменш. Ва ўсіх дзеці здаровыя і прыгожыя, раз'ехаліся па свеце, не ведаўшы прычыны свайго шчасця, здароўя і прыгажосці. Кожны з іхных бацькоў, будучы кавалерам, перанёс боль тапарышча на сваёй сарамлівай частцы цела. Лічыў гэта няшчасцем, але пасля не здарылася, каб тагока здрадзіла жонка, або хаця б адна шлюбная пара разышлася. Каго толькі я адведаў, усе былі людзьмі пажылымі, але здаровымі і радаснымі. Яшчэ пры мне і пры стале цалаваліся, нібы цяперашнія падлеткі. Аднаго толькі не хацелі ўспамінаць: таго, што тапарышчам — надта баліць. Максім нават прызнаўся калі я ўжо выясніў, у чым справа, што меў ён шчасце паспрабаваць болю ад тапарышча і ад чаравіка сябры пад царквою ў Дубічах.

— Ну, і як, — пытаю розніца была?

— Ого, тапарышчам куды больш баліць. Як дастаў пад царквою, то яшчэ вечарам на забаву пайшоў, але як смагнуў тапарышчам, то бадай тры тыдні ляжаў, ногі расставіўшы, і маці толькі ведала прыкладаць кіслае малако або сінюю гліну.

На аснове майго доследу, магу цвёрда сказаць, што блаславенны той, хто дасведчыць болю ад тапарышча і спакойна яго перанясе. Раю ўсім маладым папрабаваць шчасця, мо будзе больш трывала наша сям'я.

1983 г.

## ПАДЛОГА РЫПАЕ

Перабраліся мы з жонкай на новую кватэру. Прыгожая, з добрым паркетам кватэра, праз некалькі год стала чыстай мукай. Заўсёды паркет рыпае. Ды не, нельга сказаць, што заўсёды, а толькі раніцай, калі жонка з ложка ўстае.

Колькі я з-за гэтага пераржыў! Кожную раніцу са сну выбіваўся. А жонка сустракала адной спеўкай. "Чаго схапіўся, клепкі скрыпяць, а цяжка ў адміністрацыю схадзіць прасіць ратунку?!"

Я адказаў злозна. Пачыналася сварка. З суседзяў ніхто не праспаў — будзіліся на водгук нашай суматохі. Былі нават такія, што стукалі ў сцены, маўляў, спаць не могуць.

Перамогшы сваю ляноту, урэшце пайшоў я ў адміністрацыю з просьбай. Там выслухалі мяне, паспачувалі, але сказалі, што, на жаль, не маюць паркету і памагчы не могуць. Накіравалі да прыватнага столяра, мо ён дапаможа бядзе. А як жа, майстар згадзіўся памяняць клепкі. Прыйшоў, пахадзіў па падлозе, патупаў, памацаў рукою клепкі і са здзіўленнем сказаў: "Я магу перакласці, але ў вас цудоўная

падлога і нідзе не рыпае". Не рыпае, не рыпае, — падражніла яго мая, — а чаму рана рыпае?! У нас усё пад мужа, калі трэба, то не рыпае. Бачыце, рана, як нікога няма, сварыцца а цяпер маўчыць, бы вады ў рот яму наліў!

Майстар выслухаў тыраду і абяцаў, што неадкладна пераложыць падлогу — дасць іншыя клепкі. На другі дзень прыехаў з прыладамі і клепкамі, ды ўзяўся зрываць мае. Сумленны быў. Шкадаваў, што мусіць зрываць светлыя, а ўстаўляць цёмныя і вузенькія. Але зрабіў, узяў добрыя грошы і пайшоў. Не, не пайшоў адразу. Я забыў сказаць, што мы "абмачылі" новыя клепкі, каб не скрыпелі, тады пайшоў.

Леглі мы спаць. Жонка ў сваім пакоі, а я ў сваім. Засынаў я з надзеяй, што заўтра жонка ўстане задаволеная і пойдзе да працы, нават мяне не прабудзіўшы. Але надзея адно, а жыццё — другое. Назаўтра жонка расхадзілася не на жарты: прывёў нейкага п'яніцу, выдаў грошы, а пад-лога рыпае, як рыпела!

У дурнога заўсёды шчасце. І мне ратунак прыйшоў нечакана. Прыйшла да нас суседка, лекар-рэўматолаг. Сядзелі мы за сталом, пілі каву, ды пры сёе-тое гаварылі. Дайшла размова да сукенак. Жонка ўстала, каб пайсці і прынесці з шафы новую сукенку. У той момант, калі яна ўставала, зноў нешта рыпнула. Доктар паглядзела на жонку і кажа: "Ого, трэба будзе паказацца ў маім кабінеце. Як вы маглі дапусціць да таго, каб ногі аж так скрыпелі. У вас рэўматызм".

Мне стала лёгка, а жонцы сорамна, што такая маладая і з рэўматызмам.

1983 г.

## АДСТАЎНЫ КАПРАЛ І СУСЕДКА

Гаворыш, сына ў армію бяруць? Гэта найлепшае, што магло з ім здарыцца. Толькі п'е і за дзеўкамі ганяецца, бы кот за вераб'ямі. Яшчэ, чаго добрага, у суд пападзе і будзеш плаціць за яго аліменты. Добра, калі толькі адной, а што, як давядзецца тром, чатыром?.. Якія цяпер дзяўчаты? Як не ведае, з кім зацяжарыла, то чапляецца найпрыгажэйшага хлопца. А твой жа прыгожы. Што ён гультай, п'яніца і жулік — ёй напляваць, добра, што прыгожы. Дасць яго прозвішча свайму дзіцяці. Плаці, калі дурны...

Чаго ж ты плачаш, думаеш, у войску ён згіне? Не, гультаі ўсюды маюць шчасце. Павер мне. Я ж, брат ты мой, камандаваў цэлым аддзеленнем. А аддзяленне — не пузаты Мікіта, якога водзіш за нос. Яно складаецца з розных салдат. А чаму ты так баішся, каб не трапіў у пяхоту? А хто табе, баба, сказаў, што ў пяхоце дрэнна? Пяхота —

гэта багіня палёў, ёй усё падпарадкоўваецца. Калі пяхота скажа бамбіць — бамбяць, калі скажа страляць з гармат — страляюць з гармат. А клопатаў ніякіх. Артылерыст мусіць дбаць пра гармату, каб была чыстая і спраўная, танкіст — пра танк, каб меў гаручае і гусеніц не пагубіў. Не гавару ўжо аб пілотах, якія мусяць Усё ўмець, усё бачыць.

А пяхота? Ведай толькі: добра пад'еў, прыгожа памаршыраваў ды спяваў. А ты, дурная, плачаш па сваім гультаі. Крыжык яму на дарогу! У войску хоць навучыцца пасцель у парадку трымаць, а то спіць, як ў бярлозе, нават ног не мые. Там і ўначы мусіць ногі мыць, бо дзяжурны правярае. Ого, брат ты мой, колькі разоў я па-за чаргой калідоры мыў праз гэта. Але двух лычкаў дабіўся, не думай. Ён не даробіцца нічога, бо гультай. Але няхай паспрабуе вайсковага хлеба.

А калі б трапіў у маракі — гаворыш? Ну, дык што ж. Там, думаеш, нашы не служаць, там толькі марсіяне, ці што? У маракі пападае — пешшу хадзіць не будзе. Там толькі ведай, палубу мый, матроскія катлеты ўмінай і спі ў гойданцы. Нават піць гарэлку можаш. Чаго вочы вырачыла? Можаш піць колькі душа хоча, бо і так усе там ходзяць хістаючыся... О, каб мой ішоў, то было б шкада, згіне. У маці ўдаўся. А, з другога боку, добра было б, каб гада ўзялі, бо даўжэй не вытрымаю, выцвярэзнік за абармота не пад сілу плаціць. Але не возьмуць каму такое цяля патрэбнае, мармытаў адстаўны капрал, сядзеўшы ў пасцелі і здымаючы чаравікі.

Суседка ўжо яго не чула, бо пайшала дамоў, сказаўшы: "спакойнай ночы!"

1983 г.

## ЗНОЎ КУР'ЁЗ

Чалавек пражыве жыццё і, калі ён незнаходлівы разява, нічога не даб'ецца. Але гэта нічога. "Якога мяне Божа зрабіў, такога маеш", — гаворыць у маёй вёсцы, і гэта найпраўдзіўшая праўда. А чалавек жа павінен расці, развівацца, падглядаць прыроду ў полі, у лесе, у хляве і на панадворку, а не толькі суседку, як лезе па драбіне.

Чалавек павінен ведаць усё вакол сябе, але перш за ўсё сябе самога. Павінен імкнуцца да аналізавання свайго розуму, сэрца, паводзін, поглядаў на ўсё, што яго акружае. Палітыкай можа не цікавіцца, бо гэта не яго справа, гэта справа палітыкаў, а яны, як вядома, ніколі нічога не зробяць для паляпшэння жыцця людзям. Хіба што тыя самі сабе аблегчаць сваю долю, сабраўшыся нават не за круглым, а за звычайным сталом пры нагодзе свята. Пры такім стале чалавек чалавеку чалавек.

Доказам таго, што людзі не ведаюць сябе саміх, а я найгорш, ёсць нямала прыкладаў: адзін чалавек шмат гадоў працаваў звыклым рабочым і зусім не ведаў, што яго галава без алоўка і паперы — па памяці "выцягне" корань з мільярдавых лікаў. Гарыс таксама нічога не ведаў пра лячэбныя магчымасці, пакуль не напісаў замнога віскі і не зазлаваўся на сваю бабулю да той ступені, што хацеў ёй галаву завярнуць перадам назад. Старая цярпела на хранічны боль галавы і, седзячы на гойданым крэсле, глытала пілюлькі ды мармытала на ўнука, што надта часта і занадта многа п'е. На гэты раз Гарыс скочыў да яе, схапіў за галаву, каб выканаць свой намер, а тая крыкнула: "Божа, унучак, ты мой збаўца"! Гарыс вырачыў вочы, што тая сатарая гаворыць, а яна з вялікай палёгкай і спакоем дабавіла: "Ад твайго дотыку да маёй галавы прабег па мне нейкі электрычны ток, і галаўны боль разам з ім пабег у пяткі і ў зямлю..." Дзякуючы гарэлцы Гарыс стаў слаўны і багаты, але гэта быў чысты выпадак, як чусты выпадак зрабіў Людмілу Гурчанка артысткаю, як чысты выпадак зрабіў тое, што адзін чалавек з Чорнай Беластоцкай палачкай выкрыў цячэнне падземных вадзяных жыл, як чысты выпадак зрабіў, што аўтары польска-беларускага слоўніка не ведаюць, як па-нашаму называецца "różdżkarstwo". Так чысты выпадак зрабіў, што насельніцтва Беластока і Беласточчыны адкрыла ў маёй асобе прадказальніка надвор'я.

У лістападзе паехаў я на вёску, каб купіць бульбы. Найперш заехаў да Карыціск. Толькі затармазіў "Сірэнку", як выглянуў з клуні Іван: "Здароў, Васька, а што цябе да нас прыгнала?"

— Прыехаў, каб купіць бульбы добрае на зіму.

— Ого значыць зіма будзе доўгая і халодная.

— Адкуль ты гэта ўзяў?

— Адгадваю па табе. Ты ж заўсёды прыязджаеш па гародніну ў снежні, а то і пасля калядаў.

— Так, але я сёння хацеў залатвіць яшчэ іншыя справы: купіць яек, набраць вады з калодзежа на чай і мо дзе фарбы дастану.

— Не, не, калі ты запытаў пра бульбу, гэта пэўна, што зіма тут як тут. Я табе за гэта дам два кошыкі амерыканак без граша.

Далучылася да нас Іванава жонка Надзя і, даведаўшыся, у чым справа, дасыпала яшчэ буракоў, морквы, пэстак і хлеба з каўбасою на дарогу.

У канцы лістапада найшла на мяне ахвота палатаць дзіркі ў гаражы. Пачаў я мітусіцца каля іх нязграбна, а суседзі войкаюць, заламаўшы рукі: "Божа, зноў будзе зіма стагоддзя, пабачыце, Петручук латае гараж!".

Вось бачыце, а я і не ведаў, што людзі па мяне надвор'е пазнаюць.

Але ці пазналі?..

1983 г

## МАЛАЦЬБА

Валянцін Семянюк заклікаў гараджан да дапамогі сялянам у палявых працах. Такія заклікі гучаць кожны год. Я таксама калісьці, набраўшыся аптымізму, заклікаў да жніва. Але не дачакаўся водгуку, колькі гараджан і дзе працавалі. Мусіць, мой заклік ўпаў не на той грунт і не запусціў карэння. З заклікам В. Семенюка падобна.

Прачытаўшы насмешку М. адносна закліка В. Семенюка, мне стала сорамна, што людзі не імкнуцца землякам на выручку, і вырашыў крыху сябе апраўдаць. Але як гэта было — праз момант. Перад гэтым хачу сказаць пару слоў, як я бачу справу працы на вёсцы і каб не разводзіцца, заўважу коратка: калгасы! Калектыўныя гаспадаркі з поўнай тэхнікай, з адпаведнымі ўгнаеннямі, так званай аграрнай культурай, дадуць дзяржаве больш карысці, а сялянам лягчэйшае жыццё, хоць, можа, крыху менш багацця.

Пакуль што сяляне маюць усяго ўдосталь, але і працы па горла. Не падабаецца мне палітыка ўрада адносна пенсіі. На мой погляд, пенсію павінен атрымоўваць толькі той, хто здасць зямлю дзяржаве, а не той, хто перапіша яе на сына. У такім выпадку сын становіцца ўладальнікам, а бацькі памочнікамі. Працуюць, як працавалі, ды яшчэ дзяржава мусіць ім плаціць пенсію, не заўсёды заслужаную, бо сын, калі захоча, то прадасць дзяржаве збожжа, а не захоча, то не прадасць.

Адным словам, на вёсцы справа не ўпарадкавана і да таго часу Польшча будзе купляць хлеб, пакуль цвёрда не паставіць на калектывізацыю. Тады твая, яго і мая дапамога з ласкі не будзе патрэбнай.

Але пакуль да гэтага дойдзе, паехаў я памагаць малаціць. Каб быць лепшым і больш прадукцыйным, узяў з сабою жонку.

У пятніцу, перад вольнай суботай, калі мы мелі ехаць малаціць, жонка накруціла валасы, выкупалася, зрабіла манікюр, нібы на фэст выбралася. Яна ўжо забылася, як на вёсцы працуюць. Думала, што заедзем да гаспадара, сядзем за стол і будзем ласавацца баравінкай, а камбайн толькі фюкне — і гатова. Я маўчаў, бо і сам думаў што тэхніка не такая, як калісьці, перад вайною, калі я цэлы дзень падаваў снапы і памарозіў рукі, што пасля гнілі месяцамі. Цяпер думаў, заедзем, пару гадзін пагрукацім — і шабаш. Да абеда змалоцім, пасля

пап'ём, паспяваем у нядзелю назбіраем зялёнак і, як людзі, вернемся дамоў, каб грыбы давесці да парадку.

У суботу ўсталі ў чатыры гадзіны, а ў пяць выехалі сваёю "Сірэннаю", да мэты даехалі ў шэсць. На панадворку стаялі ўжо два самаходы, якімі прыехалі іншыя малацільпчыкі. Уцешыўся, што прыехала дадатковая сіла: "О, цяпер то дамо па рабоце, а то няма каму падаваць каманду!"

— Каманду? Навошта ж пры малацьбе каманда? — пытаю.

— А як без каманды разам возьмеш цяжар? — засмяяўся Коля.

Я не зразумеў, у чым справа і пайшоў прывітацца з гаспадарамі:

— Ну як, ужо ўсё гатова? — пытаю гаспадара.

— Усё, — адказвае, — толькі зараз пойдзем прывязем з кулка машыну.

Мы яе не везлі, вёз трактар, бо каб прыцягнуць такую гаргару на пару сот метраў, трэба было б не ведаю колькі чалавек. Малацілка мае ўсяго адно кола, а тры фельгі "абутыя" ў шыны — лапці. На панадворак неяк уцягнуў, але да клуні, на ток трэба было ўпіхаць чалавечаю сілай. Вось тут прыдаліся кожныя рукі, ручкі і ручонкі, ды мая каманда: "Раз-два, ўзялі!"

З праклёнамі і рогатам увалаклі мы неяк гэтую бяду-малацілку на ток, ды з палёгкай уздыхнулі, але адпачываць не селі. Некаторыя пазавівалі параненыя рукі, а я дручком ледзь хрыбта не зламаў, бо на каманду "раз-два, ўзялі!" усе мы дручкі паднялі, але і ўсе хутчэй ад мяне пусцілі. Машына ападаючы, прыціснула на мой дручок, а той мяне на калена паставіў. Мне балела, а іншыя смяяліся. Так ужо бывае, калі вясёлы калектыў і з ахвотаю працуе.

Коля ўзлез на малацілку, агледзеў яе і да кагосьці крыкнуў:

— А дзе сіта да аўса і жыта?! Хлопец з Юшкавага Груда які прыехаў памагаць як фаховая сіла, адказаў, што ў кулку няма розніцы між аўсом і жытам — тут сіты адны і на лён.

Раптам каманда:

— Па месцах!

Усе работнікі, нібы найлепшыя ваякі маладога прызыву, сталі на свае месца (адкуль ведалі?). Так спраўна і без крыку кожны заняў сваё месца, што пакуль я скумекаў, у чым справа, астаўся сам да нашэння саломы. Я гэтага і хацеў, бо што выпрабаванаму хадзіць па гумне, то не адбіраць ад рашоткі і вязаць снапы. Гэта рабіла мая жонка, яе сястра Аня, гадспадарова швагерка, вязала найлепш, хлапец з Юшкавага Груда і гаспадар з гаспадыняю наперамен, бо мелі кучу іншых спраў. Пры гэтым да абавязку хлопца з Юшкавага Груда, гаспадыні і майго належала безупынна насіць ваду са студні,

бо матор ропу еў, а ваду піў, як смок. Вядро на мінуту. Калі ўжо пацямнела, то ўсе ўдавалі, што забылі пра "смока", бо задзень ухадзіліся, то я мусіў сам таптаць з-пад пуні пад хату і назад з поўнымі вёдрамі, акрамя нашэння саломы. Малацілі мы ад узыходу сонца да заходу месяца. Аня ўжо не магла вытрымаць, хоць яна моцная і здаровая. У тракце вязання снапа зрабілася ёй горача і пачула, што сэрца замірае. Прыйшла да хаты, прыняла валідол, паляжала, пакуль ён пад языкам распусціўся, і зноў прыйшла малаціць. Ніхто нават і не заўважыў яе адсутнаці, акрамя мяне. Я заўважыў, бо ўжо даўно хацеў ёй блузку парасшпіляць, а цяпер такая магчымасць пабыць у хаце сам-на-сам...

Пры вячэры ўсе войкалі і вохкалі над сваімі болямі, але найбольш здзіўляліся мне, шкадавалі: як я выртымаў перанасіць столькі саломы, _вады і яшчэ дапільнаваць Аню, каб сэрца не астанавілася.

Пасля афіцыйнае вячэры Павел з жонкаю пайшоў дадому прыстаўляцца да заўтрашняга вяселля, а я з жонкаю спаць, а гаспадары мусілі сядзець, бо маладым хацелася выпіць. Яны гаманілі, а мы мучыліся, бо косці ламала, а спаць не давалі.

У нядзелю, замест таго, каб ісці па грыбы, трэба было насіць салому да пуні.

Панасіўшы салому, мы з жонкаю пайшлі адведаць братаву Олю, якая абдаравала нас пасткамі з дыні і макам.

Пасля абеда, кульгаючы на ўсе ногі і войкаючы ад болю рук, паясніцы і галавы, рабочыя параз'язджаліся па дамах, узяўшы з сабою вялікую ўдзячнасць гаспадароў. Такім людзям не шкада і мазольнае, цяжкае працы. Яны на нос падалі, а стараліся, каб нам дагадзіць.

XX век, а людзі працуюць таксама цяжка, як на другой сусветнай, а здароўе ўжо не тое ды тэхніка варта плачу і смеху, бо цяжка сабе ўявіць, каб "кулка" не мела насосу для пампавання кол.

Слава ўсялякай працы
Слава кожнай каплі поту,
Але з гэтай тэхнікай
Будзе ляжаць работа...
на лапатках.

1983 г.

## ЯК ГРЫПА ЗНЯСЛАВІЛА ВЁСКУ

Жыла-была і жыве дасюль ў адной вёсцы жанчына, якая вельмі любіла і шанавала грошы. Так шанавала, што аж старалася як найменш іх выдаваць на адзенне і харчы. Галубіла іх, пералічвала ў

вольны час і хавала так, што ані муж, ані дзеці ніколі не здагадаліся, дзе шукаць.

Каб мець як мага болей грошай, яна вельмі цяжка працавала: апрача догляду гаспадаркі, у якой каля дзесяці штук кароў, некалькі кормнікаў, шмат парасят, курэй, гусей, качак, яна яшчэ шыла каробкі, ткала ваўняныя плахты ды біла валёнкі — усё на продаж.

Суседзям здавалася, што сям'я гэтай жанчыны жыве ў дастатку, бо мае ўсе сельскагаспадарчыя машыны, добра харчуецца, і гэтак далей. А ёй, у сваю чаргу, здавалася, што яна жыве найбядней ва ўсёй вёсцы, бо яе мужык баіцца гнаць самагонку. Яна ведае, што гарэлка цяпер дарагая, значыць, і самагонка даражэе. А калі яшчэ з жыта — то можна добра прадаць і самому танней гасцей прыняць, або і вяселле справіць. А гэты гультай не хоча гнаць — хоць ты яго рэж!

І калі так, то Грыпа (так яе завуць) взялася за справу сама. Спярша, седзячы сама дома, зрабіла гаспадарчы падлік: мэтр (цэнтнер) жыта каштуе 1750 зл., а бутэлька найгоршае гарэлкі — 560 зл. З мэтра можна выдушыць 35 літраў. Гэта значыць, што пад вяселле, замест выдаткаваць на манапалёўку 78 400 зл., сама ж яна наробіць за 3 500 зл. і то лепшай, бо ад самагонкі галава не баліць. А пасля вяселля, калі ўжо добра напрактыкуецца а зяць трапіцца спрытны , то і "Ладу" купяць.

Схадзіла яна да Макара. Івана, Рогора разнюхаць што і як, каб не ашукацца ў разліках. Але найбольш яе цікавіла справа фармальнага падыходу да задуманага, бо не хацела канфлікту з правам. Пытае хітра ў Макара, як ён гэта робіць, што ўжо столькі год гоніць самагонку і ніхто да яго не мае прэтэнзіі.

Макар пачухаўся за левым вухам, усміхнуўся таямніча і адрэзаў: "Грыпа ты думаеш, што ў нас хто-колечы робіць што-колечы без дазволу і кантролю? Ці ж ты не бачыш, колькі да мяне кантралёраў прыязджае ледзь не кожнага тыдня? А ведаеш, як яны трымаюцца нормаў? Калі бяжыць слабейшая, чым на 50 градусаў, адразу крывяцца і верашчаць на мяне. Прабуюць, прабуюць, аж паснуць са змогі і ўжо далей смаку не чуюць. Тады мушу даць ім з сабою, каб іх шэфы папрабавалі, ці кантралёры Добра выконваюць свае абавязкі. Во як яно ёсць Грыпа".

Грыпа слухала і думала: "Чорт яго ведае, мо мой мужык і мае рацыю, што не хоча сцягваць на цябе розных кантралёраў. Але зноў падумаць толькі, які ж вялікі заробак!"

Ночы яна недаспала, бо ўсё разважала. Раненька ўстала і пабегла на пастарунак міліцыі, каб атрымаць дазвол. Трапіла на дзяжур-

нага. Той запытаў, чаго старая хоча. Яна растлумачыла. Дзяжурны вочы вырачыў і прагнаў бабу прэч, бо не меў часу на дурную размову. Але гэта Грыпу пакрыўдзіла, і яна стала дабівацца свайго. У сераду зайшла зноў і папрасіла дзяжурнага (ужо быў іншы), каб дазволіў ёй увайсці да пана каменданта ў вельмі асабістай справе. Дзяжурны — добры, спчувальны хлопец — упусціў жанчыну і нават паказаў дзверы шэфа.

Камендант выслухаў просьбу і з сумам сказаў, што, на жаль, такіх дазволаў міліцыя не дае. "Як не дае?! — узлавалася Грыпа. — А ўсё ж наша сяло толькі і багацее за самагонку, апрача майго мужыка-тумана. Вы ілжэце, што не дае!" Камендант на тое: "Добра. Калі вы даказваеце, што ў вас усе гоняць самагонку, то мо ведаеце, хто мае дазвол?" Грыпа загарэлася: "А пэўна, што ведаю. Учора была ў Макара. Ён мне сказаў, што ў яго ёсць дазвол, маюць таксама іншыя". Тады камендант: "То вы ідзіце дадому і даведайцеся, хто ў гэтых днях расчыняе, або гоніць. Мы прыедзем, праверым іхнія дазволы". Грыпа сыпнула: "А мне і хадзіць не трэба! Напэўна ведаю, што ўчора гнаў Макар, Іван і Рыгор, а расчыненую маюць Міхась, Ляўко, Васька і Пузаты. Яны не крыюцца, бо чаго ж ім баяцца?" Камендант дакладна запісаў усіх і сказаў: "Добра. Дзякуй вам. Мы праверым ці кажаце праўду". На тое Грыпа: "Бажусь Богам, што гавару праўду. Вось вам крыж!" Перахрысцілася ды задаволеная пабегла дамоў.

З таго часу слава вёскі ўпала а кантралёры не прыязджаюць нават кантраляваць малако.

1984 г.

## АД ЧАГО

Нават такі вялікі вучоны, як, не хваліўшыся, я, або мой прыяцель і сусед з дзіцячых год — Васіль Сапёлка, усяго не могуць ведаць. Нам проста не хопіць жыцця, каб усе яго сакрэты з тонкасцямі і... грубасцямі раскласці на простыя лікі. Тым больш ніхто і ніколі не спазнае чалавека, і асабліва не спазнае сябе самога.

Напрыклад, ве веадю я, ад чаго мне ўчора разбалелася галава і ад чаго перастала.

Каб вас зацікавіць гэтым лякарствам, апішу ўсё крок за крокам.

А чацвёртай гадзіне раніцы жонка выгнала мяне ў чаргу за мясам, гультаём ды дурнем абазваўшы. Гультай — гэта таму, як можна здагадвацца, што, нібы доўга сплю, а дурань таму, што сплю ў другім пакоі. Значыць, трэба ўсё падвойнае: ложак, падушка і гэтак далей. У чарзе стаяў я шэсць гадзін, бо да дзесятай. Але чарга мае і свае

плюсы. Там жа стаяць не ўсе панурыстыя, ёсць і вясёлы народ. Асабліва тады, калі знюхае, што ягоны сусед па чарзе — мяккі і на ўсё падатлівы. Ну, вось, я з такім і пазнаёміўся. Ён жыве над мясною крамаю. Запрасіў мяне на чай, каб адпачыць нібы. Сядзім за сталом, а ў жыватах бурчыць, бо галодныя. Сябра гаворыць: "Давай падрыхтуем супольнае снеданне — мая гарэлка і твая закуска". Я пык-мык, але сорамна ж быць скнарою.

Калега панёс у кухню маю торбу і праз хвіліну крыкнуў:

— У-гу-гу! Лепш і не трэба. У цябе адна толькі каўбаса і паляндвіца, чаму мяса не ўзяў?

— Бо мая жонка любіць усё гатовае, каб не варыць.

— А мая наадварот, але я згодзен з тваёй, бо мяса пакуль зварыш...

— Так, але пакінь крыху паляндвіцы, бо нечым жа мушу жонку карміць.

— А ты думаеш, што мы з табою упрэм два з паловай кілаграмы вандліны?

— Не ўпрэм...

Сябра раз-два закруціўся. Чую ўжо і патэльня сквірчыць і закусь на стале. Не, не на голым. Калега культурны — кляёнку падаслаў...

Я гарэлкі не п'ю, але цяпер захацелася. Хіба пах смажанае каўбасы ўзмацняе прагу да спіртнога. Аднак, бачу я, што сябра не спяшаецца з адкаркоўваннем паўлітроўкі.

— Ну давай! Чаго цягнеш, есці хочацца.

— А што, ты шавец, каб самому піць. Сам з'ясі вала — адна хвала, а я ж запрасіў кампанію. Зараз прыдуць, мо болей гарэлкі прынясуць...

Калегі прыйшлі, а як жа ж. Гарэлкі даставілі. Пакуль мы так адзін другога пераконвалі да сваіх палітычных поглядаў, то і жонка сябры вярнулася з працы.

Заглянула ў кухню і адразу выбегла да яго з крыкам:

— Ты п'яніца... Назвалакаеш нейкіх лындаў і зладзеяў ды яшчэ паляндвіцай корміш! Якая тут баба была? Гавары, бо так і дам!..

— Не было аніякае бабы...

— А чыя торба на падлозе ляжыць?

— Гэта торба таго пана.

— А чаму яна пустая ляжыць у кухні?

— Яна не была пустая...

Урэшце і я зразумеў, што мая торба пустая. Кроў уцякла мне ў пяты. Але, калі сказаў "а" скажы "б", я і кажу:

— Хлопцы, ідзем адсюль. Тут зладзеямі абзываюць парадачных людзей!

Нехта падтрымаў маю прапанову, ды такою моваю, што толькі п'яны зразумее, і мы з гоманам выкаціліся з хаты.

— Пойдзем, хлопцы, у "Каўнас".

Неяк туды ўвайшлі даўшы гардэробшчыку ў руку, каб нічога не бачыў. Селі за адным з пустых столікаў. Колькі там мы сядзелі, не памятаю, бо... на гадзіннік я не глядзеў. Але ведаю, што "сябры" адзін за адным растварыліся, як імгла, я астаўся адзін за сталом. Калі і я хацеў адысці, афіцыянт не пусціў:

— Што, мо пойдзеш і ты, а я буду за вас плаціць?!

— Ды не, я толькі ў прыбіральню хачу.

— Заплаціш за літар гарэлкі, чатыры адбіўныя катлеты з пячурыцамі, чатыры бутэлькі пэпсі, чатыры кавы, дадатак за забаву ды каб твае нагі тут больш не было, бо паклічу міліцыю.

Паклікаў міліцыю, таму што ў мяне ўжо не было і зламанага граша, каб заплаціць. Прабаваў я даць у залог свой гадзіннік, але афіцыянт і слухаць не хацеў. Відаць, цаною розніўся ён ад вячэры.

Міліцыянеры, бы пана, завязлі мяне ў выцверазільнік. Пакупалі халоднаю вадою, бо я пагражаў ім, што заўтра ўсіх іх праганю з працы і загадалі: "Спі!". Я не спаў. Абзываў усіх, хто на памяць прыйшоў. Найбольш жа жонку, за тое, што выслала за мясам, а грошы дала ў абрэз.

Назаўтра вярнуўся я дамоў з вялікім болем галавы. Ад чаго?

Давай лячыцца: глытаў я пілюлі, якія толькі ў хаце былі мікстуры і ваду ад рэўматызму, якая Альпай называецца, але нічога не памагала. Жонка, вярнуўшыся з працы з падпухлымі вачыма, узялася за маё лячэнне. Праўда, сваім, жаночым, спосабам — ужываючы кухонны прыбор, якім цеста раскачваюць. Я неадбіваўся гэтым разам, бо баяўся. Лёг спаць суцешаны, што толькі так закончылася на сёння.

На другі дзень раніцай устаў не адчуваючы болю галавы. Ад чаго яна перастала? 1984 г.

## МОДА

Мода, як вядома, прыходзіць аднекуль, адыходзіць некуды — невядома куды, мо да сметніка гісторыі. Пасля вырастае ў чыіхсьці галовах. Падпертая грашовымі аргументамі новая мода, або, нібы Фенікс з попелу, адраждаецца старая мода, якую народы ўспрымаюць са слёзкай у вачах. Не гавару аб модзе вопраткі, абутку, а агульна пра моду, якая можа народы прыемна здзіўляць, выклікаць усмешку,

наводзіць сум. А яшчэ іншыя задумоўваюцца над чужым горам; ну, бо не кожнаму падыходзіць нямытая, доўгая барада і не кожнай спадніца-міні. Але з гэтым бяда папалам, бо ёсць спосаб на паляпшэнне настрою жанчыны, якая хацела б насіць якраз нагавіцы, а ведае, што яны на ёй вісяць як на калку, а мужчыны гэтага не пераварваюць або сто дваццаць кілаграм хоча ўтаптацца ў нагавічкі падлетка. Зрэшты, як ужо вышэй сказана, мода вопраткі, абутку і Валос змяняецца. Калі нават і не змянялася б, яшчэ дадам, то і так людзям у масавым маштабе ад гэтага не было б аніякага гора. Гора людзей заключаецца ў тым, што выдумоўваюць новыя моды на розныя тыпы ўзбраення, на розныя метады знішчэння адзін аднаго.

Але я хачу заняцца маленькім адрэзкам гэтага ўсяго — небяспечнай модай нішчэння нашай маёмасці, а часта і чалавечага жыцця.

Менавіта ў пасляваенны перыяд была мода знішчаць тое, што вырастала з руінаў мінуўшай вайны, — шляхам сабатажу. Варожае падполле рабіла ўсё, каб толькі ўзарваць нейкую фабрыку, якая давала прадукцыю для паляпшэння, калі ўжо не дабрабыту, то хаця б жыцця, арганізавала цуды, каб сялян адарваць ад палявых прац, а гэта вядома, збожжа асыплецца, сена згніе ды яшчэ шмат іншага, што панізіць узровень жыцця народу і выкліча абурэнне на ўладу ды яшчэ і сацыялістычную ўладу. Ой, хацелі ворагі, хацелі выкарыстаць моду дзеля звяржэння сацыялістычнае ўлады ў Польшчы.

Цяпер настала новая мода, але аж ў двух кірунках: турыстыка і замыканні (электрыка!).

Турыстыка імкнецца да таго, каб вывезці з краіны чым больш дзяржаўнага багацця за граніцу, а з-за граніцы прывезці як найбольш прыватнага багацця. Адным словам, турыстыка імкнецца, а дзяржава ёй памагае колькі можа, каб зрабіць народ багатым, а дзяржаву... ой, не ведаю, ці гаварыць, бо могуць скрэсліць, але скажу: дзяржаву беднаю. А чаму і як — гэта ўжо не мая справа, каб разбіраць па костачках

Замыканне зроблена, каб хутчэй паглыбіць крызіс, у якім апынулася краіна ў апошнія гады. І як прыстоіць замыканню — дзейнічае маланкай. Гараць бальніцы ад замыкання, гараць заводы ад замыкання, вёскі гараць ад замыкання, лясы гараць таксама ад замыкання. Цяпер сабатажу няма, усе здарэнні выкліканы дрэнным лёсам або замыканнямі, бо на іх мода. З гэтага ўсяго вынікае, што дрэнных маем электрыкаў, якіх трэба судзіць, як сабатажнікаў або сабатажнікаў няма чаго хаваць за спіну электрыкаў, якія павінны абразіцца за абгавор.

Я асабіста думаю, што хутка прыдзе мода на яблакі, якія растуць на вярбе.

1984 г.

## САФАРЫ ВІНАВАТА

Я ведаю, што чытачы вельмі ахвотна чытаюць мае званічныя фельетоны, нават тады, калі яны доўгія. А сённяшні якраз будзе кароткі, бо няма цярплівасці.

А цярплівасці няма таму, што ў зубах поўна пяску. Наглытаўся я яго яшчэ ўчора, вячэраўшы. Ды толькі сёння ўразумеў, адкуль ён узяўся. Сам я, вядома, не здагадаўся, але паслухайце, як вылезла шыла з мяшка.

Аднойчы прачытаў я жонцы апавяданне пра дасканалае злачынства (як пазбыцца нявыгаднага чалавека — мужа ці жонкі). Аўтар прыводзіў шмат спосабаў, адзін з іх добра запамятала мая жонка і, калі я даўно забыў пра гэтую кніжку, пачала яго (гэты спосаб) ажыццяўляць.

Калі прыходзіла пара сілкавання, я баяўся за стол сядаць. Але сядаў і, ледзь не плачучы сёрбаў боршч. Хлеба не мог сціскаць зубамі, бо трашчаў у ім пясок. У талерцы з баршчом таксама заўсёды поўна было пяску. Каб не пералічваць, што я ем, скажу, што жонка ва ўсё сыпала пясок. А той памалу запаскуджваў паасобныя органы і выводзіў арганізм са строю. Ныркі да таго забіліся пяском, што перасталі нават фільтраваць піва і кожны трэці дзень трэба было выклікаць хуткую дапамогу. З жоўцевым пузыром была горшая справа хуткая дапамога патрэбна была кожны дзень. Шчасце, што яна ў суседнім двары, ахвотна з'яўлялася і ратавала мяне спосабам вусны-вусны. Была яшчэ нічога сабе, стагналі абое да абеду.

Але ныркі і жоўцевы пузыр — малако з мёдам у параўнанні са страўнікам. Гэты гад, у выніку жончыных захадаў, зусім перастаў дзейнічаць. Замест страўніка стварыўся ў маім арганізме нейкі дзіўны механізм: бурчыць, калі я галодны, на від ласункаў не рэагуе і нават у шэсць гадзін раніцы просіцца ў прыбіральню. Усё, як у гадзінніку. Клопат, што я ў сем гадзін раніцы толькі вочы пралупліваю. Але гэтым хай хвалюецца мая жонка, па яе прычыне ўсё гэта са мною дзеецца.

Аднак далей я ўжо не мог вытрымаць гэтага пяску ў зубах і павячэраўшы пытаю:

— Скажы, даражэнькая, чаму ў нашай ежы заўсёды поўна пяску? Ці ты мне часам яго спецыяльна не сыплеш?

А мая жонка хітрая, ой хітрая, крыху пачырванела, але спахапілася, глянула на мяне так ласкава, што я аж засаромеўся, і кажа:

— Ах ты, свіння нямытая, ты валацуга пракляты, я мела б труціць такога парсюка і адказваць за мужчыну?! Табе павылазілі лайдацкія слепакі, ці што? Ты не бачыш, што ідзе сафары (якраз адбывалася гэтая гонка) і пясок хмараю з-пад колаў ляціць у міску?

І я вымушаны быў прасіць у жонкі прабачэння за паклёп. Сафары вінавата.

1984 г.

## ОЙ, ГРЫША, ГРЫША!

Пусціў я цябе на званіцу а ты цяпер мяне "падгрызаеш". Хочаш мяне перавесці назад на "Трыбуну чытачоў". Чаму так хочаш, я не ведаю, але калі "звоніш", што я перастаў пісаць, значыць, прызнаеш мяне толькі на адзінаццатай старонцы. А мне ўсё роўна, на якой старонцы мяне друкуюць. Я ж не вінаваты, што мяне авансаваў галоўны. Калі ён пакіне працу ў рэдакцыі, то я не ведаю, ці хто іншы зможа са мною вытрымаць, ці захоча друкаваць мяне нават на дванаццатай старонцы. А ходзяць чуткі, ой ходзяць, што Юрка Валкавыцкі хоча нас пакінуць. Сёй-той па сакрэту шэпча мне, каб рыхтаваўся да функцыі галоўнага рэдактара, бо пакуль што лепшага кандыдата няма.

Я даўно ведаю, што створаны дзеля вялікіх спраў, але сам не дбаю пра гэта. Перад X з'ездам БГЛТ нават вераб'і чырыкалі, што я буду старшынёй Галоўнага праўлення, аднак я сам справу пакпіў: аднаму не падлізаўся бензінам, другому цялянцінай трэцяму гарэлкі не паставіў, а яшчэ іншага аблаяў ды публічна. Скарыстаўся ўсім гэтым Алесь Барскі, быццам бы яму было мала Варшаўскага універсітэта і таго, што з'яўляецца вядомым паэтам. Мне жонка не раз гаварыла: "Ты дурню калі хочаш быць кімсьці, то не глядзі на свае здольнасці, а жыві з людзьмі па-чалавечы. Замест з'яднаць людзей гарэлкаю, то нясеш у рэдакцыю гарошыну і дзеліш на чатырох! Ой чучала, ты чучала, твая скупасць давядзе цябе да таго, што людзі будуць цябе здалёк абыходзіць." І выкракала. Старшынёй мяне не выбралі і не ведаю ці паставяць галоўным "Нівы", бо хаця тэхнічныя працаўнікі рэдакцыі вельмі мяне хочуць бачыць на гэтай пасадзе, але рэдактары не, бо яны думаюць, што кожны з іх будзе галоўным. Каб ты Грыша, бачыў, як усе рэдактары мяне баяцца. Калі ўваходжу ў парогі рэдакцыі, то дзяўчаты адразу пытаюць, што я хачу з'есці, выпіць (у

рэдакцыі ўсяго, колькі хочаш), а рэдактары хаваюцца ў сваіх кабінетах, як суслікі, ў норах, толькі дзверы тарахцяць. Яны думаюць, што мяне гэтым напалохаюць, адстрэнчаць ад рэдакцыйнае працы. Але я працы не баюся і ведаю, што мае поспехі не залежаць ад іх. Я сам вырашу, як мне быць. А пакуль што я заходжу ў рэдакцыю, пытаю ў Жэнечкі, ці няма нічога да подпісу. Яна, як заўсёды, ветліва адкажа, што "сёння няма". Скажу ёй пару заслужаных кампліментаў, выходжу да пані Марысі. Там сабе пагутарым, гадзінку-дзве пасмяемся — і перабіраюся да рэдактара "Зоркі", пані Яніны, якая на мой від спыняе працу і адразу робіць каву. А ўжо, калі ёсць у рэдакцыі Вера, якая ведае, што на яе пасаду я не пайду, бо з карэспандэнтамі цяжка працаваць дык не можам развітацца. Калі б мне не трэба было рыхтаваць абеду, то мы сядзелі б да вечара.

Вось бачыш, браток, як я актыўна дзейнічаю. Акрамя таго, што вяду працу ў рэдакцыі сярод жанчын. А ты публічна гаворыш, што я перастаў пісаць! Бойся Бога, не гавары. А мо ты перастаў "Ніву" чытаць? Мо і ты, зямляк, пішаш адно, чытаеш другое, а думаеш трэцяе?

## ЗАБЫЎ

Стаю ў кухні ля зліву з закасанымі аж па локці рукавамі, і распраўляюся з селядцамі, якія толькі што купіў у рыбнай краме за 108 зл. Было іх у фольявай торбачцы пяць ці мо шэсць штук. Маленькія яны, але ўсе ў краме гаварылі, што вельмі смачныя.

Я з-за свайго дурнога характару ўжо нават і забыўся, які на смак і селядзец. Гэта з дзвюх прычын: або селядцоў няма і гэта найчасцей, або чарга вялікая і гэта таксама вельмі часта. На нашай вуліцы в рыбнай краме людзей заўсёды поўна і расхопліваюць селядцы маментальна. Адзін чалавек казаў мне, што мае бочку і ўсе здабычныя селядцы туды ўпіхвае, а пасля прадае, раздае або выкідае.

І так, аднойчы прыдумаў я спосаб і пазваніў загадчыцы крамы ды запытаў, ці ёсць селядцы. Маю, бачыце, цяжарную жонку і ёй вельмі хочацца селядцоў. Але тая пазнала мяне па голасе і адразу ў смех, што нібыта, я — варона, Я ей кажу, што нават часам і вароне нейкі чарвяк у горла трапіць, ды сляпая курка зернятка знойдзе. Тады сімпатычная жанчына з вуліцы Вясёлай кажа, што сёння і я — шчаслівая, сляпая курка, якой упадзе пару марскіх ласункаў. Яна, праўда, купіла іх сабе, але адступіць каб я паласаваўся і набраў ахвоты да жыцця. Надта ж, маўляла, скапцянеў я. Яшчэ дабавіла, што яна на мяне ўжо глядзець не можа, на такога падпанка, які баіцца крыху Ў чарзе пастаяць. Не такія і то стаяць...

Я ад радасці забыў абуцца. Кінуў тэлефонную трубку і Ў башмаках, але пры галштуку, пабег у краму...

І вось, цяпер стаю над імі, як чорт над грэшнаю душой і метадам скурадзёра луплю іх. Бы варвар той, галовы адрэзваю і выкідаю ў смецце, скуру здзіраю, як з бараноў, і таксама — у смецце. Не шкадую дабра, якое трапіцца на звалку. З'ем жа я чысценькае селядцовае мяса.

Перад вайной, за санацыі было селядцоў — колькі хто хацеў. Але ніхто, як добра памятаю, скуркі не выкідаў, бо з ёю можна было з'есці міску бульбы і наесціся. Мой бацька на вялікую сям'ю часам купляў аднаго-два селядцы. Мне даставалася галава, якую я лізаў, а бульбу еў і быў шчаслівы, што ў роце селядцом пахне. Але я пра тое забыў.

1984 г.

## А МО Б КРЫХУ ТАКТУ

Божа, колькі ж ужо напісана і сказана пра выхаванне моладзі! Я сам пісаў: "Моладзь, моладзь, каб ты пастарэла".

Калі сяджу дома і нічога не бачу, бо пры сустрэчы ў школах, тады моладзь цудоўная: культурная, зычлівая і выхаваная. Горш з ёю "на свабодзе".

Я не аднойчы думаў, што асветныя ўлады пакрыўдзілі вучняў, выкінуўшы са школ парты. Мармытаў пад носам, што нават пасля вайны дзеці вучыліся седзячы, а цяпер мусяць вучыцца стоячы ў поўны рост. Каліі толькі аўтобус пад'едзе да прыпынку, то яны гурмам пруцца, каб хутчэй заняць месцы для сяджэння і нават сядаюць адзін другомы на калені. Але ж пайшоў я па школах, праверыў і пераканаўся, што ёсць там і лаўкі і сталы, і ўсё, што трэба.

Таксама, калі сядзеце ў цягнік. Тут маска з моладзі спадае.

Аднойчы Віктар Швед і я ехаў з аўтарскіх сустрэч. Стомленыя былі, бо пешшу хадзілі з вёскі да вёскі два дні. У вагоне месца не было, сядзела адна моладзь, толькі мы аказаліся людзьмі пад шэсцьдзесят. Гнуліся, ламаліся, на змучаных, хворых нагах. Я асабліва. Шапчу да Віктара: "Каб тыя маладыя людзі здагадаліся пастаяць па дзве мінуты кожны, то мы б сядзелі цэлую дарогу".

Віктар пацвердзіў маю думку. У тым часе моладзь смяялася, нудзілася, або гуляла ў карты. Некаторым з іх было нават няёмка глядзець на нас, сіваваласых. Але ж яны вядуць сябе паводле правіла: "Не ён павінен уступіць месца, але сябра".

Нядаўна вяртаўся я з Бельска.

Калі прыехаў цягнік, я страціў усялякую надзею трапіць у Беласток. Аднак, адрываючы ўсе гузікі з паліто, звіхнуўшы нагу і згубіўшы капялюш, увапхнуўся я неяк у вагон. Ехаў на адной назе, енчачы, што баліць другая і спіна, ні рукой, ні сабой павярнуць не мог. Дваццаціпяцігадовы барадач верашчаў на мяне, што я яго цісну. Іншыя ж рагаталі, што ім добра, бо блізка дзяўчат. Рагаталі і з мяне, калі даведаліся, што заплаціў за праезд: "Пане, які дурань плаціць за праезд, ды яшчэ першым класам, калі тут, каб хто і хацеў скантраляваць, то не праб'ецца.

Вось якая ў нас крызісная сітуацыя, ды не толькі ў разуменні маральным, але і гаспадарчым. Чыгунка дарма возіць зайцаў, якім таго і трэба. Яны ж не маюць сумлення не толькі тады, калі трэба было б яго мець, або проста выпадала б уступіць месца старому, інваліду. Не маюць яго і тады, калі трэба заплаціць за перавоз свайго цела, якое і так пастарэе. Вось тады кожны з іх будзе хацець, каб сесці, але ніхто яму месца не ўступіць.

1984 г.

## А ГАВОРАЦЬ...

У каго б вы не запыталі, ці верыць у забабоны, кожны адмахнецца рукою і сцісне плячыма так, што ў вас аж пабарвее твар ад сораму. Ён вам не скажа, што вы наіўны, але вы адчуваеце сябе яшчэ горш, чым трэба, бо такіх пытанняў цяпер не задаюць. Цяпер кожны вывучае тэорыю Карла Маркса і адначасова ідэалізм, які таксама не навучае веры ў прымхі. Ніхто: ні бацечка ні ксёндз, ні рабін, ні імам, не гаворачы ўжо пра марксістаў, не навучае, каб верыць у забабоны. Наадварот. Гавораць, што гэта спадчына цёмных вякоў нашае планеты, і пішуць аб гэтым.

Але народ цвёрды і ведае, што калі ўсямоцная медыцына, абаснаваная на сусветнай навуцы і практыцы, вяртаецца да лекаў, вядомых многа стагоддзяў таму назад простым і неадукаваным людзям, то чаму б не верыць у забабоны? Гэта ж таксама таемная навука розных магутных мазгоў на працягу вякоў. Нам яна недаступная, як недаступны рай, але ж ёсць людзі, якія вераць у яго. Ёсць яшчэ і такія, што вераць у пекла, як бы ім было мала яго на зямлі.

Так вось і з забабонамі падобна. Народная навука пераходзіць з пакалення ў пакаленне і навучае, што калі хочаш, каб любіў цябе выбраны і жаданы чалавек — даеш яму напіцца любчыку. А калі гэта не памагае, то можаш даць яму напіцца нешта такое, што адразу ў ягоным Жалудку размножацца вужы і з'ядуць яго з сярэдзіны. Гэта

страшнае, але практыкаванае сярод нас, як помста. Памятаю, ёсць і забабон, які ў дадатак да свае таемнай "навукі" запрагае святых. Напрыклад, калі хочаш, каб пакруціла твайго ворага, ідзеш у царкву, купляеш свечку (святую) і круціш яе перад алтаром і ўсімі святымі. Гэта значыць, што ані навука рэлігіі, ані марксізму не вывучыла навук чорнай магіі. А шкада, бо толькі гэтая навука ёсць сапраўднай.

Прыгану ўсяго адну размову з Барысом. Гэта чалавек справядлівы, і хто, але я яму веру. Ён такі чалавек, што не ўмее і не хоча хлусціць. Пытаю:

— Барыс, ці ты верыш у забабоны?

— Веру, браток, бо без забабону ні за парог.

— На што ты абапіраеш сваю веру?

— На факты, браток. Ты памятаеш, як калісьці ў дзяцінстве наш Павал ішоў да вас па ваду і перайшоў вуліцу з пустым вядром Трахіму, што было?

— Памятаю, што Трахім набіў яго.

— О, відзіш. А Трахім жа быў адным з багацейшых і разумнейшых жыхароў вёскі.

— Ну, так, але цяпер пашырылася асвета, якая змагаецца з забабонамі: вераць у іх толькі людзі неадукаваныя.

— Васька, навука сабе, а забабоны навуковыя сабе і ты мяне ў гэтым не пераканаеш.

— Я не бяруся цябе пераконваць, але дай хаця б адзін прыклад.

— Я цябе прыкладамі магу засыпаць і то з уласнага панадворка.

— Давай, давай...

— Першае: калі мне прысніцца, што маю руку ліжа карова, абавязкова ў Кляшчэлях з няпрошаным госцем прап'ю ўсе грошы. Ну, і што ты скажаш?

— Ну гэта пераконвае...

— Але я яшчэ не ўсё сказаў. У мяне найгоршы клопат з сарочкаю, бо халера, калі ў полі найбольш працы, то яна з мяне смяецца...

— Цікава, раскажы.

— Заўсёды, браток, калі рана ўстану і надзену сарочку навыварат — мушу ўпіцца. Аднойчы еду на балота і думаю: сёння напэўна забабон не споўніцца, бо хто ў дарозе дасць мне гарэлкі?! У Вольцы затрымоўваюся каня напаіць і чорт нанёс знаёмага. Дзень прапаў. Учора іду за гай і думаю: "праўда, што сарочка была налева, але сёння — умры, ніхто не дасць гарэлкі, бо нават людзей у вёсцы няма, усе жнуць. Іду брукам, а насустрач трактарыст:

— Здароў, Барыс, куды мерыш?

— Па каня, — гавару, — бо трэба жыта звесці з поля.

— Зайдзі да Ваські, — прапануе трактарыст. — Я іду за гарэлкай, бо буду ў яго касіць.

Яны не касілі, я жыта не звёз, а гавораць, што ў забабоны не трэба верыць. Трэба, браток, бо то найлепшая навука.

1984 г.

## ? ? ? !

Не здзіўляйцеся гэтаму загалоўку, я сёння буду пісаць пад загаловак, які даў тыдзень таму назад — "певень за яйка", але забыў, што ад гэтага загалоўка хачу (і напісаць аб чымсьці зусім іншым). Цяпер прыпомніў і раскажу.

На Ганну, замест паехаць у Корніна, дзе адбываецца ўрачыстасць на цэлую дубіцкую акругу, паехаў я да сваякоў у Грабавец. З сваякоў я ў Грабаўцы застаў мала каго, бо ўсе паехалі ў Корніна. Але сустрэў Баніфацавага Колю, які з Ганныным Паўлам сядзеў на лавачцы. Коля так уцешыўся, што адразу вынес вядро яблык. Я іх паспешна схаваў у багажнік сваёй сірэны. Толькі так стаім і гаворым, аж едзе Коліна жонка, Таня, з якой я за Саветаў у школу хадзіў. Таня напаіла мяне кампотам, і так мог бы я з імі прастаяць да вечара, каб не мая цётка Матрона. Хлопцы зрушылі маю суперсірэну, і мы з цёцяй паехалі ў грыбы. Вярнуўшыся з лесу, зайшоў я да Колінае Валі (другі Коля), у якой тры дзяўчынкі, мураванка, малацілка, трактар і фіят. Ага, у яе яшчэ і Коля, ён — мой дваюрадны брат. Заехаў я да іх, каб выканаць загад сваёй жонкі, значыць купіць яек, ну, бо ж мусіць мяне імі карміць. Валя паспачувала, пачуўшы што толькі яйкамі харчуюся, і накарміла мяне свойскаю каўбасою ды малаком.

Калі пара было ехаць дадому, я нясмела спытаў у Валі, дзе б тут купіць яек. Тая адказала, што яйкі ёсць у яе.

— Добра, але я хачу два кілаграмы, адкуль ты вагу возьмеш?

— Я без вагі ведаю, што калі дам 34 яйкі, то будзе два кілаграмы.

— Такія вялікія яйкі, то й трыццаць два хопіць.

— Я сказала трыццаць чатыры, то трыццаць чатыры!

— Гэта будзе ашуканства.

— Не твая справа, я даю Клаўдзі!

— Ага значыць вы абедзве вырашылі загнаць мяне в склератычны тупік?! Тады кладзі колькі хочаш а я і так палову па дарозе паб'ю.

— Паспрабуй пабі хоць адно, то другі раз яешняй накармлю замест каўбасы! Мае яйкі свежыя і еш іх так, як захоча Клава.

Я бачу, што на пахілае дрэва і г.д. Замаўчаў. Думаю: "Рабі што хочаш, бо яшчэ са злосці дасі тры кілаграмы замест двух".

Валя лічыць, а я расказваю смешныя анекдот аб тым, як аднойчы Янка в сарочцы прыйшла ў рэдакцыю а пасля здзіўлялася, што людзі на яе глядзелі ды рагаталі. Думаў, Валя памыліцца і паложыць менш Валя сапраўды памылілася. Калі мы з Колем ужо ў машыне пералічылі (па яго просьбе), аказалася, што яек ёсць 33.

Коля як не крыкне на Валю (маўляў, хоча ягонага брата ашукаць). А Валя на тое: "Я не хацела яго ашукваць, я толькі адно яйка адняла, бо бруднае, але за тое Клаве дам пеўніка".

— А чаму Клаве, а не мне? Калі даеш Клаве, то няхай яна і плаціць!

— Табе пеўніка не дам, бо табе трэба есці яйкі. Разумею цябе, але не дам, бо не хачу Клавы ашукваць, а ёй дам пеўніка бясплатна толькі глядзі па дарозе не прадай, бо ёй трэба есці суп з курацiны. Глядзі якая яна вутлая, мусіць яшчэ і сто не важыць...

Няхай будзе ўсё так, як ёсць, але чым яна ўсіх падкупіла, што ў мяне ўбіваюць яйкі, каб ведаў, што я — не я і хата не мая, ды яшчэ грошы бяруць, а жонцы пеўнікі даюць Дарма?!

Мо я ўжо не Васіль, і не Петручук?

1985 г.

## У АБАРОНУ БЕЗАБАРОННЫХ

Ужо ў дзевятнаццатым стагоддзі рускі паэт напісаў: "Не мучь муху, бо ей больно!" Чуеце? А аб рыбе ніхто дагэтуль не падумаў. Не, я дрэнна сказаў. Мукамі рыбы ніхто не турбуецца, нікому галава не баліць.

Лоўлю рыб спортам называюць, аднаўленнем нервовай сістэмы. А як гэты "спорт" і "аднаўленні" выглядаюць? Прывязвае рыбак да жылкі кручок ці востры якарок і маніць імі галоднае стварэнне. А ці яно вінаватае, што галоднае, што такім яго змайстравала прырода? Беднае, глытае свой лёс, сваю згубу, а "спартсмен" цешыцца, вырывае з нутра рыбінага сваю пастку і кідае параненага сабрата на пясок, або ў торбу. Мучся, чорт з табою, калі дурное.

Цешацца рыбакі сваёй крывавай здабычай, цешацца ёю і іх сем'і. Убачыўшы поўную торбу пакалечаных прашчураў чалавека, зайздросцяць рыбакам сустрэчныя прахожыя.

У маёй вёсцы гавораць: "Каму вяселле, а цялятку смерць". Ды смерць цялятка (быка, вяпрука) больш гуманная. Толькі тады жывё-

ліна мучыцца, калі нейкая разява замест у сэрца, ўваб'е нож міма. Але наогул кожны робіць гэта спраўна.

З рыбай ніхто не цырымоніцца. Селядцоў ловяць тонамі і жывымі соляць. Яны паміраюць у мучэннях, а мы купляем іх і ласуемся. З прагнай думкай аб напаўненні сваіх трыбухоў, прэмся ў рыбныя магазіны, купляем карпа, які яшчэ пару дзён таму назад плаваў у рыбніку, кідаем у ванну, бо свята ідзе — хай будзе свежы. Той плавае, плавае і здыхае, з голаду. А мы потым аблізваемся, смачны. Ніхто і не падумае аб гуманным падыходзе да жывой істоты.

Грамадзяне, калі выцягнеце рыбу з яе прыроднага асяродка — вады, канчайце яе адразу.

Прыемнага апетыту!

1985 г.

## АБОЕ РАБОЕ

— Куды ідзеш?
— У горад.
— Ну, то не йдзі.
— Булкі маеш?
— Не, няма.
— Ну, то не куплю.
— А малако дома маеш?
— Таксама няма.
— То што, не прыносіць?
— Чаго?
— Як не, то не.
— Што, чаравікі купіў?
— Не, туфлі.
— Няхай сабе туфлі, але ж гэта боты!
— Калі боты былі туфлямі?
— Тады, калі ляжаў глыбокі снег!
— А калі ляжаў глыбокі снег?
— Дзе?
— У Афрыцы!
— А калі ты бачыў у Афрыцы снег?
— Тады, як там быў.
— А быў?
— Не.
— То чаму не заехаў па дарозе?
— Па якой дарозе?

— А якія бываюць дарогі?!
— Асфальтовыя, чыгуначныя і мо яшчэ якія.
— Ну, то па найлепшай, але глядзі, каб не ўпаў.
— Абую жорсткія боты, якія не коўзаюцца, — паеду лыжах.
— А ты чуў, што Коля свінню прадаў?
— Каму?
— Не ведаю.
— То як ён мог прадаць?
— Каб каня купіць!
— За свінню каня!?
— А ты, што хацеў пару?
— За свінню ён можа купіць толькі жарабя.
— Ну, пэўна, разумнік, пару коней і жарабя!
— Мне можна купляць, што хоча!
— А пэўна, каго ж ты калі пашкадаваў?!!
— Ты ў які бок гнеш?!
— У які хочу, і твая малая справа!!
— Чаго ты гарачышся, мы ж гаворым па-добраму?!
— З табою пагаворыш, калі ты ўсё супраць!!!
— Супраць каго!!!
— Супраць мяне!
— Адкуль ты гэта ўзяла!?
— Бачу па жарабяці!
— Па якім жарабяці?
— Па тым, што Коля за свінню купіў!
— А купіў?
— Хто яго ведае?
— Ну, то чаго гараваць?
— Таго, што ты пляткар!
І замоўклі на два месяцы.
1985 г.

## ГІГІЕНА

Выйшла з друку кніжка аб асабістай гігіене ў "Сярэбраным стагоддзі", значыць, за панавання Вазаў.

Калі я, у свой час, на старонках "Нівы" заняўся спра вай асабістай гігіены, меў і такія заўвагі: "А ці ад хлеба з'едзенага з бруднае рукі, хтосьці памёр?".

Аднак справа асабістай гігіены хвалюе людзей ад мо манту, калі яны навучыліся адрозніваць гігіену ад яе ад сутнасці.

Чытач можна падумаць (а нават напісаць у "Ніву"): "Адкуль узяўся нейкі Петручук-гігіеніст? Мо адно гаворыць, а другое думае?"

Я сапраўды баюся пісаць, атрымаўшы "порцыю" ад невядомай мне "Ангелікі Савіцкай" і майго былога сябра пакойнага К.Л. Але хачу сказаць: думаю тое, што і раблю. Хаця і займаюся пытаннем гігіены, не магу сказаць, што брыджуся людзьмі, а ўжо з канём, ці каровай буду піць з аднаго вядра. Але брыджуся іхнімі і сваімі адкідамі. А вы не? Вы думаеце, што мы рознімся ў справах гігіены? Вы таксама з агідай успынялі б, калі б вам хтосьці падаваў руку, высмаркаўшы ў яе на вашых вачах свой нос. А гэта ж здараецца часта. Падыходзіце да чалавека, каб з ім прывітацца, а той быццам паводле нейкага рытуалу, смаркаецца ў правую руку, выцірае яе аб нагавіцы і падае вам. Падасце яму сваю? Пэўна, што падасце. Але адначасова падумаеце, дзе б гэта яе хутчэй абмыць.

Многіх чытачоў здзівіла і тое, што я зараз скажу. А я скажу, што парадачны чалавек не павінен абмяжоўвацца туалетнай паперай, павінен і падмывацца. І толькі пасля ўсяго гэтага вымыць рукі.

Няхай смяецца хто хоча, а я люблю чысціню і ўсё вам прабачу, толькі не брудныя рукі. Бо я вам ніколі не нарэжу хлеба бруднымі рукамі.

Быў я на вяселлі. Людзі прыехалі з вянца і разбегліся, дзе хто мог, за сваёй патэрбай. А я назіраў: ці хаця б адна жанчына або мужчына падыдзе потым да крана. Ніхто гэтага не зрабіў, усе хутчэй палезлі за сталы.

Раніцай я нікога не правяраў, мыўся ён ці не. Але гэта і так вылезла. Іван убачыў, што я іду з ручнікамі ў ванную, і пажартаваў: "Ого, Васька мусыт за штось трымаўся, бо пушоў мытыся".

— А ў цябе чыстыя рукі? — пытаю.

Іван падняў далоні, пакруціў імі і адказаў:

— А што, я гамно мысыў? І ўрэшце пытанне: Што гэта такое тая гігіена? Якія павінны быць нашы адносіны да яе? Мусіць, яна надта ж важная, калі аб ёй кніжкі пішуць.

1985 г.

## ВОСЬ І ВЫХАД

Калі я быў малым губатым Цвелькам, па нашай ваколіцы ездзіў бедны Шайка-анучнік з Орлі. Гэты Шайка і гаварыў: "Дай Божа мне той розум, што ў мужыка на канцы". Прыклады цвёрда сведчаць за Шайкам. Ужо вялікі байбак, але дурны, павёз я прадаваць на рынак жыта, каб купіць абутак. Жыта я прадаў, але пакуль знайшоў таго,

хто прадае чаравікі, убачыў натоўп людзей. "Што там такое"? — падумаў я і пачаў прапіхацца. Бачу, столік а за ім нейкі прахадзімец усё раскідае тры карты і аж просіцца, каб яго абыграць. Ну, ці ж цяжка адгадаць, дзе чырвоная, калі ён яе паказвае? Бачу, адзін хлопец, загарнуў горбу грошай. Давай, думаю, і я нажывуся. Пачаў я адкрываць карты. А стаўка была высокая. Мо тры разы адкрыў і па маіх грошах.

Вестка дакацілася да маёй вёскі. Усе рагаталі.

Учора ў тэлебачанні даведаўся я, што ў краіны 30 мільярдаў доляраў даўгу, і што ад яго будзем у год плаціць 3 млд. працэнтаў. Пасівеў яшчэ больш і падумаў: "Хана"!

Сёння сустракаю Віктара, чалавека, бы Шайка, з галавою, і бядую: што будзе з краінай? А той кажа:

— Каб дзяржава не была бездапаможнай, як ты, то ўжо б забылася, як выглядаюць даўгі!

— Што ты скажаш? — азваўся я з уцехай.

— А пэўна!

— Як гэта, Віктар, як?

— А вось як. У краіне 30 мільёнаў дарослых людзей. А 30 мільярдаў падзяліць на 30 мільёнаў — гэта толькі коскай адцяць сем нулёў і выйдзе, што кожны з нас вінаваты 1000 (усяго толькі адну тысячу) доляраў. Гэта ж дробязь. Такія грошы ў нас ёсць, толькі ніхто не дасць дарма свайго маёнтку.

— Добра, але што тут павінна зрабіць дзяржава?

— Ты ў мадзяраў быў? — ні прышыў, ні прылатаў пытае Віктар. — Не. — Шкада, бо хто ў іх быў, той ведае, што там можна зарабіць шмат доляраў. А калі так, то дзяржава павінна кожнага з нас пасласць у Венгрыю пяць разоў у год і каб кожны з нас пры вяртанні абавязаўся прадаць дзяржаве дзвесце доляраў.

Вось і развязка пытання.

Узнагароду падзяліце на дваіх па роўных частках, бо каб не я, то Віктар сваёй думкі не выказаў бы, бо пісаць не ўмее.

1985 г.

## ВЫЙГРАЛА

Калі муж з жонкай хоча добра жыць, то ён не павінен ашукваць. Гэты парадокс з'яўляецца шчытом, які бараніць бездапаможнага мужчыну перад не заўсёды лагічнай логікай жанчыны. Ашуканства дае яму магчымасць суіснавання з самаўпэўненай упартай, "беспамысловай" жанчынай, якая "ведае", што яна ўсё лепш зробіць, лепш

аформіць кожную справу і нават лепш зварыць ежу. Гэта такая самая праўда, як тое, што вош кашляе. Ёй і ў галаў ніколі не прыйдзе, што можа стацца ахвярай мужчынскага розуму: Яна аж просіцца, каб мужчына стаў ашуканцам. І ён такім становіцца, хоць не па сваёй волі.

Вось, па-суседску шлюбная пара, якой ужо далёка за пяцьдзесят. А пажаніліся яны зусім маладымі: ён не ўмеў кашулі мыць, а яна — яешню спячы. Але пакупкі для харчавання ён рабіў, бо яго мілая саромілася ўзяць у рукі кошык, або ісці з сеткай па пасёлку, каб, барані Божа, яшчэ хтосьці ўбачыў, што яе муж у краму паслаў? Ён, у сваю чаргу, любіў і любіць хадзіць у спажывецкія крамы, ды і хоча быць ва ўсім жонцы прыдатны, бо яе любіць.

Аднойчы здарылася, што ў спажывецкай краме не было тлустага малака. Ну, то ён купіў худое. Жонка давай яго лаяць. Што ён корміць яе "нейкай адцэджанай вадой".

— Дарагая, гэта ж першы раз у жыцці так здарылася і калі не хочаш такога малака, дык сёння з'еш нешта іншае, — прасіўся муж.

Але яна і слухаць не хацела і, каб яго дабіць, схапіла бутэльку, ды й перахіліла ў ракавіну.

Знявагу ён перахварэў, але ў думцы абяцаў помсту, якую ажыццяўляе ўжо дзесяткі гадоў. Менавіта, дзесяткі гадоў купляе худое малако, прыкрывае бутэльку капселем ад тлустага малака і корміць ім жонку. Мала таго: вылівае малако з бутэлькі ў гаршчок для кіпячэння, палошча бутэльку халоднай вадой і бухае таксама ў гаршчок, і тою баўтухаю залівае зацірку, якую варыць на вадзе, локшыны, якіх да канца не адцэджвае, ды кашу. Жонка ўсё тое з'ядае з раскошай, ды цешыцца, што раз і назаўсёды навучыла дурня, якім малаком мае яе карміць, каб мела прыгожыя зубы і гладзенькую скуру на сваіх кругленькіх шчоках.

Калісьці, успомніўшы той няшчасны інцыдэнт, шмат гадоў таму назад ён спытаў:

— Скажы, дарагая, ці я не заслужыў на давер адносна малака?

— Так, дарагі, — адказала жонка. — Хвалюе мяне твая дабразычлівасць і ахвота служыць мне, але скажы сам, ці ж не лепш есці паўнавартаснае і смачнае малако?

— Ага, — сказаў муж і пачаў падлічваць даходы з розніцы цаны паміж худым і тлустым малаком.

Розніца ў цане выйшла малая, як і ў малацэ, але радасці было многа, што дагадзіў жонцы.

1985 г.

## АПТЫМІСТ

Усюды чую, што аптымісту лягчэй жыць. Нібы ў яго жыццё прыгажэйшае. Мо так калісь і было. А сёння я хачу быць песімістам, я хачу быць скептыкам, каб не называлі мяне дурнем і разявай.

Днямі паскардзіўся я знаёмаму, што не маю на чым спаць, тапчан, які набыў я ў пару славутага гаспадарчага прыспяшэння, разваліўся.

— І не можаш купіць новага? — здзівіўся знаёмы.

— А што, можаш мне памагчы ў гэтым? — у сваю чаргу здзівіўся я.

— Калі ласка. Учора быў у магазіне на Каляёвай і бачыў там нейкую мэблю. Але не цікавіўся, бо мне патрэбны кухонны капмлект.

— То бываюць і кухонныя?

— Розныя бываюць, толькі трэба трапіць у адпаведны час.

— Дык што, паможаш купіць тапчан?

— Паехалі ў магазін.

І мы паехалі на Каляёвую. Заходзім, а там, сапраўды, стаяць тапчаны. І мяккія крэслы. І нейкі камплект рэтра.

— Божа, — кажу, — чаго ж яшчэ хацець? Гэта якраз тая мэбля, якую шукаю. Але чаму яе ніхто не купляе?

— Відаць, дарагая, — адказвае знаёмы.

Пашкадаваў я, што пры сабе не маю 36 тысяч злотых
(цана майго шчасця), але знаёмы пацяшае: "Калі не купілі да абеду, то ўжо сёння ніхто не купіць".

Вясёлы паехаў я дадому, узяў у ПКО грошы і чакаю жонку, пакуль вернецца з працы. А тая прыйшла і есці хоча.

— З голаду не памрэш, паехалі па мэблю, я выбраў прыгожую.

— Ты дастаў мэблю? — жонка смяецца скептычна.

— Няўжо толькі ты ўмееш даставаць? — гаркнуў я і мы паехалі на Каляёвую.

У магазіне пру ў касу і паказваю рукой, за які камплект плачу. Касірша вырачыла на мяне сімпатычныя вочы і сказала:

— Эх вы, непапраўныя аптымісты!

Апусціў я сарамліва галаву і мы вярнуліся з пустымі рукамі дадому. У галаве толькі расло рашучае жаданне быць песімістам.

1985 г.

## ВОСЬ ГЭТА ФАЛЬКЛОР

Я не буду ўспамагаць А.Баршчэўскага, бо ў фальклоры ён ведае ўсё навылет. Не збіраюся таксама крытыкаваць яго поглядаў. Я проста ўключаюся паралельна ў размову пра фальклор.

Сустрэў я сёння Гандзю. Прыгожая жанчына, шыкоўная. Пытаю, як жыве, што новага, ці знайшла ўжо сабе таварыша жыццёвага падарожжа (табе ж цяжкавата гадаваць дзіця). Ну, вядома, пажартаваў наконт шлюбнага жыцця.

А Гандзі не да жартаў. Слёзы ў вачах блішчаць. Пачала сёе-тое расказваць. І ашаламіла мяне.

Выйшла Гандзя замуж па каханні. На вяселлі, згодна са звычаем, усе прысутныя давалі падарункі. І вось, калі Гандзя шчаслівая, кланялася падарункадаўцам, падыйшла да яе сяброўка і палажыла абрусок з уваткнутай у яго іголкай. Гандзя пакланілася, як і ўсім, але ў сэрца кальнула: "Чаму ў абрусе іголка?"

Вяселле адбылося ў маі, а ў снежні Гандзя кінула мужа, за якога выйшла па сваёй волі і ахвоце.

Ад разводу прайшло ўжо дваццаць год, а Гандзя ўсё наракае на лёс, які ёй згатавала сяброўка-чараўніца. Кажа яна, што напэўна жылося б ёй добра, калі б тая не ўсадзіла ў абрусок іголкі і не падарыла яго на вяселлі. Не ведала тады, што гэта значыць. Каб ведавла, то палажыла б гэты абрусок пад плашчаніцу. Тады б задуманае сяброўкай вярнулася да яе самой.

Вось гэта фальклор!

А я, цёмны, дагэтуль баяўся толькі хваробы і вайны. Аказваецца, трэба яшчэ баяцца і чараў.

1985 г.

## І БУДЗЬ ТУТ ВЕТЛІВЫ

Вадзіцелі аўтобусаў, як і ўсе людзі, бываюць розныя, ветлівыя і няветлівыя.

Днямі, едучы шасцёркай, пачуў я, як нейкі хітрун, падыйшоў да шафёра, сказаў:

— Пане калега, зрабі ласку, выштурхні мяне ля меблевых магазінаў.

Шафёр кіўком галавы прыняў просьбу. Даехалі мы да гэтых магазінаў, шафёр спыніў машыну, выйшаў з кабіны і шпурнуў хітруна каленам у азадак, што той, бы жаба, распластаўся на тратуары.

І ўсё было б "окэй", шафёр жа выканаў просьбу пасажыра. Але ўмяшаліся абаронцы "пакрыўджанага". Узнялі яны гоман, што шафёр пасажыра б'е.

— Чакайце, чакайце! — стараюся перакрычаць гарланісты "адвакатаў" і высветліць справу. А аўтобус рухаецца наперад, ад прыпынку да прыпынку, і шафёр, якога ўсе лаюць, быццам ніякіх спраў да нас не мае.

— Ён жа выканаў просьбу пасажыра, — пераконваю публіку, — навошта тады абзываюць яго брыдкімі славамі?

— Што, ты будзеш бараніць вярзілу, які б'е нас!? — крычаць.

— Я нікога не бараню, але я чуў просьбу "пакрыўджанага", — крычу ў адказ.

— Выкінуць нягодніка з машыны! — крычыць нехта ззаду.

— На брук падлу!

І шлёпнуў я на асфальт, як той хітрун пракляты, толькі менш удала, бо ў мазутную лужыну. Яшчэ ляцеўшы, пачуў, што з шафёрам распраўяцца на апошнім прыпынку.

1985 г.

## АСТРОН

Дарагі Астроне!

Звяртаюся да цябе як да Астрона-мужчыны, але мо павінен сказаць: дарагая Астрон? Не, не! Не таму, што хачу быць дасціпным і "раскусіць" твой пол. Барані Божа — меў бы зубы паламаны!. А проста таму, што апошняй ноччу ты мне прысніўся, мо лепш сказаць з'явіўся, у выглядзе прыгожай, ды на дадатак з сексам, жанчыны. А вось і сам сон.

Прыходжу я ў рэдакцыю "Нівы" з нейкімі намаляванымі анекдотамі. Літары гэтых анекдотаў — проста рознаколерныя кветачкі. Там былі зайчыкі, пчолкі, мушкі... Пад зайчыкам напісана (было): "Конь каапературыву сельскагаспадарчых гурткоў".

Я проста не ведаў, што гэты анекдот з зайчыкам можа значыць у кантэксце гумару, і зайшоў іменна туды, дзе ўсё ведаюць, каб растлумачылі. І тут вось, накіравалі мяне да Астрона, якім аказался жанчына, мне знаёмая, але толькі знаёмая, больш нічога. Тым часам Вы, дарагая Астрон, замест растлумачыць мне сэнс намаляваных кветкамі анекдотаў, пачалі прасіць, каб я памог Вам уладзіць аліменты.

Я ў сваёй нераздумнасці, як заўсёды, крыкнуў: "Аліменты я буду плаціць". Пасля злякаўся і прачнуўся, увесь мокры.

Гэта было пару тыдняў таму назад, а я і па сённяшні дзень не чую голасу жонкі, якая паверыла, бо чула, у мой крык.

У сувязі з тым насоўваецца ў маю бедную галаву мноства пытанняў, але я задам толькі адно: Астроне, сны ты адгадваць умееш, а адгадай, калі ласка, што будзе, калі кіне мяне жонка праз тваё аліменты?

Твой Вася

Ну, ты ж мяне, браце Васька, і напужаў. Праўда, чуў я недзе, што на Захадзе цяпер сталася вельмі моднай перамена полу. З роскашы людзі бесяцца, але каб так, у белы дзень мяне, старэчу абражаць?! Ты, брат, на сон не спасылайся, а сваю варожую акцыю адразу выяві. Мо мяне з пасады Астрона хочаш скінуць, у бабу пераўтварыўшы? Тады скажы праўду. Сораму ты, Вася, не маеш...

Але няхай ужо табе будзе. Мо і праўда, што табе такая бязглуздзіца прыснілася, што Астрон гэта баба і ты будзеш ёй плаціць аліменты. Але навошта зноў так крычаць пры жонцы?!

Э-гэ-гэ, Васька, штось у цябе з гэтымі справамі не ў парадку калі, крыкнуўшы, так злякаўся, што прачнуўся, увесь мокры. Глядзі, мо дзе з аліментамі залягаеш, ды жонка аб гэтым нічога не ведае. Твае паводзіны гавораць за гэта.

З усяго сказанага выпадае, калі кіне цябе жонка, дык праз твае а не Астронавы аліменты. Астрон, хоць і старэча ўжо, але свае аліменты плаціць ганарова: дакладна і ў тэрміне. Гэтаму навучылі яго яшчэ ў маладосці.

Астрон

1985 г.

## НУ Й МОЛАДЗЬ

Гаварыце, што хочаце, але я не прамаўчу і выкажу, свой погляд на сённяшнюю нашу моладзь.

Усе бачым, як моладзь, ходзячы па вуліцах, цалуецца, седзячы ў парках — цалуецца, у аўтобусах — цалуецца, У прыёмных — цалуецца.

Нядаўна сядзеў я ў чарзе да лекара. Супраць нас, абапёршыся аб паручні, стаяла маладая пара і заўзята слінілася (бо пацалункаў ёсць моц рознага тыпу). Стаялі Да мяне бокам, то я мог не саромеючыся сачыць за імі. Зрэшты, мусіў сачыць, не меў куды вачэй падзець, а адыйсці было цяжка, бо меў звіхнутую нагу. Ну, дык сачыў

за імі: мо пачырванеюць, або пабляднеюць? Мо спацяцца, або пачнуць дрыжаць.... Нічога такога не прыкмеціў.

Божа ж ты мой, каб на гэтую тэму хацелі выказацца сённяшнія шасцідзесяцігодкі, думаю, было б што паслухаць. Гэта ж падумаць толькі, паўтары гадзіны цалавацца — і нічога! Учарашняя моладзь на вуліцах не практыкавала, але калі ўжо пацалавалася, дык тыя пацалункі яшчэ да сёння гоняць вецер па губах і "мурашкі" па спіне. Вось, гэта была моладзь!

1985 г.

## ВОСЬ ЯК БЫЛО

Доктар Аляксандр Баршчэўскі ў сваім "Беларускім Фальклоры" не дае прапасці нашаму пройдзенаму, ды і мы яшчэ крыху памятаем, як калісьці бацькі жанілі і выдавалі замуж сваіх дзяцей.

Добра, што такі чалавек знайшоўся і ў скандэнсаванай форме даводзіць да нас тое, што перажывалі нашы бацькі і дзеды ў выніку "добразычлівасці" сваіх родных. Не адзін з нас памятае як маці згаджалася выдаць сваю дачку замуж не толькі што за нялюбага, але нават ненавіснага кавалера, гаворачы: "Ідзі дзіцё, калі такая воля бацькі нашага. Я, бачыш, выйшла за яго з мусу і якасці пратаўкла жыццё, то й ты будзеш таўчыся, калі такі наш лёс.”

Напэўна А. Баршчэўскаму было б лягчэй і лепш пісаць аб фальклоры радасным, цудоўным, калі б не... жыццё. Я хачу расказаць аб адным здарэнні з нашага панадворка.

У адной вёсцы жыў багаты гаспадар, але меў сына ні да людзей ні да Бога. Пасвіў ён кароў у бацькі, часам як бацька пагнаў, то мог гною налажыць на воз, не цікавіўся дзяўчатамі, а хлопцы над ім насміхаліся ўпотайкі, бо баяліся бацькі-багацея, і так той плёнтаўся на вёсцы ў доўгай сарочцы, без нагавіц.

у суседняй жа вёсцы жыла вялікая сям'я, беданя, аж страшна ўспомніць, але затое дзеці гадаваліся прыгожыя і на славу, а мо як на грэх, добрыя. Сярод гэтай кучы дзяцей была чарнавокая прыгажуня, якая гадамі падыходзіла пад вышэй спамянутага вярзілку. Але яны нічога адно аб другім не ведалі. Затое бацька кавалера прыкмеціў прыгажуню ўжо даўно, калі хадзіў наймаць яе бацьку да палявых работ, і падумаў: "Яна мусіць быць маёй нявесткай". У час апошняга візіту ў хату бацькоў-бедакоў, бацька вярзілы нібыта жартам запытаў чарнавокую, ці не захацела б яна стаць ягонаю нявесткаю. "А хіба ж ваш багаты сын захацеў бы браць такую, як я?" — адказала дзяўчына, заліваючыся румянцам сораму.

З ёю размова на тым і кончылася, але паміж бацькамі толькі пачалася. Хутка, аднак, бацькі вырашылі, што ў будучыя мясніцы (перыяд перад Калядамі і Вялікім пастом) іх дзеці пажэняцца. Калі толькі злезлі з поля бацька будучага маладога пачаў шукаць адпаведнага чалавека на маршалка, які не будзе сароміцца ехаць з ягоным сынам у "дзіваснубе", значыць у сваты.

А як жа, знайшоўся хітрун, які чорта гатоў ажаніць з паповай дачкой, абы выпіць чарку. Завёз яго ў "дзіваснубе" разам з бацькам, каб не ўцёк, і загадаў, каб той за парогам сеў на лаўцы, ды маўчаў, як пень, бо калі, увайшоўшы ў хату, пяройдзе за баляк, то рогі ў яго вырастуць, як у быка. Вярзіла злякаўся і быў паслухмяным.

Заехалі на панадворак парай такіх коней, што цяжка ўтрымаць. Бацька астаўся, каб даць коням есці, а маршалак папхнуў перад сабой жаніха ў хату. Увапхнуўшы, паказаў, дзе мае сесці, а сам сказаў: "Добры хлопец і прыгожы, але нясмелы". Дзяўчына ўбачыла нейкага, пад страху падстрыжанага нажніцамі, жаніха і злякалася. А маршалак палажыў на стале буханку хлеба — каравая, ды паставіў бутэльку з чырвонай наклейкай. Бацькі і маршалак паміж сабой таргаваліся, дзяўчына ў кухні плакала, а кавалер сядзеў, дзе яму казалі, і маўчаў. Праўда, сказаў адзін сказ, якім перапалохаў гаспадыню цырымоніі, але іншыя расмяяліся над "дасціпнасцю" малайца і далей вялі гутарку аб вяселлі. А сказ яго быў такі: "Але ж у вас клусты мухі!"

Не буду апісваць усяго гора дзяўчыны і ўсіх перыпетый, звязаных са шлюбам, хопіць сказаць, што маршалак-хітрун давёў да вяселля. Дзяўчына мела цешыцца тым, што будзе ісці побач юрадзівага на яго поле, мыць ягоную бялізну, дбаць пра гаспадарку, каб наеўся ён і ягоныя бацькі. Ніхто не цікавіўся такімі "дробязгамі", як любоў і пяшчоты.

Маладзіца жыла, як бацькі прыказалі, але яшчэ аднаго не ведала. Менавіта не ведала таго, што яе муж цёмнай ноччу баіцца адзін выходзіць на двор. Не раз бачыла, як выходзіў ён з бацькам, але не здагадалася у чым справа. Аднак, калі бацьку пахавалі і яму аднойчы так захацелася, што далей няма куды, давай ён будзіць жонку, каб вывела яго на панадворак. Тая, як добрая душа, устала, ды й вывела. Яна стаіць у сенях, а ён на парозе робіць сваё і глядзіць у начное неба, на якім мігацяць зоркі. Ды гаворыць: "От, хороша ноч, з чужэю жуонкою у свет пушоў бы!". "Ах ты, свынё нескрэптана — знервавалася жонка, — то я тэбэ выводжу на двуор, як малого, халучу, ополоскую, кормлю, а ты, хочэш Іты у свет з чужэю жуонкою? Котора такую лылу схочэ, але йды, коб ты нэ вэрнуўся!" — і трахнула дзвярыма ў спіну аматара чужых жонак, аж той босымі нагамі

хлёпнуў у балота, а яна засунула сені і лягла далей спаць. Бандура вярнуўся дадому аж раніцай, бо Параска дзвярэй не адчыніла, хаця прасіў і пагражаў.

Трэба сказаць, што на яе долю дзеці былі прыгожыя і разумныя, як яна і сусед.

1985 г.

## ПЕЎНЯ ЗА ЯЙКА

Я, як заўсёды, дурань прызнаўся жонцы ў тым, што даведаўся ў рэдакцыі. А даведаўся я, што яйкі адмоўна ўздзейнічаюць на хваробу, якая склерозам завецца. Жонка паслухала і адразу вывад з гэтага зрабіла: пачала інтэнсіўна карміць мяне яйкамі. На снеданне вараныя, на абед смажаныя, а на вячэру когель-могель. Усё для таго, каб выйшаў і не вярнуўся. Дабілася такога рэзультату, што хоць публікуй у навуковай літаратуры. Калі яшчэ пару гадоў таму назад я цэлымі тыднямі не памятаў, што ў мяне ёсць жонка, то цяпер яна кожны дзень перад маімі вачамі. О, напрыклад, учора! А мо гэта пазаўчора, або яшчэ даўней? Але хіба сёння — пасля кожнай паўгадзіны адпачынку на папяросу, зноў дабіраўся да яе, як нейкі малойчык. Спярша вельмі цешылася маімі дасягненнямі, але пад вечар дапіла рэшту кавы, абула туфлі...

— Куды ты йдзеш? — спытаў я са здзіўленнем. — То ж набліжаецца вечар?

— Вось іменна, — адказала жонка, — набліжаецца вечар і я павінна быць дома. Там муж чакае.

Пацалавала мяне горача, і толькі я яе бачыў.

"Божа, — падумаў я, — што яна мела на думцы, гаворачы, што мусіць быць дома?" Але чаго жанчына не выдумае — махнуў рукой і ўключыў тэлевізар. Аглядаю сабе цырк, бадай цырк, бо Ганна і Антоні Гуцвінскія кракадзіла ды папугаяў паказвалі. Аж тут званок у пярэднім пакоі як засвішча!

— Каго там зноў прынясло ліха, ідзі адчыні, бо аглохну! — крычу ў другі пакой, дзе паводле мяне павінна быць мая старая, а сам баюся, што кракадзіл нырне ў ваду і больш яго не ўбачу. Але жонка з пакою не выходзіць , а званок усё даўжэй і зласней свішча. Адчыняю дзверы...

— Божа, адкуль ты ўзялася ў гарсонцы і, з парасонам, ты ж толькі што выбегла ў адной сукенцы?! І наогул, куды ты выходзіла?

— Што ты пляцеш, стары склеротык, ты ж добра ведаеш, што я сёння рана паехала ў Міхалова да сястры, каб табе пчалінага кіту дастаць.

— Якога кіту, што ты гаворыш?! То ж не далей, як паўгадзіны таму называла ты мяне Дон Жуанам і цалавала, як ашалелая!

— Што? Паўгадзіны таму то я ехала, а да цалавання то ты ўжо не надаешся пяць год!

Госпадзі, чаго тая жанчына ад мяне хоча? — задумаўся я.

— Цэлы дзень у пяшчотах, аж да сёмага поту, а ёй яшчэ мала?

— Даражэнькая мая, а ў колькі паехала ты ў Міхалова? Пры тым, чаму паехала ў сукенцы, а прыехала ў гарсонцы? Што, у сястры трымаеш вопратку, каб муж не прапіў?!

— О, бачыце, знайшоўся муж, які гарэлку п'е, — заўважыла жонка іранічна і дадала, каб ашарашыць мяне дарэшты:

— Ты такі самы да піцця, як і да кахання!

І пайшла ў ванную. Я далей гладзеў, як адзін армянін вучыў замежных гасцей па канаце хадзіць. Не толькі хадзіць, і ляжаць выцягнуўшыся, і ў крэсле сядзець. Я часам за сталом з крэсла падаю...

Выскачыла жонка з ваннай і шлёпае мяне па галаве нейкаю анучкай, ды пытае, што гэта?!

— Пакажы, — гавару? — чаго ты шуміш?

— Шумлю, а што гэта такое?!

— Майткі, — гавару.

— А чые ж гэта майткі, каб ты здох!

— Твае, каб ты здаровая была!

А сам здагадваюся ў чым справа. Урэшце прыпомніў, што сапраўды жонка раніцай паехала ў Міхалова. Зрэшты, прыпомніў я таксама, што меў пісаць аб яйках і пеўнях. Але хай ужо будзе, што напісаў, бо ж мне не хапае больш месца ў "Ніве".

Да пабачэння ў мяне! Толькі дзе я жыву? Забыў.

1985 г.

## ЗАМАХОВЕЦ

Кім толькі ў жыцці я не быў, Божа мой! І Цвэлькам губатым быў, і Бэркам смярдзячым быў, варацілам, бурхлём, сычом, баструком, конскім лобам, бутлем, кердзялам, злодзеем таксама быў. А цяпер яшчэ і замахоўцам на старасць стаўся. Не верыце? Паслухайце.

10 лютага 1986 года было каля дваццаці градусаў марозу. Жонка прыімчалася з працы амаль плачучы, бо вельмі змерзла ў рукі. Убачыла, што я сабе сяджу ля стала і папіваю чай, і заплакала.

— Чаго плачаш, даражэнькая, — запытаў я, — мо цябе нехта пакрыўдзіў?

— Ты мяне пакрыўдзіў, бо сядзіш дома і нават хлеба не купіў на абед, а я ў рукі змерзла, як сука, ды й яшчэ, бегучы дамоў, грукнула аб лёд галавою! А той сядзіць сабе ў хаце і п'е чаёк, як нейкі шэйк!

— Даражэнькая мая, я толькі цяпер снедаю, а ты ўжо на абед прыперла?

— Снедаеш, бо ты ўжо згубіў пачуццё часу і не ведаеш, калі табе хочацца спаць, а калі есці. Я не раз чую, як сярод ночы ходзіш па кухні і халадзільнікам бразгаеш ды чай парыш, аж мне самой хацелася б папіць. Але ж ты не здагадаешся, каб мне падаць, толькі сам умінаеш. А пасля цэлымі днямі спіш, калі я на працы. Ого, я добра вас, чарцей ведаю. А ад чаго ў цябе жывот, як у котнае авечкі?!

— Слухай ты, стокілаграмовы заморыш, — адгрызаюся я, гавары, што цябе сёння ўкусіла: нехта на вуліцы пахваліў, ці шэф аблаяў? Ты ж заўсёды такая добрая і мілая жанчына.

— Будзь ты добрай, калі ў хаце нават хлеба няма!

— Ой, вялікая бяда! Зараз выскачу, ды й прынясу, — гавару, абуваючы чаравікі, а жонка адразу павесялела.

Пайшоў я ў суперсам, дзе купіў паўхлеба звычайнага жонцы і палову буханкі "грахама" — сабе. Варочаюся назад і сустракаю свайго суседа Янку, якога таксама жонка паслала за хлебам. Мы на гэтым марозе пастаялі ўсяго толькі з гадзінку, ну, мо крышку больш, але не многа, бо нават добра не замерзлі. Праўда, што мы былі апрануты ў кажухі, шапкі-вушанкі і ў цёплыя чаравікі, але ўсё роўна...

Прыбег я дамоў, а мая з крыкам: "Што, мо скажаш, што за хлебам ў Орлю ездзіў?!"

— Чарга ў магазіне, хоць ты зракайся... Каб не тое, што табе хачу дагадзіць, дальбог не стаяў бы.

— Цяпер чарга ў магазіне? Ты мо з якою бабаю стаяў, ды й пляткаваў, а не ў чарзе за хлебам. Я ўжо, слава Богу, даўно цябе пазнала.

Я моўчкі павымаў з сумкі, але бачу нейкае дзіва: браў хлеб цёплы, а ён цвёрды бы камень, але ані слова, што ён змерз на косць. Каб услужыць жонцы, ўзяў і "адмучыў" лусту ад буханкі, але тоненькай мне не ўдалося — адрэзаў вясковую скібку, быццам бы не шкадуючы. Жонка скончыла падаграваць звараны мною суп і, наліўшы ў талерку, хацела есці. Толькі ўзяла на зубы прынесены хлеб, адразу енкнула ды схапілася рукою за рот.

— Што з табою, мілая, мо язык прыкусіла? Не хапай так!

— Ужо ж, той замаховец прыслужыўся, што я зубы паламала! Я сапраўды спужаўся, што мо паламала, але высветлілася, калі ўжо падабрэла жонка, што толькі адзін выламала, затое пярэдні. Нават крыўдна мне стала, што з-за аднаго жончынага зуба я стаў замахоўцам у яе вачах, замест падзя-каваць мне, што цяпер будзе жалезны, значыць — вечны.

1986 г.

## САБАТАЖНІК

Не буду называць вёсак ані мястэчак, а тым больш прозвішчаў людзей, схільных да сабатажу, бо, можа, не адзін з іх стаў дзеячом Беларускага грамадска-культурнага таварыства. І вёсак не буду выдаваць, бо можа, у іх цяпер вывучаюць беларускую мову ў школе... Прыкра было б ім чытаць такое пра сябе, пра сваіх бацькоў і дзядоў, якія не хацелі або і баяліся ўводзіць у сябе нейкую беларускасць.

Аніяк, аднак жа, нельга змаўчаць прозвішча чалавека, які супольна з Толем Мартыновічам аддаў шмат сілаў сваіх ды здароўя дзеля таго, каб арганізоўваць усюды гурткі беларускія і паляпшаць псіхіку сялянскага несельніцтва. Гэты актывіст — Сакрат Яновіч. Ён нават не ведае, што яго дасягненням выдатна садзейнічаў Кастусь Майсеня. Кастусь будаваў па вёсках цагляныя крамы і, капаючы разам з народам равы для фундаментаў, гаварыў з людзьмі па-беларуску, не наравіў у паночкі. Майсеня набудаваў тых крамаў больш за сто, а хітры Сакрат Яновіч скрадваўся, а можа нават, крочыў смела з Толікам Матрыновічам па-несацыялістычнаму пясчаных яшчэ дарогах ды ўтвараў гурткі Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Калі і гурткоў тых павялося больш за сто, тады якомусь беларускаму рэакцыянеру здалося, што Беласточчына зробіцца самастойнай рэспублікай беларусаў, а яшчэ, крый Божа, сацыялістычнай і на чале з камуністамі! У таго рэакцыянера было пяцьдзесят гектараў зямлі, былі браты ў імперыялістычнай Амерыцы ды ў гэтак жа імперыялістычнай Англіі, якія не паварочаліся на радзіму. "Як яго, Яновіча утапіць?" — усё думаў, як дзень так ноч, той рэакцыянер. І дадумаўся.

Паехаў наш рэакцыянер у Бельск, бо тады толькі ў Бельску бывалі тэлефоны, і адтуль пазваніў у Галоўнае праўленне БГКТ у Беластоку, каб даведацца, калі Сакрат Яновіч будзе ў яго вёсцы і што ён любіць есці. У ГП сказалі, што Яновіч любіць есці ўсё, акрамя кішкі са скваркамі і паранага малака, бо яны згідзіліся яму яшчэ ў

маленстве: бацькаў шавецкі хлеб не быў занадта раскошны. Яновіч аж дрыжыць затое, каб паесці капусты з баранінай!

— Вельмі добра! — радасна адказаў гаспадар-рэакцыянер і хуценька папрасіў: — Перадайце яму, што я чакаю яго з гасцінаю. А сам сабе падумаў: "Я яго ўжо так участую, што век папамятае!"

Вярнуўшыся дамоў, зарэзаў тлустага барана.

У дамоўлены дзень Сакрат Яновіч ужо стукаў у дзеры гэтага агента імперыялізму. Яго хату пазнаў нюхам, надта ж несла ад яе пахамі капусты з баранінай.

Як кожны добры агент, не быў гэты гаспадар хамаваты, з бездакорнай культурнасцю прыняў ён Яновіча так, быццам дарагога чалавека, без якога свет — не севт, а жыццё — не жыццё! Уселіся яны зараз абодва за стол. Яновіч хапіўся за капусту з баранінай, бы грабаўляк за гарачыя піражкі. Упёр глыбокую міску, з цэлым гармонікам скабак удадатак. Задуманы сабатаж, значыць, адбываўся як трэба, Яновіч паеў усё, быццам за плечы закінуўшы. Яшчэ і лыжку аблізаў, і крышкі са стала пазбіраў, ды сабраўся дзякаваць ужо. І тут падыйшоў галоўны момант.

Наш рэакцыянер і сабатажнік залюлюкаў прыветна: "Што вы елі? Так і ад голаду можна памерці! Я вас не пушчу ад сябе, дарагі таварыш беларус. Вы ж гурткі ідзеце рабіць на ўвесь божы дзень і вечар выходзіце, і там, мусіць, ніхто і не дадумаецца даць паесці, дык я вас накармлю". І ён клікнуў жонку, каб несла з каморы збанец смятаны. Замест кампоту, кажа.

Так яно ўсё і адбылося, як задумана было ворагам беларускай рэвалюцыйнай справы. Сакрат Яновіч, па сваёй прыроднай давер-лівасці, анічога не прадчуў.

Выйшаў ён, участаваны на ўвесь дзень і да заўтра, каб далей множыць любыя яму гурткі. Ды так ужо нікуды і не дайшоў, жывот не дазволіў, вось. Праўда, адыйшоўся ён кавалак ад хутара агента імперыялізму, варочацца не было калі, ледзь дабег пад першы каля сцяжыны ядловец... За ім наш Сакрат Яновіч і пасядзеў з некаторай асалодаю. На кукішках, вядома. Трохі, як падбіты бандытаватымі паляўнічымі арол. Значыць растапыраўшыся. Нагубляўшы наўкола ад панікі арганізацыйных папераў, можна нават, і тайных... Адчуўшы, нарэшце, палёгку, пабегаў між кустамі за паперамі тымі і рушыў у дарогу. Але, праз якіх крокаў сто, ізноў давялося Сакрату бегма перціся пад куст. І так ён ужо ішоў, ад рання да вечара, як падлічыў пасля: адзін кіламетр праз пяць гадзін часу, г.зн. цэлую гадзіну дзвесце метраў прасоўваўся, а на працягу паўгадзіны — сто. Але ўпарта перабягаў наперад, ад куста да куста, і каб ніхто з

праходзячых дарогаю не згледзеў. Ну, быццам партызан які! Ды было тых кіламетраў да вёскі, у якой Яновіч намерыўся сагнаць у гурток свядомых беларусаў. Так ён і не сагнаў іх, дыверсія агента імперыялізму і антыбеларусізму закончылася поўнай удачаю.

Але да тае вёскі Яновіч, аднак даваλокся. Праўда, λедзь, стоячы і белы-белы на твары, і заікλівы ад знямогі. Тры дні праλяжаў у хаце солтыса. Імпэт з гурткамі, вядома, апаў. Ура-а! — ціха пакрыкваў агент.

Потым Яновіч перакінуўся з гурткоў БГКТ на пісанне кніжак. Першую назваў: "Загоны". Думаю, што не выпадкова, калі памятаць пра беларускую прымаўку: "А каб цябе на дзесяты загон пагнала!..." Затым напісаў Яновіч раман "Самасей". Думаю, што таксама не выпадкова. Прычакаў і высненага сацыяλізму. А яшчэ стаў членам вярхоўнага з вярхоўных суда БГКТ і надта рады, што няма яму каго судзіць. Усе лаяльна прызнаюць, што ўцалеўшыя дагэтуль гурткі Беларускага таварыства ён, пераважна, Сакрат Яновіч, парабіў быў калісьці і неяк зёваюць яны да нашых дзён на славу беларускай нацыянальнай меншасці ў ПНР. Шчасλівыя сярод нас і тыя, хто дабег да ягонай "Беларусі, Беларусі" і начытаўся яе, бы мёду наλізаўшыся. Даведаўся з яе не адзін я, што Піλсудскі быў цванікам ды абдурваў беларусаў, як хацелася яму і калі захацелася.

Шкада толькі, што амаль трыццаць гадоў ужо будзе, як Сакрат Яновіч (па-хатняму званы: Краце) перастаў смакаваць капусту. Праўда, ёсць у нас худое малако, але яно не дае такога эфекту... Непрыдатнае для сабатажу супроць Сакрата Яновіча.

1988 г.

## ЯК Я КАЧКУ КУПІЎ

Я ужо пісаў аб тым, як аднойчы купіў яйкі ў Махнатым, заплаціўшы за паўтара кілаграма, а яек было паўтара фунта. Ну, бо жанчына важыла на старадаўнім бязмене. Гаспадыня была вельмі кемлівая, бо, калі толькі я ўвайшоў у яе хату, адразу зразумела, што мае дачыненне з балдою. Зважыла шаснаццаць курыных яек і сказала, што гэта паўтара кілаграма. Я толькі цяпер магу сабе ўявіць, як яна рагатала, калі я пайшоў з хаты.

Мая жонка доўга мела аб чым расказваць сваім сяброўкам і чым мне дапячы, калі хацеў нечым пахваліцца, але з хаты не гнала.

Прайшло крыху часу, есці далей трэба. Пайшоў я на рынак па нейкую гуску ці качку, бо ў чарзе стаяць часу не хапае. Яновіч і так верашчыць на мяне, што я нічога не чытаю. Бо каб пісаць, гаворыць,

то найперш трэба чытаць. Я яму не веру, бо па-мойму, каб пісаць, то трэба думаць, а не чытанае "зрэзваць", але як яго пераканаеш, калі ён такім спосабам намахляваў ужо пятнаццаць кніжак?! Але, да справы.

Бачу, стаіць ля прылаўка жанчына, а ў яе паміж нагамі дрэмле белая качка, увапхнутая ў торбу з бульбай і булачкамі.

— Качку прадасце?

— Няўжо ж прынесла яе на паказ? Прадаю...

— Колькі цэніце?

— Ат, ужо апошняя, аддам танней.

— Ну, тады колькі?

— Ці я ведаю, колькі з вас узяць?

Хіба жанчына пашкадавала мяне, бо аніяк не магла вымавіць цану.

— Яна ў мяне яшчэ нясецца, але ж патрэбны грошы. Прадам, калі дасце больш, чым іншыя давалі, бо тут ужо прыцаняліся дзве жанчыны...

— Прадайце мне, бо не маю часу ў чэргах стаяць.

— Дзве.

— Што, дзве?

— Ну, за качку дзве!

— Штооо? А паўтары не ласка?

— Ого бачыце, які разумнік знайшоўся! Ужо 1800 давалі!

Думаю: "Буду таргавацца, мо за тысячу шэсцьсот аддасць". А тут раптам падыходзіць дзве жанчыны і даюць за качку 1900. Аднак "зычлівая" прадаўшчыца гаворыць ім, што я быў першы.

— Які ён першы, што тут чарга?!

— Не гарлапань, баба, бо той пан быў першы!

— Мяне так знервавалі тыя спекулянткі, што аж глотку заткала. Адлічыў я тысячу дзевяцьсот пяцьдзесят і рады, што жанчына зга-джаецца, папрасіў, каб качку загарнула ў газету. Калі ж я азірнуўся, то ўбачыў, што жанчыны дружна рагаталі." Ну і добра, што хаця не пабіліся з-за мяне", — уцешыўся я і, трымаючы праз газету за тое ме-сца, адкуль магло б выскачыць яйка, чым хутчэй пачыкіндаў дадому.

Пад блокам спахапіўся, што не маю ключа ад склепу. Пакінуў качку ля дзвярэй, а сам паплёўся наверх за ключом. Бягу ўжо па лесвіцы ўніз, а насупраць — суседка і гаворыць: "Ці вы не ведаеце, хто гэта прывалок мне пад дзверы падаль?"

— Якую падаль?

— Нібы качку, але яна ўжо сіняя.

Думаю: "Пляці, пляці баба, а я буду мець яйкі і мяса".

Пахваліўся жонцы, што ў нядзелю будзе есці абед, якога не спадзяецца.

— Ну, ужо зноў хіба кальмараў накупіў?! Сам будзеш смажыць і есці, а я з хаты сыду.

— Кальмараў, кальмараў... я качку купіў, во!

— На рынку дачакалася цябе качка? Бадай ніхто ўжо яе не хацеў!

— Ага, на рынку, і то белую!

— А не апошнюю ўзяў?

"Адкуль жа тая чараўніца ўсё ведае" — падумаў я, але сказаў:

— Не, не апошнюю, яшчэ адна асталася.

— Ну, дык сёння трэба зарэзаць.

— Не сёння, бо мо яшчэ знясецца.

— Прынясі — патрабавала жонка, — я пабачу, што ты там купіў, а калі захочаш патрымаць, каб неслася, то можна патрымаць і на балконе.

Сыйшоў я ў склеп... загарнуў качку ў газету і занёс у сметнік, а жонцы сказаў, што ўкралі.

Паверыла, бо мужу верыць трэба, а як жэ.

1988 г.

## ЯК ЛЮДЗІ РОБЯЦЦА ГЕРОЯМІ

Калісьці мне давялося быць у гасцях, але без гарэлкі і пачастунку, бо гэта быў сход збавідоўцаў. Адзін збавідовец з Дубіцкай гміны забраў голас і расказаў прысутным (збавідоўцам), як ён у трыццаць дзевятым годзе ваяваў у Варшаве:

— Браткі, — гаварыў ён, — каб вы ведалі, што рабілася ў Варшаве, то яшчэ сёння пускалі б у ганавіцы са страху. Там немцы так бамбардавалі, такі быў гук і рык, што хоць прайшло сорак пяць год ад таго часу, а я ўсё яшчэ лекочу.[1]

Збавідоўцы слухалі і ніхто не смяяўся, а гэта значыць, што яму спачувалі, або мне, прадстаўніку Ваяводскага праўлення Саюза барацьбітоў за свабоду і дэмакратыю, хацелі паказаць, якія то героі ёсць сярод нас, а ўлады пра іх не дбаюць!

Пасля я даведаўся, што наш "герой" быў у Варшаве ўсяго тры дні. Вядома, што хапіла б часу, каб паспець пакласці галавой або быць параненым. Але каб пасля трох дзён дрыжэць сорак пяць год, а мо ён дрыжыць яшчэ да сёння, гэта звычайная мука. Я ўзяў ды й

---

[1] Лекочу — дрыжу

хуценька падлічыў: калі чалавек дрыжыць сорак пяць год па трох днях страху, то яму выпадае пятнаццаць гадоў на дзень, І, калі б абаронцы Варшавы былі такімі "героямі", як наш, то дрыжэлі б чатырыста дваццаць гадоў, а ленінградцы — трынаццаць тысяч пяцьсот. Гэта значыць, што дрыжэла б дзвесце дваццаць пяць пакаленняў рускіх. Радзіліся б пакаленні, дрыжэлі б і ніхто не ведаў бы, чаму...

1983 г.

## ДУРАНЬ

*(РЭФЛЕКСІЯ)*

Навошта крычаць на дурнога, што ён дурань, ці ж ён гэтага хацеў?

Вінаваты бацькі і прырода, што дурань дурнем астаецца. Ён напэўна хацеў бы быць разумным, але прырода дала яму замала шэрых клетак, або з часам і тое, чым скупа надзяліла, калі пускала такога на свет адабрала. А што зрабілі бацькі, каб увесці ў рух хаця б тыя шэрыя клеткі, якія яшчэ асталіся? Нічога! — і дурань дурнем астаецца.

Але што б аб дурнях разумныя не гаварылі, то і так добры дурань з'яўляецца лепшым чалавекам ад дрэннага разумнага, бо:

— не ведае, як кагосьці абдурыць;

— не ведае, як камусьці "свінню" падлажыць (калі ведае, гэта ўжо не дурань);

— не ведае, які на каго пусціць паклёп, каб яго жыццё зрабіць нязносным;

— не выдумаў ніякіх сродкаў дзеля няшчасця сваіх блізкіх і дезля прыгажосці свайго жыцця, якое атрымаў ад Прыроды.

Гэта ўсё выдумалі і зрабілі людзі разумныя. Гэта разумныя, але дрэнныя людзі наводзяць на іншых людзей жах сваімі" "абяцанкамі" знішчэння ўсяго жывога на працягу паўгадзіны.

Вывад: лайце, ненавідзьце і праклінайце дрэнных разумнікаў, а не дурняў, якія нічога нікому кепскага не зрабілі!

Невядома, колькі аддаў бы нават жыцця бедны дурань, каб быць карысным, разумным чалавекам, але ж нічога не можа зрабіць, бо не мае такога розуму, як іншыя.

Суцяшае адно свет не загіне па волі дурняў, ён загіне "дзякуючы" разумным.

1988 г.

## А МНЕ ТОЛЬКІ ЦЕШЫЦЦА

Цяпер такі час настаў, што народ зрабіўся чагосьці злос-ны, неабачлівы. У вачах замест дружалюбнай усмешкі бачыш агонь нянавісці. А як трэба падбіраць словы і гладка ілгаць каб, напрыклад, даведацца ў магазіне, ці заўтра будзе ўчарашні хлеб. А найгорш з інтэлігентамі. Яны ніколі іншых не любілі, а цяпер то і гаварыць няма аб чым. Калі так на іх глядзіш і на іх паводзіны, то бачыш маленькіх чалавечкаў, хаця і адукаваных. Бяда толькі, што ім гэтага ніхто не вытыкае, бо самі яны сябе бачаць прыстойнымі і разумнымі.

Чым жа тут цешыцца? А вось чым. Калі я такім поглядам падзяліўся з сябрам, той адказаў: "Цешся, што яшчэ не б'юць". Ну, то і цешуся. Хаця раз ужо далі.

У гэты момант прыпомнілася мне яшчэ іншыя здарэнні, якія павінны мяне радаваць.

Рыхтаваў я сваё 50-годдзе. Жонка купіла 30 кг адборнага вінаграду і паставіла на віно, а я паехаў у Грабавец купіць вепрука. Коля Масальскі мне яго закалоў, а яго жонка Валя (я таксама памагаў) нарабіла каўбас і ўсялякіх ласункаў. Смажанае, варанае і вэнджанае запакавалі ў чамаданы, а Грыша Беразняк завёз мяне на чыгуначну станцыю ў Кляшчэлі. Прывёз мяса дамоў і схаваў у склеп, бо кватэру канчалі аднаўляць.

На другі дзень я не знайшоў у склепе не толькі мяса і віна, але зладзеі не пакінулі афіцэрскага кажуха, доўгіх рыбацкіх ботаў, карнізаў, шмат іншага дабра і нават сякеры. Міліцыянеры сказалі: "Цешцеся, што жывеце". Ну, то я цешыўся. Яшчэ больш меў радасці тады, калі атрымаў тры тысячы адшкадавання. Калі другі раз зладзеі залезлі ў склеп і абчысцілі яго са слоікаў, турыстычнай газавай печкі і віна, то міліцыя ўжо не паявілася. Цешыўся я адзін з жонкай.

У 1987 годзе прыехаў з Гданьска зяць і паставіў машыну нанач у мой гараж. На другі дзень не знайшоў у машыне акумулятара. Паплёўся я ў міліцыю, там спісалі пратакол і параілі мне цешыцца, што самаход астаўся.

Цяпер зноў уламаліся ў новы, толькі што пастаўлены гараж і забралі новенькі веласіпед, тры каністры бензіны. Прыехалі міліцыянеры, сышліся суседзі і таксама раілі мне цешыцца, што самаход цэлы і колы ёсць.

Бачыце, як бывае ў жыцці? Адно толькі цешыцца ды цешыцца выпадае. Ну, дык я так і раблю. 1989 г.

## ГРАБАЎЛЯНЕ Ў ВАРШАВЕ

Ніхто не можа запярэчыць, а хто не ведае — няхай даведаецца, што "Еўрапейскую" гасцініцу ў Варшаве будавалі нашыя грабаўлякі, як і жыхары такіх вёсак, як Чэхі-Арлянскія, Елянка, Курашава, Дабрывада і іншыя, цяпер ужо вядомыя вёскі, бо ляжаць вакол Дубічаў Царкоўных.

Нашы хлопцы пасля вайны вырашылі дапамагчы дзяржаве адбудаваць гасцініцу сусветнага значэння, а сабе падзарабіць крыху грошай. Сядзелі ў Варшаве не толькі месяцамі, але цэлымі гадамі, а гаспадаркі абраблялі жонкі і хто там астаўся. Не адной жонцы бокам выходзіла гаспадараванне, але заўсёды мела надзею на даплыў свежага граша і мучылася адзінока.

Аж прыйшла хвіліна адчаю, калі цётка Манька далей не магла вытрываць без мужа. Адважылася паехаць у Варшаву завезці мужу смятаны, масла і кавалак кумпяка.

Калі цягнік затрымаўся на Віленскім вакзале, пані Маня выйшла з вагона з кошыкам ад бульбы ў руцэ (у ім найвыгадней яйкі вазіць, не паб'юцца так хутка), здзівілася вялікай колькасці людзей на пероне. Падумала "Якосьці польскае свята". Падыйшла да першага мужчыны.

— Дзе тут працуюць грабаўлякі?

— Слухам пані, о цо пані ходзі?

— Як то, вы не ведаеце, па якому я гавару? Я вас як чалавека пытаю, дзе тут працуюць нашы грабаўлякі?

— Я пані не розумем, пані хыба пшыехала зэ всходу?

— А няўжо ж з захаду, пэўна, што з усходу.

— То ніц дзівнэго, жэ пані, не потрафі мувіць по польску...

— То вы не ведаеце польскай мовы, а не я. Я валодаю чысцюткай польскай мовай, як усе з Грабаўца. А цяпер скажыце, куды мне ісці да мужа, яго Дмытром завуць?

— Я направдэ не вем, о цо пані ходзі, і кого пані шука.

— То мо вы і не знаеце Ваські Мазурыкавага? У нас яго ўсе знаюць, бо ён ёсць ахвіцэрам, я яго бачыла, як на ўрлёп прыязджаў.

— Цо мі ту пані оповяда? Які Васька, які Мазур? Ту Варшава, а не якась Піпідувка!

— О, го, го. Ну і разумак. У нас у дубіцкай царкве збіраюцца людзі з... зара, зара: Грабавец, Рутка, Тафілаўцы, Дубічы, Чэхі, Елянка... з шасці або і болей вёсак, і то ўсіх ведаю, а ён, альфабэт, адной Варшавы не ведае. Але што аб ім гаварыць, калі ён аднаго на

цэлы Грабавец ахвіцэра не ведае? Якісьці прахадзімец. А мо вы з Орлі? — Не, я з Зялёнкі.

— То й тут Елянка ёсць? Бачыце, а вы ніяк не здолееце навучыцца сваёй мовы, фэ...

Далейшую гутарку з варшавянінам перапыніла Манька, убачыўшы на пероне Трахіма.

— Трахім, што ты тут робіш?

— На піва прыйшоў.

— А дзе мой Дмыцёр?

— Зараз, нап'юся піва, то пойдзем. Мы ўсе там на Кракаўскім Пшэдмесці готэль будуем для Варшавы.

Чалавек з Зялёнкі вырачыў вочы:

— Сконд ту тыле рускув?

1990 г.

## КАЛІ ДУМАЕ СЭРЦА

Праз апошнія сорак пяць гадоў здавалася мне, што няма ў свеце больш дружалюбных краін, чым Польшча і Савецкі Саюз. Так было прынамсі на дзяржаўна-партыйным узроўні і ў афіцыйнай прапагандзе. Зараз сітуацыя дыяметральна адмянілася. У запале нармалізацыі польска-савецкіх адносін і адфальшоўвання навейшай гісторыі крытыкуецца літаральна ўсё, што пахне "саветамі".

Ад нядаўняга часу аб'ектам такой крытыкі ў сродках масавай інфармацыі стаў савецкі падарунак польскаму народу — Палац культуры і навукі ў Варшаве. Калі я гэта чую, дык са злосці хочацца біць па мордзе першага лепшага прахожага, хаця ён Богу душу вінаваты. А найбольшую прэтэнзію маю я да кіраўнікоў Савецкага Саюза за тое, што не думалі галовамі, а сэрцам, і за тое, што выконваючы "інтэрнацыянальный долг" дбалі пра іншых, а не пра свой народ.

Тут справа не толькі ў Палацы, які Сталін падарыў "братняму польскаму народу" як доказ "сімпатыі і вечнай дружбы". Справа ў тым, што зараз вакол Палаца робяць палітыку ўжо і не такую брацкую, а наадварот, накіраваную супроць Савецкага Саюза. Польскае грамадства, нават яго частка, нескажоная антысавецкасцю, пачынае верыць сённяшнім прапагандыстам, што гэты аб'ект сапраўды нічога добрага Польшчы не прынёс.

Ці гэта праўда? На маю думку, не!

Калі быў падпісаны дагавор аб пабудове Палаца культуры і Навукі, савецкія ўлады вырашылі перш за ўсё пабудаваць у разбуранай Варшаве пасёлак для сваіх рабочых. Такім чынам, на Ялёнках за

савецкія грошы, машынамі і рукамі савецкіх рабочых узведзены былі жылыя дамы, сталовыя, крамы, кіно, бібліятэкі, святліцы.

"Саветы" пабудавалі Палац і паехалі дамоў, пакінуўшы ў Варшаве сваю працу, пот і сэрца. У пасёлку Ялёнкі размясціліся студэнты.

Палац культуры і навукі выкарыстоўваецца згодна з яго прызначэннем. У ім аднак толькі канферэнцыйных залаў трынаццаць, басейн, кінатэатры, музей тэхнікі, рэдакцыя, многія інстытуты Польскай акадэміі навук і гэтак далей. Усіх устаноў, якія тут размясціліся, я не ў стане пералічыць. Аднаго толькі не хапае — удзячнасці. Але ці ж гэта навіна? У час другой сусветнай вайны, калі Варшаву вызвалілі савецкія войскі, праз нашую Чаромху ішлі цягнікі з вагонамі, загружанымі пшаніцай. Калі я запытаў савецкага вартавога, куды вязуць гэтую пшаніцу, той са злосцю адказаў:

— Ваших надо выкормить, а свои пусть подыхают от голода.

А адбудова мастоў і дарог, размінаванне гарадоў?.. Аб гэтым зараз усе маўчаць, быццам вады ў рот набраўшы.

## МАЯ ПРАПАНОВА

Нядаўна з тэлэвізійнай паліцыйнай хронікі я даведаўся, што на сто дарожна-транспартных выпадкаў аж семдзесят выклікаюць жанчыны, якія не прытрымоўваюцца правілаў дарожнага руху. Я гэта ўспрыняў з жахам, бо хто з нас, мужчын, ведае, што недзе на скрыжаванні дарог трапіцца нам жанчына, якую трэба абавязкова прапусціць, хаця паводле правілаў мы павінны ехаць, бо чырвоны светафор перад носам жанчыны-вадзіцеля. Жанчына з-за сваёй упартасці і пачуцця перавагі над мужчынамі ведае, што яна каралева не толькі ў хатніх умовах, але і на шашы. Таму іменна вымушае першынства пераезду, нягледзячы на тое, што яе на шафёрскіх курсах вучылі інакш.

Каб не ўваходзіць нам, джэнтльменам у канфлікт з прыгажунямі за рулём, прапаную ўвесці наступную папраўку ў правілы дарожнага руху: кожны самаход, якім кіруе жанчына, павінен быць пазначаны вялікімі літарамі "К" (як кабета). Літара павінна быць чырвонага колеру на белым фоне, і падсветленая лямпачкай увечары. Тады брыдкая палавіна шафёраў ведае, што такі самаход абавя зкова трэба прапусціць не толькі дзеля ветлівасці, але і для свайго дабра. Няхай будзе яшчэ адна перамога жанчын, але затое будзе менш трупаў.

1990 г.

## ЧАРГОВЫ ПАДАРУНАК СВЕТУ

Я ўжо зрабіў столькі вынаходстваў на карысць чалавецтва, што і сам іх усіх не памятаю. Але адно хачу чытачам прыпомніць, бо сённяшняя моладзь гатова не паверыць у маю вынаходлівасць, а старыя, хоць і карыстаюцца маімі вынаходствамі, не кваляцца пахваліць мяне за гэта. Скажу пра справу, якая аказалася вельмі карыснай для лысых. У выніку майго адкрыцця лысеючыя пераставалі лысець, а ў тых, хто ўжо паспеў вылысець, пачалі адрастаць густыя чупрыны, прыгажэйшыя, чым раней.

Сённяшняе маё вынаходства нікому не павінна быць абыякавым, бо яно датычыць кожнага чалавека, нягледзячы на стан, пол, арганізацыйную і рэлігійную прыналежнасць, адукаванасць і неадукаванасць, колер скуры ці ўзрост. Чым хачу пахваліцца? А тым, што я сваім пачуццём абавязковасці перад чалавецтвам, сваёй упартасцю ў імкненні служыць грамадству, не запрапаную ніякіх матэрыяльных вынаходстваў, а толькі хачу падарыць свету ідэю, якая назаўсёды пакончыць з войнамі. А калі нават і не, то кожная чарговая вайна будзе не страшнейшая, чым самая благая вайна ў гісторыі нашай планеты.

Паспрабуйце падумаць так, як я. Дагэтуль на вайну, якую заўсёды выклікалі старэйшыя з-за сваіх эгаістычных матываў, прэстыжнасці і агрэсіўнасці пасылалі зусім маладых людзей, так патрэбных у гаспадарцы, якія не паспелі яшчэ нацешыцца жыццём, залажыць сям'ю. Адным словам, выкарыстоўвалі маладых, здаровых людзей, якія сваю сілу трацілі на забіванне іншых людзей, на паленне і разбурэнне чужых вёсак і гарадоў. Руйнавалі жыццё сабе і іншым. Пакідалі свае вёскі і гарады, ды ў няшчасці сваіх бацькоў. А я прапаную вось такую ідэю: ва ўсіх канстытуцыях свету трэба адпаведна змяніць той артыкул, які гаворыць, што кожны грамадзянін абавязаны служыць у арміі. Зараз мабілізацыі падлягаюць людзі ва ўзросце ад васемнаццаці да шэсцідзесяці пяці гадоў. А гэта значыць, што асноўная маса маладых хлопцаў, а нярэдка і дзяўчат, могуць загінуць на вайне. Беручы пад увагу грамадскую прыдатнасці маладога і старога чалавека, прапаную ў час вайны пасылаць на фронт мужчын ва ўзросце звыш шасцідзесяціпяці гадоў. Нават да ста, калі будуць магчы хадзіць.

Якія карысці выцякаюць з маёй ідэі? А вось такія: маладыя, якім хочацца жыць і тварыць, застануцца прадаўжаць жыццё. А старыя не будуць выдумваць войнаў, бо ім на іх не захочацца ісці, а калі прыдумаюць, то самі пойдуць біцца і тады:

— не пакінуць няшчасных бацькоў (бо рэдка хто іх будзе мець, а калі і так, то ўжо такіх старых, што не будуць ведаць, у чым справа),

— не трэба будзе плаціць пенсіяў,

— не будуць патрэбны дамы для састарэлых, прытулкі,

— менш трэба будзе месц у шпіталях (там пераважна ляжаць старыя),

— сем'і не будуць клапаціцца аб пахаванні бацькі ці дзеда (іх пахаваюць на кошт войска і то ў невядомым месцы, каб не даглядаць магілы і не насіць кветак).

Дзякуючы маёй ідэі грамадства будзе заўсёды маладым і не давядзецца яму мець лішніх клопатаў са старымі, бо яны пазабіваюцца ваюючы. Не, не. Не спяшайцеся асуждаць мяне. Па-першае, я не супроць старых, але маладых мне вельмі шкада. Па-другое, вайны ніколі б не было, каб народы паслухалі маёй навукі, бо маладыя не хочуць ваяваць, а старыя чым старэйшыя, тым больш баяцца. Тым, хто паверыць у маю ідэю, і тым, хто не паверыць, жадаю мірнага жыцця.

1990 г.

## КАЛІ ЛЕПШ

Усе, хто жыў у Беластоку ў саракавых і пяцідзесятых гадах і абаграваў кватэру печамі, памятаюць дырэктара склада з апалам Зыберблата. Старэйшыя людзі памятаюць таксама, што пры ім не было клопатаў з вугалем, а ён сам стараўся, каб нават дроў на падпалку ўсім хапіла. Гандляр і дырэктар з яго быў выдатны.

Аднойчы дырэктар разгубіўся (а можа і не?) і памыліўся ў рахунках на сваю карысць. Вестка дайшла ў міліцыю. Выклікалі Зыберблата ў Ваяводскае праўленне на допыт. Ужо пасля падпісання пратакола афіцэр, які быў перакананы, што ў сацыялізме ўсім жывецца лепш, запытаў:

— Скажыце, грамадзянін Зыберблат, але толькі шчыра, гэта не будзе запісана ў пратакол, калі вам лепш жылося — пры санацыі, ці цяпер?

— Вы следчы афіцэр ці правакатар?! — выкрыкнуў Зыберблат.

— Народная ўлада дала вам пасаду, а вы хочаце яе кампраметаваць у вачах грамадства! Я, пане афіцэр, пры народнай уладзе зарабляю аж тры з паловай тысячы злотых, а пры санацыі зарабляў усяго тры!

Сказаўшы гэта, Зыберблат іранічна ўсміхнуўся, устаў з крэсла і пакінуў пакой следчага.

1991 г.

## ЯК Я КАЛГАС АРГАНІЗАВАЦЬ ПАМАГАЎ

За выдатную службу ў арміі мяне ўзнагародзілі паездкай на Пазнанскую ярмарку. Экскурсія трывала 13 дзён і як на 1948 год было вельмі добра, бо адпачыў ад амаль штодзённых алярмаў і безупынных ды бескарысных заняткаў вайсковае службы.

Вярнуўся з ярмаркі ў штаб батальёна ў Санок, адзін афіцэр запытаў у мяне: "Калі ты, недаступная разява, паедзеш у водпуск?" Ён, мусіць, не ведаў, што я толькі што вярнуўся з экскурсіі. Я згадзіўся ехаць нават і сёння. Аформіўшы патрэбныя дакументы, я хутчэй памыўся, пераапрануўся і гайда на вакзал. У дарозе, памятаю, ля мястэчка Майдан нехта затрымаў цягнік. Калі я выглянуў праз акно, нейкі цывіль, з аўтаматам павярнуўся да мяне і крыкнуў: "Схавай морду, ты, сталінскі прыслужнік, бо так і зляціць!" А я яму на гэта: "Пацалуй ты мяне ў с..., бандыт!", і сеў на сваё месца, бо людзі прымусілі. Праз нейкую хвіліну зайшло ў вагон трох мужчын з аўтаматамі і спыталі, каго маюць у с... цалаваць. Якасьці жанчына паказала на мяне. Падыйшлі, наляскалі па мордзе, павалілі, наштурхалі ботамі ды пайшлі. Я цешуся, што не забралі мяне з сабою і пакінулі афіцэрскую сумку. Дакументы і пісталет узяў у мяне раней нейкі чалавек, які сядзеў у тым самым купэ. Ён ведаў, што будзе. Акazалася, што "лясныя" спяшаліся, забралі з цягніка грошы і падаліся ў лес. Цягнік весела паімчаўся ў Люблін. Там "хуткая дапамога" абмыла мяне, забінтавала і так я паехаў у родную старонку. У нядзелю ў Грабаўцы адбываўся нейкі сялянскі сход. Перад тым прыйшоў да мяне Паўлюсёк і кажа: Васька, прыдзі сёння на сход і памажы мне падмовіць, або прымусіць гэтае кулаччо арганізаваць калгас. Я згадзіўся, бо падумаў, што гэта будзе прасцей прасцейшага. Я ж чуў, што сяляне ў чэргах стаяць і просяць, каб іх у калгас прынялі.

Людзі, замест у царкву, прыйшлі на сход, бо цікавіліся, што там скажуць, а з другога боку баяліся, што калі не пойдуць на сход, то Паўлюсёк можа недзе нешта на каго падказаць. Згодна з дамовай, зайшоў і я.

Святліца была поўна, людзі сядзелі хто на чым мог і як мог. Сход вёў Паўлюсёк. Сяляне паглядалі на мяне, паабіванага, з сінякамі, ды ўсміхаліся ні то з сімпатыяй, ні то думалі: "Ага, дастаў пан капрал!" А я сядзеў і ўважна слухаў, што гаворыць старшыня сходу і меркаваў, што мне сказаць. Паўлюсёк то падмаўляў, то пакрыкваў, каб пісаліся ў калгас, а тыя шасці-васьмі гектарныя кулакі маўчаць і ўсё. Тады Паўлік не вытрымаў і крыкнуў: "Зараз пабачым, як вы заспяваеце, калі прамовіць да вас наш зямляк, пакалечаны, пасінячаны капрал

Васька! Вы не думайце, што яму два лычкі далі дарма! Калі наш хлапец у такім мундзіры, то вядома, што ўжо не з адной печы хлеб еў. Ён, брат ты мой, ужо два гады ўмацоўвае нашу, савецкую ўладу, а вы ж яму памагаеце? Вы слухаеце ворагаў нашай дэмакратыі і гатовы прадаць сваю родную ўладу, каб толькі не пайсці ў калгас, ды не ўзбагаціць нашае гасударава". Хтосьці перабіў Паўлюська і крыкнуў: "Паўлюсь якая ж то твая ўлада, якое тваё гасударава? Гэта ж усё польскае!" "Але-е-е!" — адазваліся галасы. Паўлюсь сказаў: "Васька, бяры голас і дуй!"

Я падыйшоў да стала і, водзячы па прысутных марсавым поглядам, таксама крыкнуў: "Прызнайцеся, хто з вас хоча вайны?!" — і ваджу вачыма па зале. Адны пабялелі чамусь, а другія чамусь пачырванелі. Хто іх зразумее? Але ўсе далей маўчаць. Давай я тады на сваёй гаворцы: "Вы думаетэ, шчо імперыялізм амэрыканскі спыт і нычого нэ робыт, коб довэсты до третеі світовоі вуйны?! Побачтэ, ужэ на Белосточчыні штыры рокі тому, як настала наша роботнычо-хлопська власьць, а бандыты шчэ ходят! Чого воны ходят? Воны поховаліся в лес і ждут, колі то до нас прыдут амэрыканці. Тогды выдут з леса і всех вас як нэ выб'ют, то поробят парубкамы, рабамы. Наша народная власьць дала ўсым можлівосьці учытысь, працёваты, дэ оно хто хочэ... Побачтэ на мэнэ. Я ж пэрэд вуойною аны разу нэ був у школі, а тэпэр кончыў пудофіцэрку і стаў капралём. Хто з вас, служывшых і войську пэрэд вуйною, добывся капраля, га?

У зале стала ціха. "А калі так, дык, значыць, будуць пытанні", — падумаў я на вайсковы манер і крыкнуў: "Пытаня будут?!" Чырвоныя пабялелі, а белыя пачырванелі і не задаюць аніякіх пытанняў. Тады я да Паўлюська: "Дядьку Павол, трэба здобыты лісту і нэхай кажны пудходыт, будэм пысаты." Але Паўлюсёк пры сабе не меў ніякай паперы, бо і адкуль яна ў яго, і запрапанаваў: "Няхай падымуць рукі хто ўступае ў колхоз, а ўзаўтра спышэмо..."

У той момант устаў з месца Адамішын Хведар і кажа: "Браткі, я нэ знаю, як ветэ, але я, як почув Ваську і подывывся на ёго, шчо з ёго вырosло, то ныхай будэ шчо хочэ, але я пэршы пышусь в колхоз і обіцяю, шчо буду працёваты ў ёму з целого сэрца!"

Хведар сеў, а ўстаў Паўлюсёк і, павёўшы па зале вачыма, сказаў: "Ну, хлопці, пэршого охвотныка маемо, хто будэ другі?" Але хлопцы як сядзелі, так сядзяць. "То шчо, больш ныкого дзісь нэ будэ?" — запытаў зноў Паўлюсёк. Хтосьці крыкнуў: "Павол на дзісь хватыт, бо трэба ж Іты на обед, а заўтра побачым."

Павал устаў з-за стала і сказаў: "О, ужэ зголодыэў? Ідыэтэ к чортовуй матэры на обед, бо шчэ поздыхаетэ з голоду." Народ высыпаўся,

нібы з мяшка, і чым хутчэй падаўся дамоў. Паўлюсёк кажа: "Бачыш кулаччо, аны одын кроме Хвэдора нэ запысався". "А чом воны так боящца того колхозу?" — запытаў я ў яго. "А халера іх ведае. Але я думаю, шчо мы кепсько агітовалі, — сумна канстатаваў солтыс, — тобе мова ішла добрэ, але трэба було яе пудпэрты, выложывшы на стол пыстолет. Знаеш нашы людэ, як нэ чуют над собою быча, то ныкого нэ боящца. А як зобачылі б, што пыстолет звэрнуты в іх бок, то так пысаліся б, шчо одын на другого лез бы..."

— Э, дядьку Павол, так мне нэ можна, бо за тое карают...

— То мать іх туды, колі такіх як ты карают за тое, шчо хочут државе добра. То ныхай прыїжджают і самы закладают тыі колхозы. Як ты з пыстолетом оно одного пудмовыв, то шчо я могу зробыты бэз пыстолета?

Падалі мы адзін другому рукі і разышліся без чаркі. Але, за кару, Грабавец па сённяшні дзень астаецца без калгаса. Добра ім так!

1991 г.

## БРАТЫ ГАВОРКАВЫ

У пачатковых гадах нашага XX стагоддзя, у Елянцы жыла сям'я Гаворкавых. Было у ёй чатыры сыны: Міхась, Марцін, Цімафей і Якаў. Гэта былі хлопцы нагулаватыя адчаюгі, жылі яны вельмі дружна, калі трэба было напіцца чужой гарэлкі, або кагосьці адлупцаваць, — стаялі мурам адзін за адным. Але калі камусьці з іх рабілася крыўда у якогасцы іншага поваду, чым бойка з сябрамі, то ўжо спагады не было. Упаў з каня і пабіўся — твая справа, прабіў цьвіком ногу, таксама нікога гэта не балела, не ратавалі апошнія. Назаўтра другому штосьці сталася то ўчарашні гаварыў: "Я цярпеў, то цярпі і ты, чаго плачаш?"

Вось адзін дзіўны выпадак, які быццам бы выняты з казкі, а ён ім здарыўся ў самай справе. Трэба яшчэ дадаць, што сярод тых чатырох братоў была захавана цесная іерархія; найстарэйшы ўсімі камандаваў, прыказваў, вымагаў, лупцаваў і сабе браў найбольш. Меншыя маглі плакаць ад крыўд, але важаты аставаўся, хоць помста заўсёды была прадбачана і то помста бязлітасная ўсіх супраць усіх.

Браты вельмі любілі гойдацца на адной выбранай імі вольсі, якая была пахілянай. А як людзі гавораць, што на пахілае дрэва то і козы скачуць. Кожнага дня залазілі на яе, але захоўваючы старшэнства і нічога не баяўшыся, што могуць пападаць, гойдалі бедную ольху аж карэнне трышчэла. Аднойчы здарылася... Пабачым, што здарылася пазней, а цяпер пагляньма, як яны тарабанілі на дрэва. Крыху

малодшы, за найстарэйшага Міхася, Марцін паспрабаваў першы ўлезці на дрэва але зараз той яго сцягнуў і хляснуў па мордзе за парушэнне парадку, ды сам палез найвышэй, за ім іменна Марцін, за Марцінам Цімафей, а наймалодшы Якаў завіснуў пад нагамі Цімафея і так верашчаўшы гойдаліся.

Сядзеўшы найніжэй Якаў чагосьці пагляпуў уніз і ўбачыў, што па дрэве ў верх паўзе вуж. Заверашчаў і саскочыў з дрэва. Цімафей, які не ведаў у чым справа запытаў: "Чаму ты саскочыў з дрэва!?" А Якаў з зямлі: "Ты таксама зараз сасакочыш, або вуж цябе ўкусіць!" Цімафей вырачыў вочы са страху і пачаў прасіць Якава, каб той забіў вужаку, бо яна яго ўкусіць. А Якаў адказаў: "Я скакаў, то й ты скачы". Цімафей саскочыў і звіхнуў нагу, плакаў з болю, але праз слёзы хіхатаў бачачы, як старэйшы і найстарэйшы ўбачыўшы вужа верашчалі, просячы каб тыя, што на зямлі забілі вужа, або хоць скінулі яго з дрэва, а той усё выжэй поўз. Тыя з зямлі гаварылі смяючыся: "Мы саскочылі, то і вы скачыце". Трэці, калі гупнуў з вышыні дрэва то аж застагнаў, але ўстаў на ногі і са смехам далучыўся да меншых. Найстарэйшы баяўся скакаць і вуж усё бліжэй язык паказваў. Прасіў братоў на мілы Бог, каб нешта рабілі дзеля ратавання яго а тыя дружна хіхаталі і раілі яму: "Скачы, як мы скакалі, бо калі не, то здохнеш ад вужа!". Апошняму нічога іншага не аставалася. Скочыў. Але гэты скок адпакутаваў трохмесячным ляжаннем у пасцелі.

Аб гэтым усім расказаў мне Васіль Сапёлка. Я толькі ад сябе дадам надта ўжо ва ўсім свеце знаную фразу, што чым вышэй сядзіш, тым ніжэй звалішся. А такіх сем'яў в Польшчы, як сям'я Гаворкавых было шмат за цара і за польскай паншчызны, калі вёскі былі перапоўненыя markedly розным, у тым і ненадта разумнымі спагадлівымі людзьмі. А ўжо напэўна неадукаванымі. Канклюзія сумная, але праўдзівая.

1993 г.

## З ЖЫЦЦЯ ЦВАНІКАЎ

Я браткі, дажыўся да таго што мой народ не ведае, як мяне называць і як да мяне звяртацца.

Калісьці, як я быў яшчэ малым (хаця дзіцём цяжка было мяне назваць), людзі ў вёсцы называлі мяне Васем і без ніякіх цырымоніі выкарыстоўвалі мяне. Калі, напрыклад трэба было камусьці пасеяць жыта, то ён не браў у дапамогу свайго сына, а пераступаў мяне на вуліцы і гаварыў: "Узаўтра раненька прыбягай да мяне, паедзем жыта

сеяць". Я зрываўся рана, каб барані Божа гаспадар не чакаў, уцякаў з дому і бег да яго, бо "ведаў", што дадуць павячэраць.

Усе ведалі, што могуць мяне паслаць куды хочаш і я не адкажуся, бо ўсё ж спадзяваўся, што накорміць. І вось, народ так да таго прывык, што і цяпер успрымаюць мяне за свайго парабка. Але ж не ведаюць, як мяне назваць: "Васіль", "Пане Васіль", ці проста "ты".

Прыкладаў магу вам сыпаць, як з рукава, але прывяду усяго некалькі, найбольш характэрыстычных нашай хітрасці рабіць з кагосьці дурнейшага, чым ён ёсць на самай справе.

1. Атрымаў я з Карыціскаў пісьмо ў якім кума майго сваяка, прасіла купіць свайму сыну месячны білет на аўтобус Ліст быў кароткі і станоўчы. Прыказ пачаў я выконваць зараз жа. Дзень патраціў на рэгістрацыю пасвядчэння, а другі — на пакупку білета. Але калі ўжо далез да касы, падумаў, што куплю білеты на ўсе чатыры месяцы да канца года. Купіў, адаслаў і... усё. Пасля некалькіх гадоў, калі ўжо сын гэтай пані закончыў ліцэй, ажаніўся і стаў вайскоўцам, я сустрэў яго на вяселлі у маёй хроснай дачкі (мне падказалі хто ён) і пачаў расказваць, як было з білетамі, ён вельмі смяяўся ды і толькі хаця сказаў, што ўсё разумее.

2. Глухая ноч. Зазвінеў званок у пярэдняй. Жонка дрыжыць са страху: "Што здарылася?" І ў мяне сэрца пад горлам ад хвалявання. Яна з таго ўсяго не можна знайсці шлафрока, хоць трымае яго ў руках, а я ваюю з піжамай, бо пераблытаў калошыны... а із званка іскры сыплюцца. Кінуў я піжаму і дабіег да дзвярэй у пачтанніках, каб ратаваць сітуацыю, бо суседзі абудзяцца і збягуцца... А тут бачу... Кірылачку з сынам.

— Што здарылася? — пытаю.

— А нічога такога — адказвае задавалены госць, — віп'ем паўлітроўку, пагаворым...

— Ну, калі ты ўжо ноччу едзеш у Беласток, — не паддаюся я, то хіба не таго, каб са мною выпіць гарэлку, у чым справа?

— Браточку, то ж мяне за лес у турму пасадзяць! Ратуй, я табе хоць цяля, хоць вепрука не пашкадую.

— Добра, едзь спакойна да дому, я пабачу, што змагу зрабіць, каб хутчэй пазбыцца непрошанага госця, бо святая ноч, а той думае што мяне гарэлкаю ушчасліваць.

Кірылачку не засудзілі, а мне слінка не перастае цячы ўжо некалькі год.

3. Раптоўны ломат у дзверы, бо я званок выключыў, гляджу: ля парога малады чалавек.

— Я шукаю Петручука.

— А хто вы такі?

— Я з Рудкі.

— А я — Петручук, заходзьце.

— О, браток, як то добра, што я знайшоў... Але не ведаў, як сказаць: "вас знайшоў", ці "сябе знайшоў". Бо скажы "ты" — можа абразіцца і не паможа, а "вы" гаварыць не хочацца, бо Грабавец з Руткай побач, а ён жа шафёр.

Сеў на крэсла і сказаў, чаго хоча: калі я здам экзамен на другую катэгорыю правоў, то дадуць мне грузавіка зіла, а я табе мяшок бульбы... Гэта мяне "укалола" і я запытаў: хто табе даў мой адрас?

— Іван.

— То я табе памагу, а твой Іван няхай не паказваецца мне на вочы.

Цяпер ужо ездзіць у Гайнаўцы аўтобусам, людзей возіць. А я ўсё чакаю на мяшок бульбы. Ужо пятнаццаць гадоў, а працэнты растуць.

4. 23 верасня 1988 года, раніцай пазваніў тэлефон. Жонка паднесла трубку і пачула: "Петручук дома?!" Тая хуценька перадала мне трубку і я чую замест "добры дзень": — "Петручук, давай хутчэй да Ваяводскай управы!

— А што сталася і хто гаворыць?

— Ты не пытай хто гаворыць, толькі на адной назе пры, дзе табе гавару!

— Божанькі, што там такое і чаго хтосьці ад мяне хоча?

— Я з Грабаўца! Сына майго ў армію бяруць і я хачу, каб ён служыў у Беластоку.

— Ага, але ж я там нямаю нікога знаёмага...

— Ага, то навошта ты мне патрэбны? — і палажыў трубку без развітання.

Гэта быў другі выпадак, які мяне не "нацягнуў" на выдаткі на працягу шматлікіх хадоў. Але з земляками трэба жыць дружна!

Я за іх фундаваў каньякі, плаціў грошы, чырванеў перад пракурорамі, выцягаў з арыштаў, афармляў школы, лекараў, пісаў просьбы... А яны мала што не звярнулі мне маіх выдаткаў, то яшчэ апляткавалі. Цяпер ужо маю спакой, бо ўсе на мяне гневаюцца.

## ОХ, І ГНАЎСЯ Я!

Па цэлым горадзе Калобжэг, дзе толькі магчыма, паразвешвалі каляровыя плакаты. Яны, гэтыя верасклівыя плакаты-рэкламы аб'яўлялі ўсім на свеце аб тым, што ў рэстаране "Барка" падаецца ежа з рыб, якую прыстаўляюць нямецкія кухары-спецыялісты!

"Народы спяшайце паспрабаваць страву з рыб, якая падаецца толькі у "Барцы", і прыгатоўлена толькі нямецкімі кухарамі-спецыялістамі. Калі нехта з вас спозніцца, будзе шкадаваць праз усё свае жыццё, што абмануў свой далікатны страўнік і не пазволіў вуснам паспрабаваць неба! Тым больш, што нямецкая кухня будзе вас гасцяваць толькі ад 22 да 28 чэрвеня 1978 года!

Такія рэкламы кідаліся людзям у вочы з усіх сценаў, платоў і слупаў горада. А вядома, што я належу да тых цікавых, якія лезуць туды, дзе магло б абыйсціся і без іх. Але такіх не забракавала і ў Калабжэгу. Гнаны авечым бегам ды неабвержанай цікавасцю, як смакуе нямецкая камбала (думаў, што яна пакрайняй меры пахне шынкай, альбо грудзінкай (пасунуў і я туды). Нясмела ўвайшоў да "Баркі", дзе адразу у мае вачаняты кінуўся агромны размераў невад на сцяне, а ў ім паўно рознае рыбы. Гэтыя экспанаты таксама засушаныя і прымацаваныя да сцяны, але ўсё роўна дае ашаламляючы эфект. Там і траска, там камбала і... піла з зубастым доўгім носам, шчупак, сум. Я адчуў сябе, бы ў акварыуме без вады. Бо і крэслы, на якіх людзі сядзяць даюць ураджанне такое, як быццам бы ўсе рыбы паказалі нам хвасты. Гавару вам, крэслы трышчаць уверх агромнымі рыбімі хвастамі ды ўсё апошняе таксама на марскі манер. Сеў я на адной з такіх "марскіх жывёлін" пастаўленых ля самых дзвярэй і пагладаю, як сярод столікаў снуюць афіцыянткі нібы марскія німфы, ды толькі лёгенька ўсміхаюцца да сваіх старых наведвальнікаў, якія п'юць "Полчын бір" пад фрыткі.

Я там чакаў толькі часу, колькі трэба, каб пачуць, што ўжо пад табою не гладкая дошка, а іголкі окуня, альбо іншае калючкі. Аднак урэшце прыплыўла і да мяне адна з багінь. Зляжыўшы губы ў трубку і гледзячы па над маёй галавой запытала:

— Слухаю.

— Прабачце, ці у вашым рэстаране абслугоўваюць усіх, ці толькі знаёмых?

— Усіх.

— Дзякуй. Што пані мне запрапануе з нямецкай кухні?

— Падам пану... Тут я не дачуў імя ежы і запытаў: "Што, што?"

— Марынэллю, паўтарыла багіня вымушанай ветлівасцю і чым хутчэй адыйшла, каб не пазволіць мне, нясмеламу апамятацца, што гэта такое, і каб, барані Божа, не падумаў марудзіць.

Пасля некалькіх хвілін, як бы здагадаўшыся, што мае дачыненне з карэспандэнтам "Нівы", прынесла відэльцы, а праз наступныя пару хвілін і самую марынэллю з фрыткамі. Устраміў я відэльцы ў гэтую марынэллю, а з яе выціснулася нешта падобнае да вантробы, якою

кормяць стронгаў у Чылічанцы перамалоўшы у мясарубцы. Паспрабаваў з несмакам а гэта нешта кіслае. Страх мяне агарнуў, але падумаў, што гэта ж прысмак і пачаў есці.

Але калі яшчэ чакаў пакуль прыплыве да мяне багінка-афіцыянтка, бачыў, як адзін чалавек еў нешта падобнае. І так гэта еў, як у нас адзін лянцяй, каб даўжэй у поле не ісці сярпом жыта жаці, мамляў гэты бедняга і ўсё толькі папіваў півам, каб якасьці загнаць гэтую "смакату" у страўнік, як калісьці я сам папіваў ваду, каб глытнуць зялёны, гнілы хлеб. Дык і я таксама еў аж спацеў ды толькі спад ілба азіраўся на бакі, ці хаця ніхто з мяне не смяецца. Гэтая марынэлла мела ў сабе надта многа нейкіх нітачак, жылачак, якія цягнуліся за відэльцам і не магчыма было іх адарваць. Я вырашыў, што гэтая марынэлла гэта толькі па іхняму, бо па нашаму гэта нічога іншага, як сам васьміног.

Пакінуў я гэты кіслы прысмак з запахам нейкага гнайняка і 57 злоты, бо толькі каштаваў. А сам заціснуўшы зубы, паімчаўся на кватэру (добра, што блізка!) быццам да пажару.

Ах, каб вы, даражэнькія паглядзелі, як я гнаўся дык не паверылі б, што гэта іменна я. Ледзь паспеў да прыбіральні. Тут выпусціў марынэллу назад да мора праз клаачную міску і цэлыя суткі нічога ў рот не ўзяў.

Так стары акула даўся злавіць на кручок "марынэллы", якую падсунула камбала ў выглядзе німфы.

**БАЛЛАДА**

Слухай родны Грабавец,
Як аднойчы я наеўся,
А пасля так "абарваў",
Што ледзь варушыўся.
Святам - раз — астаўся дома,
(Сябра пагнаў быдла);
Каб у мячык пагуляць,
Бо пасвіць вельмі збрыдла.
Але план гэта адно,
А жыццё — другое:
Не ў мазгах гульня тады,
Калі з'еў бы аж за трое.
Бацька з мачыхай наелісь,
(Пра мяне "забылі"),
Бо калі варылася,

Я пасвіў кабылу.
Калі ўжо вярнуўся з поля
І ўвайшоў дахаты,
Мачыха пайшла ў царкву,
Тато лёг "паадыхаты".
Не спытаў мяне ніхто,
Ці хачу снедаці.
Яны мелі свае дзеці,
Я не быў патрэбны ў хаці.
Мне зрабілась вельмі прыкра,
Сэрца ў грудзях плача:
"Я галодны, гэта праўда,
А хто выйграе — пабачым!"
Няхай мачыха адыйдзе,
Бацька разаспіцца,
Я тады зайду у камору
Ды й пачну жывіцца.
Там жа сала ёсць напэўна,
Хлеб учора печаны,
Калі добра наўпыхаюсь
Хопіць аж да вечара".
Выйшаўшы пацiху з хаты,
Кінуў вокам на камору.
Бачу: ключ "сядзіць" у дырцы.
"Эх, наемся да апоры!",
ачыніўшы гучна дзверы
Бацьку даў паняці,
Што пайшоў я да сяброў,
Маўляў: "можаш спаці".
Сам зайшоўшы ў сад пад грушу,
Ды й стаў меркаваці,
Як залезці да каморы,
Каб тата не "злякаці?"
Меркаваў я меркаваў,
І падумаў так:
"Не ісці жа мне праз сені,
А вярхом, цераз чардак"
Цяжка будзе мне прабрацца
Над стайняй кабылы...
Праўда, там ляжыць шаста,
Але можна ўпасці на рыла.

Калі яна зломіцца,
Што ж з гэтага будзе?
Прасаджу галодны ў стайні,
Ды прасмяюць людзі.
— Эх, чаго жа мне баяцца?
Я ж галодны так, ці так!
Разтапырыў рукі ў бакі,
Пахістаўся на чардак.
— Перайшоў, ужо гара.
Дошкі пад ступнямі,
Але, ці далей ісці
Сала красці ў мамы?!
Гэта ж грэх, так нельга,
Што на мяне скажуць людзі,
Калі Бог мяне накажа
І бацьку разбудзіць?
А страўнік усё бурчыць:
"Лезь дурны, наешся!
А калі ужо будзеш сыты,
То тады памолішся".
І пераканаў мяне.
Улез я на драбіну,
Ды пачаў наслухваць
Нейкую хвіліну...
Чую: цішыня вакол,
Ніхто не варушыцца.
Прадчуваю многа ўдачы.
Проста аж не верыцца.
Цераз сені перайшоў
На пальчыках, ціха,
А ўвайшоўшы да каморы
Цешыўся аж ліха!
Намацаў кусок сала,
Хлеб на скрыні напачаты:
Выхапіў з кішэні "козік"
І падумаў, што — багаты.
Толькі так падумаў...
Цьфу, пайшло ты ў шматы.
Відна бацька ўжо прачнуўся
Ды выходзіць з хаты...
Аж мароз прабег па мне:

"Што цяпер рабіці?
Выскачыць ды й уцячы,
Ці далей сядзеці?!"
Мігам вока вырашыў,
Што буду маўчаці.
Ведаў: — бацька лупню даст,
Калі буду ўцякаці.
Бацька на дзверах каморы
Павесіў "калодку".
Я астаўся бы ў турме
Аж заткнула глодку.
Ужо цяпер мне не да ежы,
Бо ў цемніцы сіджу,
А калі мяне тут знойдуць,
Што я мачысі скажу?
У каморы цёмна мне,
А на двары сонца.
Хочацца на свет зірнуць,
Ды няма ваконца...
Быць галодным няма горш,
Прашу мне паверце,
Але ўжо, калі няволя,
Гэта горш ад смерці.
Так сіджу у той каморы,
Ужо й ежа не міла:
Чорт смяецца нада мною,
— Нячыста сіла...
Аж прыходзіць маці з царквы.
Чую, як шмарыгае,
(Яе смаркатай называлі),
А я ўжо не дыхаю.
Адчыняе ключом дзверы,
Прэцца ў камору,
Я не ведаў, што рабіць,
Прытварыўся хворым:
"Мамачка, не бецеся,
Мяне ўжо набілі,
Каб вы зналі, што ў вёсцы
Хлопцы нарабілі!"
"Мамачка" відавочна
Не хацела знаць нічога:

"Калі ты сядзіш у каморы,
Ясна, што пакрыўдзіў Бога!"
І давай мяне "свянціць"
Кіем дзе папала:
"Ты, падкідыш крадзеш хлеб,
А мо яшчэ й сала?!"
Напароўся непатрэбна,
Бо забыў тады,
Што яна ўсё адзначала
Акрамя вады.
З'еўшы з страхам лусту хлеба,
З'еў і знак крыжа.
Таго кроку не забуду.
О, не, будзь я рыжы.
Маці "прала", я крычаў:
"Божа ж мой, ах Божа!"
"Ты, падкідыш не ражы.
Сала было гожа!?"
"Мамачка — кажу — радная,
Я ж яго не еўўў... "
А дзе крыжы із буханка,
Каб ты акалеў?!"
— Мамачка, я жыць хачу,
Я толькі хлеба ўзяў...
— А каб ты ім удавіўся,
Каб ты тут сканаў!
Так "наеўся" я тады
Хлеба з саланінай
А назаўтра ўжо бабы
Гаварылі: "ты скаціна!"
Як жа можна — папракалі —
Красці з хаты збожжа.
Вырасце нейкі зладзей...
Ого, не дай Божа.

## ТАЎКАЧ

На палях вёсак у ваколіцы Белавежы падчас вызвалення ад фашыстаў праходзілі цяжкія баі з вялікай колькасцю пяхотных войск з абодвух бакоў. У выніку гэтых баёў загінула многа нямецкіх і савецкіх салдат. Калі настала цішыня, бо войскі дзесьці прапалі,

сяляне пачалі вылазіць з нор і паціху разглядацца найперш вакол сваіх сяліб, пасля па загароддзю, а ўрэшце, хілкам і па палях распаўзаліся. Калі канчаткова ўпэўніліся, што няма нідзе жывой душы, толькі жаўрукі пяюць, людзі выпраставаліся ў поўны рост і пачалі шукаць здабычы.

Па палях, лугах і кустарніках ляжала многа living розныя зброі, снарадаў і гранатаў. Але пакуль што сяляне найбольш цікавіліся ботамі, вопраткай, якую баязлівыя перашывалі на цывільную моду, аіншыя ганарыліся мундзірамі.

Сярод бегаючых па карчах, акопах ды вытаптаным жыце была і Параска, якой у шустрасці і хітрасці не дараўняў ніякі мужчына з вёскі.

Тымчасам Параска палічыла, што знайшла проста шчасце, якое дазволіць ёй збагацець сумленна, без сораму. Менавіта знайшла яна поўны акоп зялёненькіх, жалезных з драўлянымі троначкамі таўкачоў да бульбы. З уцехі кроў ёй ударыла ў галаў ды ўліла ў яе смыкалку; прыкрыла Параска галлём акоп, а сама — гайда дамоў за канём. Запрагла яго ў драбіністы воз з кельнямі і паімчала ў лес.

Нагрузіла Параска воз таўкачоў і зноў прыкрыла галлём, каб пазбегчы зайздросных вачэй. Ужо скумелкала, што з імі зрабіць, калі на сабе выпрабуе: "Ну бо ж немцы — народ практычны і абыякавых таўкачоў сваім кухарам не дадуць! А вось я на іх зараблю".

Прывёзшы дамоў "тавар", Параска дзе толькі параспіхала яго, каб мужу неспадзяванку зрабіць. Распрагла каня і пачала варыць бульбу на абед.

Баі адкаціліся на захад, то і муж Параскі таксама лазіў па палях, каб штосьці знайсці. Прывалок ён дадому торбу ад дыскаў ручнога кулямёта, вінтоўку і каляску ад кулямёта "максім". Маўляў, у гаспадарцы ўсё прыдасца, мо часам у тым безгалоўі дзе на казу запалюю.

Увайшоў у кухню якраз у той момант, калі жонка бульбу на пліце таўкла.

— Падай! — закрычаў і сам выцягнуўся на падлозе.

Параска ў той жа міг і пакацілася, бо падумала, што муж бачыў ляцячы ў іх акно снарад.

Ляжаць яны — галава аб голаў зажмурыўшы вочы, і дрыжаць.

Параска першая падняла голаў і пытаецца:

— Што сталася?

— Дзеецца?! А чым ты, дурніца, бульбу таўчэш? Гэта ж нямецкая граната. Яна ж у гарачым адразу выбухне!

Выняла Параска таўкач з чыгуна, абмыла і закінула за "бэндуру", дзе ляжалі лыжкі і апалонік.

На другі дзень уся вёска ведала, што Параска знайшла цудоўны і вечны, бо жалезны таўкач. Сталі людзі прыходзіць і прасіць, каб паказала ды прадала. Параска кожнай прадавала, але гаварыла, што ўжо апошні і на кожным цану падбаўляла. Адной толькі куме дала дарма.

Калі ўжо ўсе жанчыны ў вёсцы мелі чым бульбу таўчы, Параска не ведала, куды ўвапхнуць рэшту. Падмаўляла суседак, каб бралі па два, на запас, але скупыя суседкі цешыліся тым, што маюць. Параску страх апанаваў, што паіржавеюць і цана спадзе, але кума параіла: "Давайце панясем па суседнік вёсках, мо там прадамо". Пару дзесяткаў прадалі, але не больш, бо трапілі на адсталыя вёскі, якія не хацелі новай тэхнікай бульбу таўчы. "Мы таўчэм валкамі, — адказвалі ім. — Вязіце ў Кляшчэлі, там збіраецца больш культурны народ, то й раскупіць".

Нягледзячы на жніво, Параска ў панядзелак патрабавала ад мужа запрэгчы каня, бо яна абавязкова мусіць быць у Кляшчэлях.

Прэ Параска ў Кляшчэлі, на ўсю выцяжку каня, бо ранак-панак. Пакуль сонца ўзнялося на вышыню хат, Параска прадала амаль усе таўкачы, якія прывязла. Два толькі засталіся, бо нейкі дурань пажартаваў, што гэта гранаты ("Каб яго распарола!"). Узяла Параска абодва ў рукі і давай хадзіць паміж вазамі ды крычаць:

— Каму апошнія два таўкачы?!

І ў тым моманце нос аб нос напаролася на міліцыянера:

— Што ты, Параска, смерцю гандлюеш?

— Якою смерцю, ты другі разумак, не бачыш, што гэта таўкачы да бульбы? А яшчэ ў міліцыі!

— Давай мне гэтыя прылады і хадзі са мной.

— Што, арыштуеш мяне за шпікуляцыю?

— Не, не арыштую, але хадзі — патаўчэм балота.

Міліцыянер крочыў спераду а Параска за ім. Адыйшлі на луг далёка ад людзей. Міліцыянер шпурнуў адзін таўкач у твань і тут Параска ад выбуху сама, без загаду, упала на зямлю. Міліцыянер засмяяўся, але сказаў:

— Калі не хочаш сядзець у турме за гандаль смерцю, то шукай людзей, якім прадала гранаты, бо іх чакае смерць!

Кінулася Параска на рынак галосячы пра гранаты-таўкачы а потым па вёсках пабегла людзей папярэджваць ад смерці. А ў душы прызнала, што трэба мужа слухаць, хоць пра гэта яму нават і не пікнула.

## КЫЧА, ДЭ?

Этымалогіі і генезісу слова *кыча* я не ведаю і нават забыў аб тым, што сам яго ўжываў 55 гадоў таму. Неяк яно мне ніколі не прыходзіла ў галаву нават тады, калі пісаў аб сваім пастушыным лёсе. Думаю, што гэта дэфармаванае беларускае слова *акыш*, якое ўжываецца для адгону птушак або назойлівага суседа: *Акыш, маро, згінь-прападзіі* У маім Грабаўцы ды ў наваколлі гэтым кыча, дэ'? адганяюць авечак, калі яны цэлым гуртом пруцца, бы тыя свінні, у зялёнае збожжа — шкоду, або запыняюць, калі дурная авечка не трапляе на свой панадворак, а бяжыць кудысьці ў блуды. Агульна кажучы, кыча, дэ? значыць куды лезеш. Але яно гучыць вельмі па-чужому. Так, як бы дзесьці ў аўлах ці іншых кішлаках. Белая Русь запазычыла яго дзесьці з Азіі, як акыш, а наш, тутэйшы народ перарабіў яго на кыча, як перарабляе шмат што іншае, называючы гэта ўзбагачэннем або развіццём мовы.

Гэта слова прыйшло мне на думку ў першай дэкадзе мая гэтага года, калі я, некалькі гадоў пасля разбурэння помніка савецкім дзецям-воінам, адведаў беластоцкія Плянты — парк, якім ганарыцца горад, месца шпацыраў і адпачынку мяшчан. А так, дарэчы, хочацца запытаць дзеячоў КПН, чаму яны не паедуць у Вену, каб і там разбурыць падобны помнік або прымусіць аўстрыйцаў, каб гэта за іх зрабілі.

Беластоцкія Плянты прыгожыя здалёк, а найпрыгажэйшыя з самалёта. Але калі ўвайсці туды, дык складаецца ўражанне, што ходзіш па сметніку. Лаўкі, скверы і ставы замест прыемнасці для вачэй дастаўляюць агіду. Усюды густа паперы, каробак з-пад розных сыроў, маргарынаў, ёгуртаў, кефіраў і іншых напіткаў, на лаўках ляжаць кавалкі бутэрбродаў і размоклае марожанае, не гаворачы ўжо пра рознага тыпу бутэлькі і бляшанкі. Не бракуе, хаця цяжка зразумець чаму, і ануч.

Калісьці трэба было мне паехаць у Кляосін. Пры нагодзе зайшоў я і ў лес, бо неяк без яго мне цяжка жыць. Але не суцешыўся я выглядам "народнага багацця". Сустрэў я там столькі набітага шкла, Гаршкоў, торбаў, паперы, бутэлек, банак, дроту і чаго толькі хочаце, што страшна ступаць. Плянты ад гэтага і іншых лясоў, а быў я там якраз тады, калі адбывалася ў Польшчы агульная акцыя ачысткі лясоў, адрозніваюцца толькі тым, што на Плянтах можна пакаўзнуцца і грымнуць на сабачых адыходах, а ў лесе — на чалавечых. Тут няма ніякага закіду ў адрас прыбіральшчыц Плянтаў, бо хто здолее цэлыя суткі сачыць за неахайнікамі?

Справа ў тым, што грамадзяне Польшчы не маюць пачуцця эстэтыкі, дысцыпліны ды культуры ў сужыцці. Адначасна маюць агромную амбіцыю быць паўнакроўнымі еўрапейцамі, на якіх хтосьці мусіць працаваць, каб яны маглі гуляць. І вось тут мне, бы вырванаму з летаргіі, захацелася крыкнуць: "Кыча, дэ?!" Гэта павінны сказаць перш за ўсё немцы, якія любяць парадак, чысціню, дысцыпліну і ... працу. У іх *бэфэль іст бэфэль*, а нам *з чым до госьці*, як гавораць палякі. У іх сметніцы ў парках і на вуліцах для таго, каб туды кідаць смецце, а не як у нас, сметніцы пустыя, а наўкол іх — сметнік. А які нямецкі ўрад дапусціў бы, каб вадаёмы былі загружаны рознымі адкідамі, а не качкамі, рыбай і лебедзямі? У нас пасля вайны гэтаксама было, але звялося, бо непатрэбнае. А ці ж не маглі б галодныя людзі, якіх — паводле статыстыкі — у нас не бракуе, злавіць сабе на абед карпіка ці хаця б карасіка? Не, іншыя дзеці па вуліцах збіраюць грошы для галадаючых дзяцей, а шмат дабра проста марнуецца. Але дзе там! Так лягчэй: сабраць грошы і прыдбаць ім хлеб, куплены ў Канадзе за долары.

Прэмся ў еўрапейскія структуры, як няпрошаныя госці, бо думаем, што яны будуць на нас працаваць, а мы толькі спажываць выпрацаванае кімсьці дабро і гуляць па парках ды выяжджаць да іншых карміцеляў па турыстычных пуцёўках. А нашы паркі і вуліцы будуць прыбіраць нямецкія прыбіральшчыцы. Адпомсцім за фашызм.

Я гэта напісаў і паставіў кропку. Але, калі ахамянуўся, падумаў: а мо гэта і добра, што ўвапрэмся, каб быць у Еўрапейскай уніі і НАТО, бо тады Злучаныя Штаты Амерыкі возьмуцца навучаць нас парадку, дысцыпліны і культурных паводзін. Гэта будзе згодна з нашай ментальнасцю і характарам. Мы любім, каб нас нехта ганяў і намі валодаў. Затое не любім слухаць сваіх, няхай сабе і талковых, людзей. НАТО давядзе да таго, што і ракетчыкі, і пілоты, і падраздзяленні хуткага рэагавання будуць адпачываць у чысціні сярод культурных тубыльцаў. Я — за НАТО! Адмяняю загаловак..

* * *

Дзе мая маладосць, калі мінуў зеніт?
Шукаючы апраўдання сваіх эратычных неўдач,
Напінаю думку, аж лопае жыла:
Чаму калісьці гаварылі: — Куды прэшся шчанё? —
А цяпер рагочуць:— Дзе лезеш гарыла?! Гарыла — goryl

**ЗМЕСТ**

Вучоны арніталог
Рэбус
Ой, як жа час мяняецца
"Дзікі"
Метамарфоза
Мужчыны, запускайце бароды!
Аж галава трашчыць
Вазьмі і захаці
Верце-не верце
Параненае паветра
Ці "нізка" — усюду нізка?
Вылечылі
Урэшце папалі
Свежанькае
Дзівакі-га, га, га!
Толькі грыву відаць
Гномы (карэспандэнцыя з Чэхаславакіі)
Лячэбная вада
Фараонка
Піражкі з мясам
Гандлярка
Аналогія
Пашантажырую
Бяда і годзе
Адвучылі
Чалавек-кот
Выбранае
Просьба да міністра
Даскакаўся
Бутэлька
Туалет
Новае адкрыццё
Падлога рыпае
Адстаўны капрал і суседка
Зноў кур'ёз
Малацьба
Як Грыпа зняславіла вёску
Аднаго
Мода
Сафары вінавата
Ой, Грыша, Грыша!
Забыў
А мо б крыху такту

А гаворaць
У абарону безабаронных
Абое рабое
Гігіена
Вось і выхад
Выйграла
Аптыміст
Вось гэта фальклор
І будзь тут ветлівы
Астрон
Ну й моладзь
Вось як было
Пеўня за яйка
Замаховец
Сабаражнік
Як я качку купіў
Як людзі робяцца героямі
Дурань
А мне толькі цешыцца
Грабаўляне ў Варшаве
Калі думае сэрца
Мая прапанова
Чарговы падарунак свету
Калі лепш
Як я калгас арганізаваць памагаў
Браты Гаворкавы
З жыцця цванікаў
Ох, і гнаўся я
Баллада
Таўкач
Кыча, дэ?